Яўгенія
ПФЛЯУМБАУМ

СУВОЙ ЖЫЦЦЯ



Яўгенія
ПФЛЯУМБАУМ

СУВОЙ ЖЫЦЦЯ

Кніга паэзіі

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84 Бел 7
П 91

Укладанне, рэдакцыя і прадмова
АНАТОЛЯ ВЯРЦІНСКАГА

Новую книгу старейшей белорусской поэтессы, чей творческий путь начинался в двадцатые годы, составили лирические стихотворения, написанные в разное время. Они — взволнованное раздумье о человеке и мире, искренняя исповедь души, творческий багаж одной судьбы.

П $\frac{4702120202-103}{М 302(03)-89}$ БЗ 55—89

ISBN 5-340-00586-0

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

«ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ — НЕ КАНЧАЕЦЦА ДОЛЯ...»

Яўгенія Пфляумбаум... Даўным-даўно, яшчэ ў сярэдзіне дваццатых гадоў, гэтае не зусім прывычнае для беларускага слыху нямецкае імя рабілася вядомым у маладой паслярэвалюцыйнай нашай паэзіі, у літаратурным жыцці Мінска і рэспублікі. Дачка мінскага чыгуначніка Эргарда Карлавіча Пфляумбаума (з ліку немцаў, запрошаных у свой час для працы на Беларуска-літоўскай чыгунцы і натуралізаваўшыхся ў нас) і хатняй гаспадыні, родам з Сенніцы, Алены Кандратаўны Лагун, студэнтка белпедтэхнікума Яўгенія Пфляумбаум выступіла ўпершыню ў друку ў 1924 годзе ў шаснаццацігадовым узросце. Друкавалася ў часопісах «Маладняк», «Полымя», у газетах «Звязда» і «Савецкая Беларусь». У 1926 годзе разам са сваімі равесніцамі З. Бандарынай і Н. Вішнеўскай выдала зборнік «Вершы». Працягвала вучобу на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ, прымала актыўны ўдзел у літаратурна-грамадскім жыцці: была членам «Маладняка», потым — БелАППа, уваходзіла ў склад бюро Мінскай філіі «Маладняка» і ў кіраўніцтва рэспубліканскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў... Так было на заранку, так было напачатку. Так пачыналася біяграфія, творчая і грамадская, Яўгеніі Пфляумбаум.

Плылі па небе аблачынкі,
І з іх смяяліся дзяўчынкі.
Смяшлівы быў настрой у неба,
І пырскаў смех з аблічча Феба.
Такі быў золачак вясёлы,
Што ўсё смяялася наўкола... —

прыгадае потым паэтэса з пачуццём шчымлівага жалю. І прыгадае, відаць, не толькі сваё дзявочае юнацтва, золак свайго жыцця, але і сваю літаратурную маладосць, свае першыя творчыя парыванні.

Што ж адбылося потым? Чаму імя, якое рабілася вядомым, стала набываць добрую літаратурную славу, раптам знікла, сышло, як тая аблачынка, і да апошняга часу заставалася, па сутнасці, невядомым? Многія з нас, напрыклад, ведалі Яўгенію Эргардаўну Пфляумбаум як паэтэсу па адным толькі вершы «Турксіб», які быў змешчаны ў зборніку «Універсітэт паэтычны», выдадзеным у 1971 годзе да 50-гадовага юбілею БДУ імя Леніна.

Чаму? Па якой прычыне? З прычыны якіх абставін?

На гэтыя пытанні трэба хоць коратка адказаць. Інакш не ўсё будзе зразумела для чытача ў самой кнізе — не ўсе тэмы, матывы, рэаліі.

А галоўная прычына ў тым, што на светлыя аблачынкі, якія плылі па высокім, сінім, весела настроеным небе дваццатых, сталі ўраз набягаць злавесна-змрачнаватыя хмаркі трыццатых, што вясёлкавы золачак, не паспеўшы разгарэцца ў ясны дзень, стаў змяняцца раптам прыцемкам сталіншчыны. Для творчай і навуковай беларускай інтэлігенцыі яна пачалася не ў трыццаць сёмым, а значна раней, на самым пачатку трыццатых. Услед за сваім спадарожнікам па жыцці і літаратуры, за рэпрэсіраваным у 1933 годзе Максімам Лужаніным, едзе ў Сібір і Яўгенія Пфляумбаум. Вось чаму яна перастае друкавацца, вось чаму ў яе вершах сібірскія матывы, сібірскія назвы (Сіблаг, Марыінск), сібірскія вецер і снег.

Снег растае па цёплай скроні,
Паруюць кроплі па чале,
А віхар гоніць, гоніць, гоніць
Адны снягі другім услед.

Такой зімой у маладосці,
У дваццаць тры мае гады,
Патрапіла ў Сібір я ў госці
З усенароднае бяды.

Побач з радкамі пра «сіблагаўскія шляхі» знойдзе чытач у кнізе і радкі пра «школьныя кіламетры», пра тое, як маладая, зусім нявопытная настаўніца самааддана вучыць дзяцей у сібірскім гарадку. Гэтыя радкі, вядома, таксама аўтабіяграфічныя (спатрэбіўся, ратаваў ад голаду дыплом выпускніцы педфака БДУ).

Добра помніць Яўгенія Эргардаўна сваё сібірскае жыццё-быццё, сваё першае і апошняе настаўнічанне. Але з асаблівым пачуццём успамінае і расказвае аб тым, як марыла пра зваротную дарогу, як шчадзіла, адкладвала на той білет кожную капейку. І калі той доўгачаканы момант нарэшце надышоў, праводзіць прыйшлі вучні, прыйшлі з ліку сіблагаўскіх вязняў Змітрок Астапенка і Змітро Віталін. Каб не гэтыя два Змітракі, надоўга засела б на станцыі ў Марыінску настаўніца: цягнікі праходзілі звычайна не спыняючыся, а калі і прыстойвалі на хвіліну, дык пасажыраў амаль не бралі. Змітро праявіў, што называецца, волю. Ён выцягнуў клункі на перон, упрасіў правадніцу пасадзіць чалавека і — прыгадвае Яўгенія Эргардаўна — доўга стаяў на марозе са знятай з галавы аблавушкай, глядзеў услед...

Потым была Масква, маскоўская паласа ў жыцці паэтэсы (адсюль і адпаведныя вершы). Былі цяжкасці з уладкаваннем, з пошукамі жылля і працы. Неішта знаходзілася. Працавала карэктарам, рэдактарам. У Маскве перажыла і ваенную часіну з яе дзяжурствамі на даху, з холадам і голадам, са скупымі карткамі. Ехала неяк у тралейбусе, тулячы да грудзей азяблымі рукамі папяровыя скруткі, яны распаўзаліся, падалі, і змрочнага выгляду стары падаў «авоську»: «Складзіце як след!» Узяла, спытала: «А як жа аддаць вам сетку?» —«Ніяк, успомніце прафесара Бурдэнку».

Хай зноў душа твая і розум
Спагадзе служаць і дабру...

Ну, а потым, пасля вызвалення, пасля вайны незабыўнае, хвалюючае вяртанне на Радзіму, у родны

Мінск. Пачыналася новая, мірная, больш-менш спакойная паласа.

Так складвалася жыццё. Так складвалася кніга. Зрэдку вершы пісаліся і ў Сібіры. Прыходзілі, больш настойліва давалі знаць пра сябе ў Маскве. У рэдкія хвіліны адпачынку, у мінуты тугі па дому, па маці. Задумваліся, прасіліся на паперу — то як успаміны, то як рухі душы — дома, у Мінску. Але аб'ядноўвае іх усе, незалежна ад геаграфіі і часу іх паходжання, накладвае на іх агульны адбітак адна акалічнасць: пісаліся яны, можна сказаць, не для публікавання, не для друку, а ўзнікалі як размова сам-насам, як дыялог са сваім унутраным голасам, са сваёй душой (у кнізе часта трапляецца гэтае слова: душа), як старонкі паэтычнага дзённіка. Гісторыя літаратуры ведае такі вопыт. Мы маем у дадзеным выпадку справу з нашай беларускай Эмілі Дзікенсан. Да слова сказаць, у амерыканскай і нашай паэтэс ёсць надзіва сугучныя па сваім маральным і эстэтычным сэнсе радкі. «Літасцю гандлюеш боскай — Пазыка пад працэнт,— гэта ў Э. Дзікенсан.— Ды не смей зняважыць Геній ярлыком цаны». А вось радкі з верша Я. Пфляумбаум:

Тваё пісанне не тавар,
Не ў пару творыкам няздар,
Яно, як кажуць, для душы:
Не можаш не пісаць — пішы,
Вось толькі фальшам не грашы.

У звароце гэтым — аўтарскае крэда. І яно вытрымана з пачатку і да канца ў кнізе, названай «Сувой жыцця».

Анатоль Вярцінскі

ТРЫЦЦАТЫЯ ГАДЫ



ДАВАЙ ПЕРАГОРНЕМ СТАРОНКУ...

Зрабі намаганне, мой лёс,
Давай перагорнем старонку,
Дзе высака ты мяне ўзнёс,
Каб кінуць ямчэй у палонку.

Крывавячы рукі аб лёд,
Я выплыла з сэрцам лядзяным,
Пачаўшы той колазварот,
Дзе неба з зямлёй паяднаны.

Ды як жа сінела яно,
Як промні кідаліся доле,
Каб мне больш не снілася дно,
Каб даць паспытаць мне патолі.

Дык дзякуй жа сонцу таму
І тым вечаровым заранкам,
Што мне пілавалі турму,
Адкуль я ўжо выйшла паўстанкай.

МАСКВА

Сюды, на паўночны вакзал,
Мы выйшлі пад самае свята,
Яшчэ не саліла сляза
Завулкі старога Арбата.

Яшчэ нас хмяліла адно —
Нарэшце! — з Масквою спатканне!
Застаўшыся дзесь за спіной,
Ужо не гняло ганьбаванне.

Без клункаў, без хатніх прыкмет,
І нават без дзённага хлеба,
Мы ўвесь абдымалі сусвет,
Радзіму з зямлёю і небам.

А блізка ж была Беларусь,
Рукою пляча даставала,
З таежных вяла завірух
І снег з каўняра абтрасала.

НЕ АДДАВАЙ ДУШУ МАРКОЦЕ...

Сняжынкі бавяцца на ўзлёце,
Вітаючы сваю пару.
Калі ты нават на самоце,
Не аддавай душу маркоце,—
Найлепш вясёламу пяру.

Такая снежная прастора,
І цішыня, і чысціня,
А там ружовая Аўрора
Выводзіць белага каня.

Адно імгненне, як натхненне,
Наяве бачыш праз акно:
Там кветкі прараслі з камення
І зацвітае бервяно.

З малецтва я такую казку
Спявала ў цяжкія гады,—
Як праз павеваў цёплых ласку
Узімку зацвілі сады.

Стаялі людзі у здранцвенні
Прад гэтым дзівам на зямлі...
А ўвечары даўгія цені
Цвет скасавалі на галлі.

ПАДЛЕТКІ

Плылі па небе аблачынкі,
І з іх смяяліся дзяўчынкі.
Смяшлівы быў настрой у неба,
І пырскаў смех з аблічча Феба.

Такі быў золачак вясёлы,
Што ўсё смяялася наўкола...
Хай дзень той будзе напамінкам,
Як засінела даль барвінкам,

Як, неазмрочаныя смуткам,
Як, незнаёмыя з абуткам,
Мы беглі боса праз палеткі —
Такія смешныя падлеткі.

ЧУЖОЙ БЫЛА Я Ў ТЫМ КУТКУ

Калі і вёсны ў ім гралі,
Цвіла тайга і на таку
Глушыцы ўсё арандавалі,
Сабраўшы песні па радку,
І спеў ні ўдзень, ні ўноч не ціх
Прылётных птушак і сваіх,—
На беразе нямоўчнай Кіі,
У перабеленым пяску,
Дзе хто і золата намые,
Аднойчы, можа, на вяку,
Чужой была я ў тым кутку.

МАРЫІНСК ТОМСКІ

1

Халодны сон, без ценю сноў,
Без згадкі прывіднай, без крозы.
А як заснуць, каб так цвяроза
Убачыць грань, што на відно
Лязом прарэзала акно
І думкай яснай будзіць мозаг.

Халодны свет. Чужой рукой
Я адчыняю браму ў дом свой:
Марыінск Томскі,— новы дом,
І сцюжу гэтага знаёмства
Мне цяжка выславіць радком.

2

Куток без крэсла, без стала,
І ты, як птушка без крыла.
Халодны горад, школьны дом.
І толькі сіні снег суздром.

І толькі праца дацямна,—
Ды з дзецьмі ты ўжо не адна.
Вясёлы тлум, як родны гай,
Як беларускі небакрай.

Любіць ты вучыш ці кахаць,—
У іх жыцці — твая крыха.

Ці ўспамянуць мяне калі,
Як дзень у дзень мы ў школу йшлі.
Мае равеснікі, бадай,

Прасілі іх не пакідаць,—
Застацца ў школе надалей,
Хоць аб адным сваім крыле,
Вучыць любіць, вучыць кахаць,
Каб падымалася страха,
Каб за акном не толькі снег,
А зоры з воблачных прарэх.

Аднойчы пад дзіцячы смех
Прарваўся раптам цэлы мех
З галактык новых і старых
Ападаў зорных, як ікры.

Нераставала неба ўсцяж,
Калі я свой цяжкі віраж
Засвойвала ўніз галавой,—
Засвоіла, і стаў ён свой.

На каркаломнай вышыні
Мае зачэпліліся дні,
І з тою макаўкай святла
Крыла шчарбіна зарасла.

КАВАЛКІ ЛЁСУ

Калісьці быў мне дружбаком
Сібірскі вецер вольны,
Хоць шапачку зрываў крадком,
Ды агграваў такім радком,
Што мог быць спевам сольным.

І як спявалася тады
Між снегавых сумётаў!
З тае далёкае хады
Збыла я вобразы бяды,—
То ж свет увесь быў малады
І абяцаў клейноты.

Я іх трымала у руках —
Зіхлівыя алмазы,—
І той часовы хісткі дах
Стаў домам мне адразу.

А можа, ён адзіны быў
На ўвесь мой шлях дзівачны,
Бо ўсё здаецца мне, нібы
У сне па ім я плачу.

Сібір, Сібір, і ў сэрцы вір,
Часінай той узняты:
Палала вогнішча ў крыві,
У прагнасці зацятай.

А як мы біліся з табой,
Сібірскі вецер з волі,—
Ад золку пачыналі бой,
І твой раз'юшаны габой
Кружыў мяне па полі.

Іду напрост — такі узрост!
Такая, зрэшты, мара,
А ты, як з карабля матрос,
Цябе зямля вядзе наўкос,
Каб абваліць і ўдарыць.

Я не магу паспець у час,
Хоць там чакае школа,
Няма святла, гарыць свяча,
І дзеці весела крычаць,
А ты гудзеш, назола!

Тры крокі ўперад,
Пяць назад...—
Гульня ў цябе такая:
Свой нораў ты распеpазаў
І гнеў мой падпякаеш.

А ўрэшце — смешная бяга:
Напрост не дойдзеш мэты,
Патрэбна тут плячэй вага,
Каб трохі збочыла пурга
Перад святлом асветы!

Зачэрпаўшы ў цябе, Сібір,
Навуку бітвы з ветрам,
Я ўжо адольвала свой вір,
І ўсталяваўся ўрэшце мір
На школьных кіламетрах.



Мы вас ждём, товарищ птица.
Отчего вам не летится?

Маякоўскі, 1927 г.
«Пионерская правда»

Паэт Маякоўскі! — Яго я чытала,
Калі і цяпла, і святла не ставала.
Самот вечаровых уцешлівы голас,
Магутны, і цёплы, і смутна-вясёлы.

Чытала я запар усё, чым ён дыхаў,
Што спела з маленства яго акрасціхам...
Чаго ён адрокся, чаго не падужаў,
Якою ліхою прадзьмуты быў сцюжай?!

Пячэ гэта думка — такое істненне! —
І постаць асілка, і ветразь натхнення.

АБРЫС НАДЗЕІ

Утаймавала галаву,
Прыспала думныя трывогі,
І вось ізноў нібы жыву,
Бяруся сквапна за нарогі.

Ары глыбей, душа мая!
Вясной абводаран палетак,
На спадзе лета удвая
Гусцеюць фарбы важкіх кветак.

А зараз тонкая смуга,
Абрыс надзеі непагаснай,—
Утрат паменшала вага,
Як сэрца вырвала з-пад праса.

Зірнула сонцу ў самы жар,
У палымнеючыя зрэнкі:
— Бяры, гасі ўжо мой прыпар,
Аддай, падзьмуўшы, маладзенькай!

ПОДЫХ БЫЛОГА

У тым доме жылі дзекабрысты.
Не забыты яшчэ іх імёны.
І гучаць, нібы пошчак агністы,
Ад той плошчы павек закляймёнай.

Я заходзіла ў браму стамлёнай,
Следам бегла уроссыпку школа —
Непарыўным было наша кола,—
Мы вучыліся разам натхнёна.

Без падручнікаў — зналі мы болей,
Дзе высокага роду пачуцці,
Хоць пад нізкай выраслі столлю,
Але мары мужнелі ў пакуце.

Чыстым подыхам веяла з рэчкі,
Беражок быў, як з манны,— бялюткі...
І пяялася штось недарэчы,
Калі к сэрцу падходзілі смуткі.

Школа, школа ішла за мной следам,
Не давала наўкол азірнуцца...
Скрозь жыло дзекабрысцкае крэда —
Зноў сюды мае вучні збяруцца.


УПЕРШЫНЮ

Красавіковую красу
Далонню сонца абуджала
І кожным дотыкам расу
Буйным запальвала апалам.

І зазіхцеўся мой сусвет,
Як некалі на панадворку,
Дзе ціха першы свой куплет
Пад першай выдыхала зоркай.

Ці гэта ўласныя радкі
Так склаліся непазнавальна,
Ці слова пырхнула з рукі,
Ці, можа, кветка заспявала?

САРАКАВЫЯ ГАДЫ



ДЗЕНЬ ВАЙНЫ...

Я на заклік твой ехала, так, нібы лугам
Між рамонак вясёлых спяшала дамоў...
Генерал на Арбаце зрабіў мне паслугу:
Даў махоркі,
Зірнуўшы,
Не трацячы слоў.

Калаціла вагоны той ноччу бяссоннай,
З ашалелага неба паліла наўсцяж,
Машыніст тармазіў, і ставусныя стогны
Галасней тады чуліся ў празе жыцця.

Везлі раненых з тылу, што стаўся ўжо фронтам,
Везлі ў ноч, у бяззорную ноч, без надзей,
Быў прытулкам мне тамбур і страшны вагон
той,
Што ў Маскву не давёз і паловы людзей.

КОЛЕР ЖЫЦЦЯ

Некалі бралі гадзінай ліхою
Кроў маю разам з маім неспакоем,
З тою трывогай нязгаснай, нязводнай —
На паратунак, абы не на шкоду.
Там, у тым свеце вайны перамožнай,
Донар — быў гонар, уладца заможны.
Мы не шчадзілі крыві свае зыркай.
Колер жыцця загараўся ў прабірках...

Хто ты, мой дружа, з маёю крывёю,—
Ці не пазбыўся майго неспакою?
Можа, ў сасудах тваіх, як у дрэве,
Сонцам нальецца яна на угрэве.
Кроў мая кроўная парасткі гоніць!
Як гэта трэба мне, трэба сягоння!

ЛІСТ ВАЕННАГА ЛЕТЧЫКА

Пра вас я думаў у палёце,
Як набліжалася Масква,
І ў тым запаленым цэйтноце
Хмялела моцна галава.

Быў самалёт пусты: з Берліна
Са мной вяртаўся ўлегцы ён.
А сэрца прадчувала міну —
Скаванасць вашу, ваш палон.

Мне чуўся голас земны, чысты
На разліковай вышыні.
Ішла вайна, і кожны выстрал
Мог пагасіць мае агні.

Але я знаў, што не загіну,
Пакуль са мной туга і боль:
Яны былі да вас трамплінам —
Адна шчаслівая хвіліна —
Убачыць вас. Нічога больш.

Пра вас я думаў у палёце,
Ваш твар наблізіўся ўначы —
Не быў я болей на самоце
І кожны крок ваш прасачыў.

Была сустрэча наша нечым,
Чаго не сніў, не ведаў я,—
І той адзін трамвайны вечар,
Ён сэрца зараз мне краяў.

Я клікаў вас з нябёс гарачых,
З берлінскіх рэйсаў ноч у ноч,

Мой свет увесь быў перайначан
Відном прымглёных вашых воч.

Ды сёння ж зноў шляхі зямныя
Плывуць на покліч мой без вас,
Хай ад мяне вас цемра ўкрые,—
Абы прымглёны зірк не згас.

У МАСКВЕ

Якая лісцяная восень!
Мяце залатое крыло.
Іду я Масквою наволеп,
Як некалі гора вяло.

Лістота — жывая істота,
Засыпала брамку і двор,
І ў гэтых шурпатых сумётах
Мне чуецца смутны дакор:

Залішне было лістападу
У тым беспарадным жыцці,
Дзе лёс мне загадваў не падаць,
А морам нястомна плысці.

І НЕ ФАЛЬШУЕ ТОЛЬКІ ПТАХ


Прыпіскі дружбы, пачуцця,
Самой адданасці прыпіскі —
І з імі горкае дзіця
Ужо стыкаецца з калыскі.

А далей сны — юнацтва шлях:
Краса і зман праступаюць поруч,
І не фальшуе толькі птах,
Хоць з году ў год вясне уторыць.

Стаіш ты ў росквіце між дрэў,
Сама як дрэўца у накведці,—
Хіба адзін перахварэў,
Цябе спаткаўшы на дасвецці...

Іх за сабой тады вяла
Нязнаным вабівам нязвыкласць:
Вачэй — нібыта ўзмах крыла
І мяліне глыбіняў — выклік.

І ўсё ж мялела наўкруга
І адпаўзалася разводдзе,
І недзе ўжо ліхтар міргаў
Тваёй раз'юшанай нягодзе.



Як рвецца з ценю на відно
Слабенькая сцябліна,
А сонца лашчыць берввяно
З паваленай хваіны.

Надходзіць росквіту пара
Для кожнага істнення,
Калі злузаецца кара
Знішчальных сутыкненняў.

І з перамогай чалавек —
Касмічная расліна —
Увойдзе ў свой праменны век
Чырвонаю калінай.

ВІЗЫ

У дзяржавы сноў маіх гарачых
Візы здабываюцца дармова,
І з перона, дзе ніхто не плача,
Я ў цягнік сядаю адмыслова.

* * *

На строме высокай мне вусцішна быць —
Няма тут таго, што я звыкла любіць,
Прабую сыходзіць па лёдзе сухім,
Ды бачу, што коні не ўздужалі схіл:
Фурманка ляжыць, і яны стрымгалоў
Пачалі свой згубны астатні галоп.

Са стромы вятрыстай далёка відаць —
Такая ж чакае мяне тут бяда.
Намацваю візу ў сваім паліце —
Я больш не хачу на чужыну ляцець.
Прачніся, прачніся, свядомасць мая,
Вачамі і сэрцам мне дай акрыяць.

Дзяржавы нязгоды, краіны тугі,
Я ўсіх вашых водаў прайшла берагі.
І толькі крынічкі свае не знайшла,
Дзе некалі лотаць юнацтва цвіла,
Дзе льга было смуткі рукой адхінуць,
Як голле густое — праз шыбы — ў вясну.

* * *

Дрэву кожнаму — вясна,
А бярозе — боль:
Слёзы лье ў пакутных снах,
Слёзы без патоль.

Раняць белую кару
Сквапныя нажы,
Сок распырскваецца з рук
І ручвом бяжыць.

Што ты дзееш, чалавек,
Калі ты з людзей,—
Пакідаючы на здзек
Вецце без надзей?

* * *

...Як нескладана стаць адданай:
Згасіць агні юначых дзён,
Пакінуць росныя паляны,
Сысці ў палон, душы прыгон.

Зрачыся долі, нават волі,
Не аглядаючыся, не,
Пачаць жыццё былых нявольніц,
Калі раскутасць толькі ў сне.



Сэрца гояць толькі сэрцам,
Тым, што з літасцю сябруе,
Калі клапанавы дзверцы
Біцца поначы шчыруюць.

Так і трэба, так і трэба!
Хай трапечацца лістота
Пад асеннім зябкім небам
Ад птушынага адлёту.

Толькі ростань, толькі ростань
Нараджае поўню стрэчы,
Зірк надзей у іскрах вострыць,
Чысты зірк, як у малечы.

ВЯСНА

У лесе слепяць белым азерцам
Белыя кветкі, кволыя сэрцам,
Век іх кароткі, хоць і салодкі,—
Тры дні ад тыдня ўкралі ў іх злыдні.

Але ж яснота, белая цнота,
На зеляніне ў вочы нам рыне
Раннем дзявочым, ясным світаннем,
Месячнай ноччу, першым каханнем,
Белаю ружай,
Шчасным замужжам.

2 Зак. 2074

* * *

Жанчына, ты ўсяму прычына —
Безабароннасці душы
І нематы, калі павінна
Лямантаваць: крычаць, крышыць.

НЕПРЫБРАНАЯ ВОСЕНЬ

1

Непрыбраная восень зімавала з лістотай,
Яна сніла пад снегам завеснены сад:
Моцна пахлі ў праменні пчаліныя соты
І на кожнай сцябліне звінела раса.

Назавём гэты росквітны час антуражам.
Дзе душа бунтавала, дзе боль яе пра́жыў,
Дзе гарэлі кастры несівой яшчэ веры,
А наўкола стаяла, зацяўшыся, шэрань.
Непрыбраная восень,
Тваё тут ахвосце!

2

Зараз сведчаць з дажджоў парудзелыя сведкі,
Як гібела душа там у хцівай каросце,
Хоць вясна раскідала нязбытныя кветкі:
Буйным планам тады красаваўся рамонак
І махрыстая мальва, мой сіні барвенак,
Залівaліся цветам і яблыняў кроны,
А было гэта ўсё хіба толькі вітрынай...

А вось зараз Стажары зіхцяцца і клічуць
Цёмнач, золак ці захаду воблак барвовы,
І глядзіцца мне ў вочы суровым аблiччам
Дзень астатні, як першы, не ронячы слова.

ПАЖАР

За акном пажар шугаў,
Пашыраючы прастору,
Дзе агністая пурга
Паглынала нават зоры.

Мы не зналі, што гарыць
І чаму ніхто не гасіць,
А ў тым вогненным віры
Датлявае, можа, шчасце.

НАГАЯ ПРАЎДА

Ёсць штосьці няхлюйнае ў нагасці праўды,
Як, зрэшты, у кожнае нагасці смелай,
І ў вершы ты, мусіць, пазбаўлена праў тых,
Каб так агалялася сэрцава цела.

Таму і маўчыш адвячоркам самоты,
Зацяўшыся ў сціску і слоў і прагненняў,
Калі ж і напішацца кроўнае ўпотай,
Замкнеш у шуфляду нагое стварэнне.

Хай там наляжыцца, наплачацца ў змроку,
Наскардзіцца сценам ці з хвоі, ці з дубу,
Хай рыфмы нараяцца вока на вока,
Ці ёсць ім на свет паказацца рахуба.

ПЯЕ ВЯСНОВАЯ ВАДА...

Пераадольванне сябе,
Зацятасць спрэчкі са стыхіяй,
Трашчыць штодня душы хрыбет,
Нямеюць вочы несухія.

А вёсны, вёсны — вось наўда! —
Змываюць скрухі і дакукі.
Пяе вясновая вада,
І сонца зноў цалуе рукі.



Зноў сёння гэты вецер шквальны
Шматае вецце, рве лісты,
І гнуцца хвоі па узваллях,
І бераг возера пусты.

Адкуль такая апантанасць —
Зацята свет увесь хвастаць
І неба хмарную сутану,
Як чорны ветразь, раздзіраць?

НА КАНЦЭРЦЕ ОБЭРА

«Нямая з Порцічы» — я сёння
Тваёй зайздрошчу немаце:
Ты і ў яе цяжкім палоне
Знайшла найлепшую з уцех.

У танцы смелым, у імклівым
Паланні сэрца і душы
Ты зноў рабілася шчаслівай,
Хоць песню морак задушыў.

А я, даверыўшыся слову,
Яго праменнасці жывой,
Цяпер кляну святую мову
І знаю, што была сляпой.

СУХАВЕЙ

Не зарадзіў загон пясնярскі
У сухавеі пачуцця,
Хоць быў у творах Шэйн ды Карскі,
Як песні матчынай працяг.

Была і мова пра сівога
Барацьбіта за мірны дом,
І пра сябе было самога,
Замаладых яшчэ гадоў.

І зместу там не бракавала,
Каб вылюдзеў палетак той,
Каб муза ў іх раскашавала
На плыні сонца залатой.

Але радкоўе скрозь грымела
Металам, што губіў цяпло,
І сіверам душы згалелай
Нам сэрцы раптам працяло.

Не выклікаў той бразг халодны
Ні радасці, ні смутку ў нас:
Ішлі радкі, узвод за ўзводам,
Каб недзе ў цёмначы канаць.

Калі мастак ты чыстым правам,
А не для ўцехі і забаў, —
Дык папусціся зманам славы,
Але душы не занядбай.

ДЫЯЛОГ З ЗАВЕЯЙ

Камы сняжыстыя з галін
Апалі цяжка доле,
І вершаліны узнялі
Зялёную сваволю.

Імжакай золкаю мне ў твар
Дыхнула раптам слова
Аб тым, што ты зусім не варт
Узрушанай размовы.

Па часе смешна наракаць:
Дзе ж былі мае вочы,
Што мутнаватая рака
Зіхцела ў іх, як рочаць.

Дзе дробязнасць і меліна
Ў заплыве пачуццёвым,
Адразу багна ў дне відна:
Часцей там п'юць каровы.

Чаму ж замгліўся мой пагляд
У час той неадступны,
Здавалася ж, ён так цаляў
У кожную падступнасць.

. . . .

Завея злая проста ў твар
Мне шпурлянула словы:
— Дык варт ён, зрэшты, ці не варт —
Няма ж канца размовам!

ЦІШЭЙ, МАЕ СЭРЦА!

Цішэй, маё сэрца, цішэй!
Ты б'ешся так моцна з усякай нагоды,
А нас жа з табою яшчэ
Чакае і згло, і нягода.

Я знаю: жывеш ты адменным жыццём,
Сябе выдаткуеш дарэшты, дазвання,
Але гэты звон аж занадта чуцён,
Няма куды дзецца з табой да світання.

Маўчы, маё сэрца, маўчы,
Табе не магу аніяк я даць рады —
Адна толькі радасць, звычайная радасць
Магла б ратаваць і спагадай лячыць.

Цішэй, маё сэрца, цішэй!
Ты б'ешся так моцна з усякай нагоды,
А нас жа з табою яшчэ
Чакае і згло, і нягода.

НА ХОЛАДЗЕ

Уяўнасць, уяўнасць, уяўнасць —
Тваё гэта ўсё насланнё!
На чырвані ў змроку праявіш,
І зіркне з вачэй ваўчанё.

Уяўнасць жадна на аздобы —
На фарбы, на музыку слоў —
Мільгне мімаходзь і заробіць
Высокае пробы любоў.

Глядзіш, без надмерных выдаткаў
І золата ў рукі плыве!
Ні мыту, ні скрутных падаткаў,
А ты ж не аплоціш павек!

РАМАНТЫКА

У воддалі клікалі зоры,
Вясёлых гасцінцаў агні,
А я ўсё ішла непраторам,
Шукаючы ўяўных крыніц.

Балючыя, смешныя згадкі!
Было і быллём парасло.
А некалі ж сэрца падаткі
Плаціла за гэтае тло.

Ці гэтак жа ўсёператлела,
Каб тлом называлі душу?
Яна ж і смыліць, як смылела,
І я той агонь варушу.

Рамантыка! — скажуць з ашчэрам
Усмешкі, халоднай, як золь.
Ды гэта ж і мара, і вера,
Любві жыццятворны азон.

Рамантыка — гэта вандроўкі
У шчыры, у песенны бор,
Найлепшая ў свеце сяброўка,
Званчэйшае песні паўтор.

Рамантыка — ты і каханне,
Нябёсы яго і зямля.
Адвечнае наша благанне,
Каб падалі промні на шлях.

ГАНЬБА

Добра, што не жонка я табе,
Не каханка ад нагоды да нагоды.
Дзе б я вочы дзела ад сябе,—
Хіба з моста ў воду...

А цяпер судзіце — ваша моц,
Ваша права, ваш наедак, зрэшты.
Я ўсю ганьбу закручу ў вязьмо,
Але панясеш — ты.

МАЛАДОСЦІ Ў ВОЧЫ ГЛЯНУЛА...

Дай падумаем у за́цішку,
Як нам жыць з табой далей.
Заўтра ўсё, што мела, страціш ты,
Ці ж гатова так згалець?!

Сэрца рынецца у бездані:
Там ні кветкі, ні відна.
Рукі ў роспачы жалезныя —
Не падымешся ты з дна.

Ёсць сцяжына уратоўчая,
Ды не пойдзеш ты па ёй:
Там душа твая пакоўчыцца,
Не пазнаеш поступ свой.

Маладосці ў вочы глянула,
Не прыжмурыўшы павек,
І прыйшло яно, нязванае:
Ці то шчасце, ці то здзек?

МАЙСКІ СНЕГ

Хоць аднойчы, хоць раз папусціся зняваге,
Пагадзіся з драбнотаї, перабудзь з ёю дзень,
І яна цябе стокраць у сэрца уразіць,
І не знойдзеш ты рады ні ў чым і нідзе.

Стане пусткай душа: па выгарыне чорнай
Ні павеву жаданняў, ні думкі, ні мар...
Недзе ходзіць вясна, узгараюцца зоры,
Месяц позніцца рожкі выцягваць з-за хмар.

Дзень паўзбежна праходзіць, мінае твой позірк,
Не кранае і яблынь духмяны убор,
І душа твая стыне ў штодзённай пагрозе:
Будзе горш!

Схамяніся, бяжы, адцурайся атрускаў,
Успамінаў аб тым, чаго быць не магло,
Што забіла знявага далонькаю вузкай
І патрушчыла зло.

У ДАРОГУ

Ацiхнi, сэрца. Трэба даць
Спакой сабе хоць на гадзiну;
А крыўды ў падарожжа браць
Не можам мы i палавiны.

У вочы паглядзi красе
Вясны запозненай, як шчасце:
Ад сiняй пасмы пакрысе
Ўсё неба над табою насцеж.

Народ шануе гэты дзень —
Вялiкдзень — беларусы клiчуць:
Ў яго вiдне, ў яго хадзе
Вясны цудоўнае аблiчча.

А на палянах баравых
Сiнеюць вочы першых кветак:
Не для памёршых, для жывых
Яны праменямi нагрэты.

Ацiхнi, сэрца, i пайшлi,
Пара ў вялiкую дарогу!
Мы ношкi крыўды не ўзялi,
Не праклялi мы i парогу.

СЛОВА

У нашай мове, вельмі маладой,
І сакаўной, і сумнавата-гнеўнай,
Ёсць словы — сцёрты ўпоперак і ўдоўж,—
Што выдаюцца нудным перапевам.

Хоць некалі з глыбіняў пачуцця
Іх выклікала думная навала,
Дала ім і пачатак, і працяг
І кожнае па ўзору называла.

У словах гневу чуецца набат,
Алармавыя воклічы на вежы,—
Разлеглася шырока барацьба
За шчасця чалавечага бязмежнасць.

У словах смутку — водгалас нягод
І кволасць апустошанай галіны:
Так восеньператруджанай нагой
Ступае па балоцістых сцяжынах.

У словах шчасця — звон усіх крыніц,
Вясновыя, праменныя прасторы,
І ураджаі водарных суніц,
І першае любові непаўторнасць.

Ў нянавісці ж, па закліку яе,
Што скіравана служкам вынішчэння,
З глыбіняў сэрца слова паўстае
Нязломнага святога абурэння.

І колькі б ты яго ні паўтараў —
Адзін ці з гуртам цэлым адначасна,
Нясцёртыя сугуччы скрозь гараць,
І свет відзён; а ў ім і мір і шчасце.



У чысціні халодных слоў
З ільдзінкай веснавой крыніцы
Крышталізуецца любоў,
Калі адважышся напіцца
На ветры, што душу прадзьме
І полымем запаліць вочы,
Пагасіць іранічны смех
І ў ліхаманку кіне ўночы.

ШУМЯЦЬ ДАЖДЖЫ...

Шумяць дажджы, брыняць ручайкі,
Лілеі поўняцца па венца,
І вераб'ёў шумлівых зграйка
Прысела пад тваё акенца.

Што думаеш ты ў дождж абложны,
Пад сонны шэлест адвячорку,
Ці чуеш, як мне тут трывожна
Пад гэты несціханы шорхат?

А кроплі ж, кажуць, точаць камень.
Ці пратачылі ж хоць пясчыну,
З тых, што мы ўласнымі рукамі
Насыпалі на дамавіну
Свайго кахання...
                    Гэта ростань —
Злачынства, здзейсненае стокрацъ.
Але ў жыцці не ўсё так проста,
Як гэты дождж і плашч мой мокры.

А МНЕ ШКАДА МАЕ САМОТЫ...

Два дні я гавару з людзьмі
Абы пра што: пра дождж, пра слоту...
Хоць ты, норд-ост, яе надзьмі —
Так мне шкада мае самоты.

І вецер спагадае, дзьме,
Загнаўшы ўсіх у дом, за дзверы,
Чужое паліто намер
І зноў свае прасцягі мерай.

З юначых год мне вецер — друг,
Пасябравалі мы ў Сібіры,
Там роўнядзь белая наўкруг,
І друг спачатку быў настырны.

Я крок зраблю, ён адштурхне
На два, на тры, а то й на дзесяць...
Ды гэта цешыла мяне,
І ў небе весяліўся месяц.

Спяваць хацелася тады,
Хоць і сама сябе не чула,
Як замяце пурга сляды
І сцежкі апусцелых вулак.

А мне ж у школу, там дзятва
Чакае у халодным класе,
Пакуль мы з ветрам твар у твар
Свае зацятасці не гасім.

Але з часінай, пакрысе,
Ужо не мог ён з месца зрушыць,
Як ні хвастаў мяне, ні сек,
Як ні свістаў нахабна ў вушы.

Яму спявала я ў адказ
І пасміхалася, як другу:
Не ведаў ён, што ўжо не раз
Рабіў мне добрую паслугу.

Ў той час, па згадках дарагі,
Мне сну заўсёды бракавала,
А Кія срэбрам берагі
На сон зімовы ітавала.

Гадзін было, бадай, зашмат
Для маладзенькае дзяўчыны,
Бо школы дзве, і нездарма
Ёй трэба з ветрам паядынак.

З вясёлым посвістам здымаў
Ён змору і цяжар празмерны,
Агонь на шчокі надзімаў,
Каб сэрца не губляла веры.

. . . .

Здаецца, праплылі вякі
У хвалях пáдання і ўзлётаў.
А вось у гэтыя дзянькі
Мне так шкада мае самоты.

Бо тут сяброўства ажыло:
Мы з ветрам стрэліся сам-насам.
І зноў юнацтва загуло
Купальскім вогнішчам нязгасным.

І ў зыркім полымі яго
Мы з ветрам удваіх блукаем,
Ён раздзімае той агонь,
А што рабіць з ім — я не знаю.

ДАЛЁКА

Не заспявае птушка на чужыне
Тым голасам, што звык гучаць у лесе,
На гонкай смаляной хваіне,
Дзе зоры спяць і спачывае месяц.

І ўсё здаецца тут ужо нямілым:
Не даспадобы вецер мітуслівы,
І гор нязграбная пахіласць,
І шызыя ў даліне слівы.

Усё — не тое, і душа смуткуе —
Не ўгаварыць яе і не разважыць.
Яна, як птах: ёй трэба хвойку тую,
З якою спеў з малых гадоў суладжан.

САКАВІК

Гасцінец сустрэў мяне белаю даллю
І смутнаю песняй аснежаных дрэў:
Здавалася, вёсны тут не бывалі
І бор у адвечнай зіме састарэў.

Нярушнай аблонню блакітнага снегу
Ляжала дарога ў той белы сусвет,
А сэрца ўжо ведала: блізка адлега
За лютым пачціва стаўляе свой след.

Я чула яе маладое дыханне,
Хоць моцна на снезе рыпеў чаравік.
І ў гэтым павеве было абяцанне,
Што хваляй цяпла паднялося ў крыві.

І раптам на белым высокім пагорку
З'явілася сонца ў вялічнай красе,
І так запалаў залаты адвячорак,
І так засвіціліся елачкі ўсе,

Што я, не ўсвядоміўшы марнасць жадання,
Угору пабегла — рукою крануць,
Патрапіць у гэта жывое паланне,
У вочы праменныя зблізку зірнуць.

Схавалася сонца... За новым пагоркам
Спачыла яно ў задуменнай красе,
А поруч ужо узыходзіла зорка
І месяц вылузваўся з хмар пакрысе.

Іначай тады засцявалі яліны,
Запеўкай вясны задзівілі мяне:
Дык, значыцца, выйшла яна на пуціну
І нашай дарогі з табой не міне.

САЛЮТ

Над вохкім садам веснавым,
Над нашым горадам прыгожым
Салют ударыў агнявы
Маёвым громам пераможным.

Ракеты мкнулі ўвышыню
Чырвоным, сінім мнагазор'ем,
Снапы вясёлага агню
Гайдалі веснія прасторы.

Асфальт блішчасты ад дажджу
Падвоіў іх у кожнай кроплі,
І мы ўжо страцілі мяжу:
Зямля і неба сталі поплеч.

ПАЭЗІЯ

Ці ты намерыўся пісаць
Самотнай ноччу напрадвесні,
Ці сэрца ўразіла краса
Раптоўна прагучаўшай песні,

Ці смутак на далоні ўпаў,
Нячутна, быццам пух з таполі,—
Ў сваёй душы ты, як сляпак
У неабсяжным чыстым полі.

Ідзеш на хвалю цеплыні,
На водары паўдзённых ветраў,
На пырскі свежыя з крыніц,
І раптам ты чамусьці ў нетрах,

У пушчы жалю ды тугі,
Нібыта ўжо дарэшты знанай,
Аж зноў яе па берагі
Ва ўсе ставы паналівана.

Не кроч бяздумна за радком,
З яго хвалюючым сугуччам,
Будуй трывалы моцны дом
Для думкі смелай і бліскучай.

А ўжо тады насаджвай сад
І краскі пышна разгадоўвай,
Хай ліпы носяць ад прысад
У наваколле пах мядовы.

Хай зоры шастаюць з нябёс
У куст шыпшыны ружаваты,
І цэлы іх сліпучы Воз
Няхай гарыць сабе над хатай.

Усё тады стрывае верш
На стрыжні спелай вострай мыслі
І спраўдзіць лепшы твой намер,
Які ты вынасіў ці выснiў.

МАКІ

На волкі зялёны дзірван
Пакіданы зыркія макі...
Буяе над ліўнем трава,
І гаснуць яны, небаракі.

Калі ж дзе-нідзе і шугне
Жывое паланне пялёсткаў,
Ніхто той красы не міне —
Туды пакіруецца проста.

Дзіця, што не лічыць гадзін
І радасці меж не спазнала,
Нядоўга на кветку глядзіць,—
Зрывае галоўку без жалю.

А дзеўчына з чыстым чалом
І першага смутку смугою
Ідзе той красе на паклон,
Што раны дзявочыя гоіць.

Яна не кране хараства
І прагнай рукой не дастане,
Хаця і не ведае ў твар
Дачаснасць і боль адцвітання.

МУЛЯЖЫ

Не люблю безудзельных аблiччаў,
Як у рыбы, прыснулых вачэй,
Што глядзяць з магазiнных палiчак
У святле электрычных свячэй.

Са старога цвiлога пракату
Пастаменты прыдбаюць сабе:
Прастарэкуюць важна пра атам,
Што патрушчыць сусвету хрыбет.

Нехта тут прычынiцца павiнен,
Мозг укласцi i сiлу сваю,
Каб расчысцiць для iх пуцявiну,
Дзе выгоды дарма раздаюць.

Чым драбней, чым нягдатней iстота,
Тым пагардлiвей позiрк i рух.
Так вылазiць на сонца драбнота,
Абдзiраючы з лiпы кару.

Самавiта абседзеўшы месца,
Што становiць яго дабрабыт,
Ён гатовы i вышай пралезцi,
Каб i славы яшчэ прыдабыць.

Не люблю абыякавых твараў,
Безудзельных, як пустка, вачэй,—
Гэта з тых, што душу атавараць
I ўладкуюцца есцi ямчэй.

НІЧОГА
НЕ ПАЎТОРЫЦЬ ДЗЕНЬ

Нічога не паўторыць дзень
Ў сваёй імклівай панараме,
Не надужай дарэмна памяць:
Ніводзін штрых не супадзе.

Ды і душа твая жыве
Па тых жа простых запаветах:
Сягоння ўцехаю сагрэты,
Ты заўтра ў прочкі йдзеш, за свет,
Пазбыць раптоўную бяду
І смутак дзе згубіць дарогай...

Людзей зазнала вельмі многа
Душы ўратоўчую хаду.

Не ў чайльд-гарольдавым плашчы,
З купюрамі ва ўсіх кішэнях,—
З чырваназорных пакаленняў,
Што пешкі лёс ішлі лячыць.

Бліжэй да сонца і вышынь,
Напрасцякі, па непраторах,
На самых чыстых снежных горах,
Дзе дыхаць шырака душы.

Пакуль цяпельца не палі,
А, як рабілі партызаны,
Агледзь звярэджаныя раны,
Спачні на водарнай зямлі.

А ўжо на золку з песняй руш
Яшчэ няўпэўненага шчасця.

У падарожжы ўсе напасці
Пазбыў ты з працавітых рук.

Любі, як суджана любіць,
Цяпер пішы, вырошчвай зерне,
Зямля табе у стократ верне
За ўсё, што здолееш зрабіць.

ВЯКІ НЕ ЖЫЛОСЯ ТАК ПРАГНА

Прагрэтыя промнямі шчыльныя шыбы —
Краніся рукою, схуднелаю, белай:
Там верасень ходзіць па жоўтых сядзібах
І шастае сшыткам асенніх навелаў.

Чырвоныя клёны стаяць нерухома,
Не кратае вецер красы бездакорнай...
За тысячы вёрст я ад гэтага дому
І далей і далей прастую пакорна.

Чырвоныя клёны, высокае неба,
Адолена далеч ужо немалая,
А ўсё яшчэ прагнецца, нечага трэба,
Як быццам напоў усё сэрца стрывае.

Самота, як мыліца, блізка, пры боку,
Успёршыся, можна дайсці да пасцелі,—
Дарадца найлепшы, праверачы стокрацы,
Што блізкія спадкі не лічыць, не дзеліць.

А іх жа — без меры! Уяваю сэрца
Не ўхопіш злічыць, ацаніць і агледзець.
Ды сэрцу трывожна — усё не па мерцы! —
І ў нечым само сябе мкне апярэдзіць.

І страціць мне гэта ў адным недапітым
Кілішку дыхання, заціснутым ватай
Туману і золі асенняй, калі ты,
Дыхнуўшы, каб жыць, не далічыш утратаў?!

А іх жа — без меры! — дзівос несмяротных.
Што ночка настоіць на зёлках хмялістых,
Каб досвітак водарыў мёдам у сотах
І цёмна-зялёным парэчкавым лістам.

Вясна іх раскідае шчодрым павевам,
Дыханнем ракі, ручаіны, азёраў,
Змываючы ўтому вясёлай залевай,
Што мкнецца ў глыбіні прадонныя мора.

А лета — у фарбах густых Тыцыяна,
У золаце жыта, у чырвані ягад.
У марах, у думах, у шчасці зазнаным,
Што зноў ды ізноў абзываецца смагай.

І ўсё гэта страціць. Ніколі, ніколі!
Вякі не жылося так прагна, як зараз,
Калі раскашуецца розум і воля,
К жыццю заклікае смялейшыя з мараў.

Нібыта усё мне сягоння пад сілу —
Паэмы пісаць у развоі натхнення,
З людзьмі гаварыць, як ніколі не сніла,—
Пра нашага часу святое сумленне.

Мо здасца каму, што я гэткім авансам
Прашуся ў жыцця, абяцаю падзяку,
Яго праслаўляючы вершам і стансам,
На адтэрміноўку раблю нібы закід.

Хай так. Самагубцы з нас дужа благія —
Нам жыць бы ды жыць на зямлі пацяплелай,
Каб кожны, па сіле надаўшы вагі ёй,
Сваю у бяссмерці засведчыў аселасць.

ЗІМОВАЯ КАЗКА

Маўклівым адвячоркам
Пад ветру ціхі ўзмах
Бялюткаю ваўёркай
Прыйшла да нас зіма.

Саскочыла з яліны,
Хіснуўшы белы след,
І лапкамі галіны
Узор кладзе на шкле.

Мярэжыва, як казка
Пад родны матчын спеў
Пра бор вячысты наскі,
Пра ціхі гоман дрэў.

Пра белую хаціну
З сабакам у двары,
Што вокнамі свяціла,
Як позняцца сябры.



Пакліч мяне ў госці, святая спагада!
Прыйду, за шырокім прыбраным сталом
Насупраць кахання я ўпэўнена сяду —
Яму ўсе пачуцці б'юць моцна чалом.

Хай поруч са мною тады апынецца
І жальба са смуткам, і скруха сама,
Ды я не дазволю слязіне ўзгарэцца,—
Хай вока тым клёкам не вільжыць дарма.

Здавён пагарджаю я сытую літасць,
Яна не павінна парог перайсці...
Мой боль, акавітай спагады абмыты,
Лагодзіцца,
Ціхне,
Бадай перасціх.

ПОЗНЯЯ ВЯСНА

У барацьбе сваёй зацятай
Вясна вяснянкай не гучыць,
Яшчэ стараецца лапаты,
Каб снег з-пад дрэў разварушыць.

Цяпла, цяпла! Планета мерзне,
Вялікдзень набліжае крок,
А холад у душы празмерны,—
Бярозы ледзянее сок.

Каторы год, закаржанелы,
Такой парой хмурнее бор,
І птаства не чутна капэла,
І госць не завітае ў двор.

Але цвіце мая пралеска,
Відзён пялёстак на мяжы,
Там, дзе праменіцца падлесак
І горнуць цеплыню лаўжы.

Рука не ўздымецца на кветку,
На мужны сіні аганёк,—
Хай дачакаецца тут лета
І ўзыдзе поруч верасок.

НЕ УМЕЮ НАЗВАЦЬ...

Не весялосць і не сумота,
Нібы рукі спагаднай дотык.
Як з цёплай кроплі
Дождж пачаты
Адвільжыць можа сіл напятасць,
Так гэты дотык гасіць змору,
Не назаляючы паўторам,
Не дакляруючы нічога,
Апроч твайго, душа, нарога.

Ары глыбей, і ты пазнаеш,
Што там гучыць за небакраем,
Якая музыка надвечар
Жыццю так горача пярэчыць,
Твайму жыццю, твайму блуканню,
Твайму трывожнаму дыханню.



Клавір юнацтва адгучаў,
Недаказаўшы столькі цудаў,
Таму што ўдарылі з пляча
Смыкі, паглухшыя ад гуду.

І песня ўпотайкі сышла
У неймаверныя аддалі,
Не акрыліўшы ні чала,
Ні дум, што долю пачыналі.



Дабро спыняецца раптоўна
І, азірнуўшыся назад,
Мяжу пяройдзе і гатова
Пачаць варожасці абзац.

З вялікай літары таксама
Чарговы дзеецца раздзел,
А недзе там, за тоўстай брамай,
Спагада шыецца ў гняздзе.

Ці выпырхне яна на крыллі
Зноў падужэлага дабра,
Ці безудзельнасці пара
На сон нас воблакам укрые?

СІБІР

1

Твой першы вобраз — шум тайгі,
З марозу белы, як туман.
Ім зачынаецца зіма,
Калі захрумстаюць снягі
Суровым водгукам тых дзён,
Якім і кара і праклён.
Яны у замёце, іх няма.

А зор буйных, як назнарок,
Пад дом накідалі вятры,
Хоць набліжаўся родны крок,
Саслізгваючыся з гары.

Ад іх ты вызваліў парог,
І пакрысе
Згасалі ўсе.

2

Твой першы дар — таежны мёд,
Нібыта з інею сабраны,
Быў водар гэтых чыстых сот
З чаромхі весняй, моцна п'янай...

І калывалася зямля —
Чужое, дзікае прыстанне,
Ды вырастала спакваля
Душа з маіх выпрабаванняў.

Але нібыта ўсе снягі
Пад дом нябёсы сцерусілі,

Каб не паставіць мне нагі,
Каб зноў караць мяне бяссіллем.

Крычаў там вецер, як прарок,
Ды мімаходзь зірнуўшы ў вочы,
Адным парывам змёў парог
І ўжо са мною поруч крочыў.

Ой, вецер, вецер, колькі крыл
Дала табе прырода-маці:
З нягодай ты мяне зміры̆ў
І рукі выхапіў з пракляцця.

BY PEN[1]

Юначы смех, дыханне старту! —
Як ён ахрысціць, першы гром?
Як словам — не на жарт ці жартам
Ты перакінешся з пяром?

Каго мінула гэта чаша
У блаславёную пару,
Калі не точыць сэрцаў шашаль
І ўсё на ўздым, і ўсё ўгару!
А хто не цешыўся з суладдзяў

Магічных і няўцямных слоў! —
І толькі ж л і ч а н ы не здрадзіць,
Душу крывавячы стылом.

---

[1] З дапамогай пяра *(анг.)*.

ШЧАСЦЕ

«Чакаючы шчасця, праспіся як след!» —
Вясёлая прыказка раіць,
Японскі ў ёй тоіцца анахарэт,
Аднак жа для шчасця пара ёсць.

Бо шчасце не ў часе —
Яно, як цыклон,
Няклікады гром у сінечы.
Тады сцеражыся раскрытых акон —
Ён можа твой дзень панявечыць.

Не трэба мне сну.
Можа, ў сне абміну
Хвіліну, дзе родзіцца шчасце,
Праспаю і рукой яго не закрану,
Не сціісну ва ўпэўненай пясці.

Шукаем, чакаем, а дзе яно ёсць?
Як хваля, плыве акіянам,
Усмешкаю стрэне тваю маладосць,
Усцешыць прываблівым зманам.

І далей паплыніць у срэбных вірах,
Змяняючы воблік праменны:
Залішне шырокі у шчасця размах,
А век твой — адна мізансцэна.

Прыткнешся на трохі. Аслухай душу:
Ці ўцешна ёй тут апынуцца,
Ці недзе так прагна спявае ашуг,
Як толькі пяецца на дудцы.

Жалейкаю сэрца парве па шматку.
Успыхне смугой недасяжнасць.
А ты? Апынешся зусім убаку,
Да шчасця ўжо безуважны.

НЯМА...

З якіх галактык зніч упаў,
Маёй утратай стаўшы доле,
Каб з дрэва мела я апад,
Гаркавы яблык у прыполе?

Іду, валочачы гады,
З тугой, што ўсё дужэе ў руху...
Слядкі, слядкі... З мае хады
Ушчэнт змяла вас завіруха.

Як гэты ранак залаты,
З расцвіўшым бэзам на бульвары,
Дзіця, мне зноў смяешся ты,
Смяюцца вочы, вусны, тварык.

Свет некранёнай чысціні,
Жыцця пачатак, шчасця прага,
Мне ручаняты працягні
З усёй дзіцячаю адвагай.

ТОЛЬКІ ВОЧЫ НАПАСЦІЦЬ

Ды навошта глядзець,
Толькі вочы напасціць,—
Як насустрач ідзе
Чалавецкае шчасце.

Без прыкмет, без адзнак,
Без вясёлкавай дужкі,
А здалёку пазнаць
Можа кожны ідушчы.

Ё н нясе немаўля,
Абыходзячы вады,
А я н а спакваля
Выпраменьвае радасць.

Дакранецца рукі
Ці абмовіцца словам,
Тым, што чулі вякі
На нязлічаных мовах.

Ясным зіркам адным
Прагне разам абняць іх,
Бо ад самай вясны
Маладая — ўжо маці.

Ну, навошта глядзець,—
Толькі вочы напасціць:
Мне насутрач ідзе
Незазнанае шчасце.

ЯК ПЕРШАЙ ПЕСНІ СВЕТЛЫ ЎЗЛЁТ...

З маленства ты зрабіла крок
У гэты свет уяўны:
Ледзь змеркне — казка на парог,
Зліецца з мілай явай.

Дзяўчынка з нэндзы і бяды,
Ты ў снезе рвала ружы,
Табе адной цвілі сады,
Як залюцее сцюжа.

З вясны вучылася глядзець
На сонца, проста ў вочы,
Не апускаць іх і ў бядзе,
Што сэрца болем точыць...

А недзе музыка гучыць —
Не танец, не, не танец:
Як хваля, штосьці зацурчыць
І даллю ў вочы гляне.

Па венца поўніцца тады
Той свет, дзе сэрца б'ецца,
І белыя вакол сады
Ці ў шэрані, ці ў цвеце.

А першай песні светлы ўзлёт —
Крыло нябачнай птушкі...
Прайшло як быццам сотні год,
А пачуццё нярушна.

СВЯКРОЎКА

Была ў мяне свякруха,—
Хай будзе дол ёй пухам!
Яна пісала вершы,
Слязіну ўдоўкі сцершы,
Пісала ўдзень і ўранні,
Замест імшы, літанняў,
Замест мяшчанскіх плётак
У коле аднагодак.
З галоўкай кучаравай
Хадзіла лёгкай павай,
Смялялася лагодна
Пагодай і нягодай.

Яна мяне любіла,
За што — дасюль не знаю:
Дзяўчо ў сям'ю прыбіла,
Як з пералётнай зграі...
Ды з тых міглівых кратаў
Я вымкнула крылата...

Была ў мяне свякроўка,
Ліхім не ўспомню слоўкам.

НАД ВОЗЕРАМ

Страчаю сонцавы ўзыход
Над возерам ласкавым,
Без турбавання, без прыгод,—
Вось так страчаць бы з году ў год,
Каб мець на гэта права.

Ружовасць сонцавых павек
Забарвіць вейкі-промні,
І ты ўзыходзіш — Чалавек,
Да ўсіх вяршынь паломнік.

Расплюшчыш вочы у відно,
Вярнуўшыся з вандровак,
І заружовіцца акно,
І ў свеце будзе ўсё чутно,
І абзавецца слова.

ДРУГ

Я маю друга ў гэты тлумны век,
Між бессмяротных Герцэна абраўшы,
Ні картак, ні лістоў у дом не слаўшы,
Са мною поруч крочыць Чалавек.

З адлегласці стагоддзя мне чуваць,
Як плешчацца пад промнямі затока,
Як асамотнены і гнаны крок за крокам,
Ён «Звонам» волю пачынае зваць.

Між бессмяротных, можа, ён адзін
Маёй душы так моцна дагадзіў.
Гарачым словам, ёмкім і густым,
Што насычаў да нашчадкаў лісты,
Адвагай дум нязломных, на вякі,
Яны і сёння нашы маякі
Зацятасцю у пагарджанні зла,
Якая ў бітвы дзень у дзень вяла.

А поплеч, аграваючы душу,
Стаяў любві азораны Машук,
Айчыны вобраз, сны чужых начэй,
Што з году ў год перад вачмі ярчэй...

Маленькі Шушка, Герцхен [1]... Волат дум,
Іскандзер і Званар, планеце ўсёй вядомы,—
Я чую звон і воддалек іду —
Як лёгка перакрочвае ён стромы.

---

[1] Шушка, Герцхен — дзіцячыя імёны Герцэна.

Янка Купала

ЧАМУ?

Гляджу на сябе я чужымі вачамі —
Прыхільнымі? Не. Спачувальнымі? Не.
Стаю на астатнім няпэўным прычале,
І, можа, нікога мой лёс не кране.

«Чаму ў вас такія журлівыя вочы? —
Пытаўся Купала ці раз у Маскве,—
Ці штосьці вам сэрца гарачае точыць,
Ці гэта ў ім боль непагасны жыве?»

Тады я смяялася разам з паэтам,
Адказу не маючы, як і цяпер.
Было яго слова лагодай сагрэта,
Спагаду сваю аддаваў напавер.

І я захавала яе даастатку,
І сёння ад згадкі цяплее душа...

Пакутную ён нам пакінуў загадку —
А хто ж бы адважыўся зараз рашаць?

АДНОЙЧЫ АДВЯЧОРКАМ

Той дзень, адыходзячы, плакаў
Скупенькім, а буйным дажджом.
Туляўся бадзяжны сабака,
Ішла ты, нібы на ражон.

Купала, Купала, Купала!
Жыве гэты вечар дасюль,
І вуліцы ў лісці апалым,
І вокнаў гасцінічных цюль.

Мой божа, куды ж ты дапяла,
Чый смех за дзвярыма гучаў?!
Купала, Купала, Купала!
Не знаў ён, каго прывячаў...

І я адступіла з парога,
Не хочучы бачыць гасцей,
Шумела ў паэта аблога —
Быў сябар і быў ліхадзей.

І прыкра мне стала, і горна...
Ён, рушыўшы ўслед, зразумеў,
Што мне перацiснула горла,
Але запыніць не паспеў...

Прасцягамі плошчаў маскоўскіх
Мая праставала туга,
І вочы адвёў Маякоўскі,
Як з грому ліхтар заміргаў.

Іван Дамінікавіч, мілы,
Я вам даравала даўно,
Вы зналіся з іншаю сілай,
Не з той, што бунтуе віно.

Няўцямна было і закляцце,
З якім я сталела тады,—
Была гэта спадчына маці,
Яе ліхалеццяя гады.

Цяпер вам відно з п'едэстала,
Як вуліцай вашай іду...
Купала, Купала, Купала!
Бяды свае не развяду...

Рукамі расквоherных смуткаў
Мне вас не ўтрымаць на мяжы
Мае неадольнай пакуты
І прагі, каб волат ажыў.

Купала, Купала, Купала,
Набліжана ваша пастаць:
Я вершы ў «Маскве» вам чытала.
Іх мусіў хто-небудзь чытаць.

Любілі прачуць вы [redacted] аддалі,
З жаночых узрушаных губ,
Радкі, што вы з музай складалі,
Што зараз чытаць не змагу.

АПОШНЯЯ СУСТРЭЧА З ІВАНАМ ДАМІНІКАВІЧАМ...

Ці ўспаміналі вы калі
У Печышчах татарскіх,
Як па Маскве са мной брылі,
Як вы тады свой лёс клялі,
Адораны па-царску.

Нам не свяціла ноч вайны
Ні ліхтаром, ні ўсмешкай,—
Было далёка да вясны,
Да нашай ветлай стараны
З суніцамі на ўзмежку.

Масква ласкава нас вяла,
Зыбаючы дарогі,
Праходка лёгкая была,
Яшчэ хапала змогі.

Штосьзамігцелася здалёк —
Ці зоркай, ці смугою,
І мы спынілі раптам крок,
Сумеўшыся абое.

Хіснуўся ў змрок ваш сілуэт,
Так зграбны, як юначы,
А я не кінулася ўслед,
Хоць думалася — трачу...

Пайшла пад свой няпэўны дах
Істотаю трывожнай,
Каб потым з болем прыгадаць,
Як падступалася бяда
І хмары йшлі аблoжна.

НА КУПАЛАВАЙ ВУЛІЦЫ

Пішацца, не пішацца,—
Дачакайся дня:
Сэрца ўранні сцішыцца,
Час і боль суняць.

Ах, якая раніца
У галлі вярбін,
Яшчэ спіць абранніца,
Яшчэ марыць сын.

Зноў навыдумляла ты
Кружнявых пакут,
Хіба яшчэ мала тых,
Што душу пякуць...

Хай сплываюць Свіслаччу,
Роднаю ракой,
Дзе ракіты віслыя
Клічуць твой спакой.

Вуліцы Купалавай
Дом мой — не чужы.
Вось калі прыпала мне
Поруч з вамі жыць!

А пад поўняй тужыцца —
Ночка сее жаль:
Дужаму нядужыцца,
Кволаму — мяжа.

ДЗВЕ НОЧЫ ЗАПАР БІЎ ПЯРУН...

У колеры агністых кан
І ўсіх густых адценняў бэзу
Афарбавалася рака,
Якую след маланкі зрэзаў.

Дзве ночы запар біў пярун,
Цаляючы у сэрца проста,
І ў гэту жорсткую ігру
Такі ўплялася наша ростань.

З залевы лютай і крутой,
Як кіпень, з параю гарачай,
Усчаўся ўрэшце той патоп,
Што знішчыў лёс мой неабачны.

МАЦІ

Ва ўсім, ва ўсім мы горшыя за іх:
З вачэй, з душы, з любові неабачнай...
Спеў маці! Ён і сёння будзіць слых,
Сірочаю гаркотай не зыначан.

Раскошу неймавернага святла
Ты страціла, і назаўжды, навечна,
Калі яна, што за руку вяла,
Адна ўначы ручай пераплыла,
І раптам неўспагадная імгла
З нябёсаў сцерла сонца і сінечу.

МАТЧЫН ДОМ

Ёсць штосьці большае ў жыцці,
Чым сэрцавы згрызоты,
Даць кожнай зёлцы зацвісці,
Не змарнаваць цэйтноту.

Калі ў сутонлівых гадках
Падлічваеш патраты
І ў бедных жалішся радках
На заімшэлы фатум,

Ёсць штосьці большае, яно
Прыходзіць бліскавічна,
Яго не ўбачыш ні ў кіно,
Ні ў смешцы іранічнай.

Узгадаванае ў журбе,
У найсвяцейшых смутках,
Яно прыгорнецца к табе,
І ты, без парашута,
З адною прагай вышыні,
Прасторы і сінечы,
Душою згледзіш ці сасніш
Прытулак чалавечы.

Святлее неба над гайком,
Лугі цвітуць барвова,
І ты ідзеш у матчын дом,
Вярнуўшыся з вандровак.

МАТЧЫН ГОЛАС

Адна мне ўцеха —
Радкі, як з меха.

Я пачынаю жыць нанова,
Калі журлівым днём, адна,
Ў сабе раптоўна чую слова,
Нібы закранута струна.

Ды не чутна яна нікому,
Нідзе не ўзрушана душа,
Гучыць сугучча, як бяздомак,
Няма куды яму спяшаць.

І я ў бадзянні і ў каханні
Страчаю захад свой і ўсход.
Не знае сонца перайманн́я,
Хоць узыходзіць плоймы год.

Я пачынаю жыць нанова
Самотным вечарам, адна,
Калі ў сабе пачую слова,
І раптам зрушыцца сцяна,

А матчын голас так затужыць,
Такой пяшчотай ахіне,
Што песняй цэлы свет асмужыць
І слова
    зноў пакіне мне.

СОК ВЕЧНА ГОНІЦЬ САКАВІК

Паэзія — лязо, ці лезвіе,—
Душа наткнецца — і ў крыві.
Так у падсочанай бярэзіне
Сок вечна гоніць сакавік.

Яна пакутуе прыкутая,
А сонца вусны прыкладзе
І вып'е боль, што быў атрутаю,
А стаўся парасткам надзеі.

Не ўсё, што рыфма залыгала,
Святой паэзіі прагалак,—
Прамый на драгах чыстай мовы
Глей пачуцця — і блісне слова.

А колькі іх табе прыпала
Тых залацінак, ці апалаў?
Адзін аскепачак зіхлівы,—
Ды ты, як бог: не знаў уплываў.

СНЯГІ

Зіма ў нас сёлета — красуня:
Без завірухі ані дня,
Турботы ўсе мае касуе
Мяцелічная мітусня.

Снег растае на цёплай скроні,
Паруюць кроплі на чале,
А віхар гоніць, гоніць, гоніць
Адны снягі другім услед.

Такой зімой у маладосці,
У дваццаць тры мае гады,
Патрапіла ў Сібір я ў госці
З усенароднае бяды.

І пад завейныя кадрылі
Мы з ветрам біліся штодня,
Пакуль вырошчвала я крылле,
Хоць мы з Пегасам не радня.

А ўлетку на шумлівай Кіі
Намыты драгамі пясок
Таіў залоцінкі малыя,
Што ад вытокаў нёс паток.

Ці гэта сонца палымнела,
Раззіхацеўшы ўвесь прасцяг,
Што бераг спрэс быў белы-белы,
Як снежных зім маіх працяг.

Цяпер не летую на Кіі,
Мой свет абліччa памяняў:
Ужо віхурную стыхію
Час упакорыў і суняў.

Хай вее снежная завея,
Над ёй не зрушыцца страха,
I сэрца хіба не азглее,
Як на сіблагаўскіх шляхах,
Хоць тых снягоў і тут крыха.

ГАЛІНА ГАЙДАЕ ДРАЗДА

Гляджу, як вячэрае дрозд
Яшчэ ружаватаю вішняй,
Ды ім жа, малым, нападрост
У дзюбы падкінуць нялішне.

Галіна гайдае дразда,
І так яму смачна клюецца,
А з нас, нелятучых няздар,
Ён ціхенька нібы смяецца:

— Няма ў вас мае вышыні,
І крылы не маюць размаху,
Каб так: разгарні і звіні
Пад самым валошкавым дахам.

ФРАГМЕНТ БЫЦЦЯ

Я рухавай раблюся
І нібы шчаслівею.
У маёй Беларусі
Ніва спеўная спее.

І на хвалі мянёнай
Каласоў пазлацаных
Бачу сонца карону,
Як з буйнога экрана.

Трэба вочы заплюшчыць —
Так зіхціцца прастора —
Праглядаюцца пушчы
І нябліскі ўжо горад.

Не было, не бывала
На шляхах маіх дзіўных,
Каб яно гэтак ззяла
Непаўдзённай гадзінай.

І я стала рухавай
І нібы шчаслівею...
Заспявала б я нават,
Ды даўно ўжо не ўмею.

ПЯЦІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ



4 Зак. 2074

ТВАІХ ЗАВЕЙ НАМ НЕ ЗМАХНУЦЬ...

Снягі пад сонцам расцвітаюць,
Мянёным полыскам мігцяць,
На столі пасма залатая,
Дарогі сонцавай працяг.

І я збіраюся ў дарогу:
Ці снег, ці цукар пад нагой
Рыпіць ад самага парога
І нешта шэпча наўздагон.

Я не хачу нічога слухаць,
Аб чым нагадвае ён мне,—
Ні смутак, ні сівая скруха
Ужо мяне не дажане.

Я абцярушваю на ўзлессі
Снягі з пахіленых галін,
Яны цяжар надмерны неслі,
А зараз шумна ажылі.

Шапнулі: але ты прабач нам,
Тваіх завей нам не змахнуць,
Хоць елкам уласціва ўдзячнасць —
Ты спадзявайся на вясну...

ВЯСНА ПОЗНІЦЦА

Прыходзіць час астатняй зморы —
Залішне сёлета снягоў,
Залішне чорны хмары морак
Неўлітасціўленых багоў.

За вокнамі вясны трымценне —
Яшчэ там бедныя знакі
Яе зялёнага натхнення,
Яшчэ аголены сукі.

Ізноў так позніцца ратунак
Ад завірушнае зімы,
Каб сок з бяроз —
Найлепшы трунак —
Сініцам горлейка прамыў.



Пад лісцем чырвоным, пад ветрам
Стаялі яны ўдваіх,
Юнацтва залётніцкі ветразь
На хвалі імчаўся да іх.

Яго калывала раздолле,—
Да рэк падплывалі лугі,
А ім залатая няволя
Кавала ужо ланцугі.

ПАЧУЦЦЁВАЕ ГАЛАДАННЕ

Гармонія працы, спачыну і сну,
Рэжым харчавання суровы,—
І так ты эпоху мінеш не адну,
На месяц сягнеш адмыслова.

А лёгкі пакунак з нітоў пачуцця,—
Ён важыць не больш за лісціну,
А ў ім увесь смак і ўся квецень жыцця,
А ты, як каменьчык кідае дзіця,
У прочках яго недзе кінуў.

ДУШНА

Час задушны, чые ж гэта душы
Так гарэць на вялікіх распалах?
Неба пальцамі не паварушыць,
Каб хоць кропля на попел упала.

Жоўты ліст — не ў пару,
Апякло і кару,
Смажыць горла і выпетраў голас,
Нават сэрца —
І ў ім стала гола...

А ці ёсць зеляніна ў тым свеце,
Дзе яшчэ раскашуецца вецер?

Трэба дождж.
Добры дождж,
Каб упоперак ліў ён і ўдоўж,
Дождж касы, дождж улеўны, густы
На лясы, верасы і кусты,
Дождж у вочы, у сэрцавы спрат,
Хай прамочыць жыццё як з вядра,
Хай, як з бочкі, ліецца тры дні...

Вось тады ты мяне ўспамяні.

НЕ КРОЧ НАСУСТРАЧ ЁЙ

Звычайны зімні дзень прыгас на панадворку,
Замгліўшыся ў акне бялюткага дамка,
Міргнула праз туман бліскучым вокам зорка,
І месяц падміргнуў з-за воблака ў адказ.

Часінаю такой на вузкую сцяжыну
Слізгоўнаю хадой дзяўчына узышла,
Схіліліся над ёй вярша́ліны ялінаў,
І хвоя за каўнер сняжынак намяла.

У свежай цеплыні бязмежжа снегавога
Лятункам агнявым займалася душа,
Паўстала перад ёй нязнаная дарога,
Бліскучая, як лёд, да радасці шаша.

А хтосьці з-за ялін сабе ў сіло падсочваў
Імклівы рух яе і пераможны смех,
І гнуткі стан яе, і плынны крок дзявочы,
І ў цёмных кудзерах ужо расталы снег.

Ды ні адно сіло птушыны не ўтрымае —
Часінаю такой яна імкне ў палёт.
Не залаці ёй крат: твой белы дом — турма ёй,
Ты будзеш там адзін у поўні доўгіх год.

Не кроч насустрач ёй: ты шмат пабачыў свету,
І ўжо не растае на цёплай скроні снег.
Хай маладосць жыве па ўласных запаветах,
Каб доўга не сціхаў той пераможны смех.

ЯШЧЭ АДНА У ЖЫЦЦІ

Вясна пазніцца пачала
Ужо гады са тры:
Завей не абтрасе з крыла
І спіць у гушчары.

На досвітку — салодкі сон
Пад лапамі ялін,
Пад белай замеці крысом
Пры маладым камлі.

Зямля ж гатова распачаць
Увесь вясновы чын,
Але маўчыць яшчэ ручай,
І чорны шпак маўчыць.

Сініца госціць у дамку
На хвойцы пад акном,
Атаўбавалася, пакуль
Шпачыхі не відно.

Сініца, як жывы прамень,
Мільгае між галін,
І ў жоўтым пер'і ціхі дзень
Ідзе ўгару з далін.

Ідзе маруда-сакавік,
Каб сыпаць з торбы снег,
Так дзень пры дні ён сыпаць звык
І сёння не міне.

Хапай рыдлёўку, паспявай
Сцяжыну пракладаць,
Каб забуяла тут трава
Вясной, як сенажаць.

Каб твой не загубіла след
Мяцеліца ў начах.
Як гаспадар і як паэт
Ідзі, вясну страчай!

І, прыхінуўшыся бліжэй,
На вушка шапяні,
Што час ужо зямлі тужэць,
Замкі збіваць з крыніц.

Крый божа, рыне гэты снег
З гары, як вадаспад,
Залевай рэчку захлыне,
Затопіць луг і сад.

І калі ўздужаеш сказаць,
Як цёплы вецер з гор,
Што растрывожыў беразак
І ціхі сон азёр,

Куды завеі ён нагнаў
І доле сам аціх,
Прачнецца ясная вясна —
Яшчэ адна ў жыцці.

МОЙ СТОЛ

Невялікі, нягáматны стол
Пры зімовым падвойным акне,
Ты заўсёды да працы гатоў,
Ты зычліва чакаеш мяне.

Белым веццем яліна махне,
У завейную ноч ідучы,
І на стол мой радкі страсяне,
Што здарожаны дзень асачыў.

Сіні кубак паўднёвых мімоз
Прасцірае з-за мора вясну.
І на золку зімовы мароз
Пахне кветкай ліловага сну.

Хоць на люты хіне каляндар,
А завейна часамі ўначы,
Дык спяшайся шляхі аглядаць
Між бяроз шаранёвай парчы.

З кожным белым сарваным лістком
Ападае на стол цішыня:
Галасы несатлелых вякоў
За акном у завеях звіняць.

Зацішное прыстанне для дум:
Кнігі вершаў гартаюцца тут.
Адыдуся ці з дому сыду —
Стол заўсёды стаіць на пасту.

Жоўтай лямпы кідае святло
На завеяны замеццю след,
Каб дадому мяне прывяло,
Дзе чакаюць лісты на стале.

Дзе машынка чакае рукі,
Звыклых пальцаў жывой цеплыні,
Дзе ты крэсліш і крэсліш радкі,
Што не з тых, не з люстраных, крыніц.

А, бывае, надарыцца госць
За прыбраным ахайным сталом:
То натхненне маё — ягамосць! —
Ахіне мяне светлым крылом.

ХВОРАСЦЬ

Нядобра мне, ліхо́ мне, людзі!
Лес углядаецца ў акно,
Яліну за ялінай будзіць,
Да шыбіны хінецца ноч.

А сэрца ў снегападзе кружыць,
Здаецца, адарваўся ўток,
І бэрсаецца, рвецца кужаль,
І закідае, гасіць зрок.

Самота, ты ўжо неадступна
Ідзеш са мной да рубяжа,
Дзе на астатак пераступіш
Маўклівай засені ў крыжах.

МІМОЗЫ

Мільёны мімоз для масквічак
Імчаць самалёты з паўдня.
Галіны у полымі знічак,
У жоўтых пухнатых агнях.

Купляйце, бярыце мімозы,
Туліце да цёплай рукі.
Сягоння ў сталіцы завозна —
Бярэмы ўгінаюць латкі.

Мільёны галін жаўтапёрых,
І водар мядовы наўкол.
Калі ў вашым доме ёсць хворы —
Не трэба ніякі укол.

Купіце галінку мімозы,
Жывога павеву паўдня,
І хворасці сквапнай пагроза
Згарыць у пушыстых агнях.

Бярыце бярэма для любых —
Шчаслівыя ўсмешкі хаваць,
Наводарыць мілыя губы,
Што ўсё уцякаюць ад вас.

Купляйце, нясіце навалам
На светлыя вокны, на стол
Паўднёвага сонца кавалак,
На хвалі, на ветры настой.

І я зберагаю галіну,
Што зведала некалькі трас:
З паўдня да вясёлай Нягліннай,
Пасля, цераз Воршу, да нас.

Вясны чалавецкай прыкметы,
Я дыхаю вамі, жыву:
У дзень, як пусцілі ракету,
Мімозы ляцелі ў Маскву.

ДАРОГА ЗАЛАТЫХ НАДЗЕЙ

Вось чысты ліст перада мной,
Як гэты чысты ясны дзень.
Аб чым нам гаварыць з табой:
Маёй бядзе, тваёй бядзе?

Была я жонкаю благой,
Бо сына ты не прычакаў.
Тады наводшыбе, з другой,
На свет з'явілася дачка.

Але цябе не ўзрушыў лёс
Галінкі ад таго сцябла:
Ты праз вайну бацькоўства нёс
І без турбот, і без цяпла.

Тады не ведала і я,
Бо скалануўся цэлы свет,
Ці ёсць яшчэ ў мяне сям'я
І што жыве з яе прыкмет?..

Ды не магла я адлучыць
Сваё быццё ад тых сцяжын,
Дзе поплеч, разам ідучы,
Ты быў са мной, а не адзін.

З трывогай за тваё жыццё,
У горкіх неправідных снах,
Жыло, мужнела пачуццё,
А ў сэрца пракрадаўся страх.

Як затуліць цябе і чым
Адвесці ворага руку,
Якой замовай зберагчы,
Якую сілу ўліць радку,

Каб ён цябе, як талісман,
Перасцярог у страшны час,
На крок ад смерці утрымаў,
Святлом адбіўшыся ў вачах.

Ты гэта чуў, ты гэта знаў...
І ў пашматаным шынялі
Не раз пагібель пераймаў,
Калі пад Сталінград ішлі...

А зараз... Цішыня вакол.
На вокнах кветкі, белы цюль.
Дыван ляжыць на ўвесь пакой
Пад ногі ўтульнаму жыццю.

Тут раскашуецца нуда,
Палежваючы на тахце...
Адзіны друг мой, прыгадай,
Якім нам шчасцем зіхацеў
Шлях ад Сібіры да Масквы,—
Дарога залатых надзей!
І гэты напамін жывы
Зноў дапаможа у хадзе.

СІНІЦА СТУКАЕЦЦА Ў ШЫБУ

Сініца стукаецца ў шыбу,
Снег зацярушвае акно.
Усе наводшыбе сядзібы:
Табе не страшна жыць адной?

А як бы лес ажыў зімовы,
Якою б казкаю заззяў,
Каб абудзіць яго тым словам,
Якога ты мне не сказаў.

Сініца стукаецца ў шыбу,
На ганку крокі цішыні.
Што возьмеш ты ў жыцця на выбар:
Ідзі — страчай ці прагані!

МЯЦЕЛІЦА

Аб чым пяюць табе яліны
У гэты белы снегапад?
Ужо не знойдзеш каляіны,
Што тут праторыў лістапад.

Ні следу, ні лістка, ні згадкі:
Адна нячэпаная стынь.
Мяці, мяцеліца, парадкуй,
Каб свет быў чысты і пусты.

Каб тут, у чысціні нярушнай,
Пад спеў яліны баравой,
Даць сэрцу новую уструшню:
Падняць увесь рахунак мой.

Хто сплоціць страшныя выдаткі
Ужо знябытае душы?
Мяці, мяцеліца, парадкуй
І начыстую ўсё спішы!

ДАРОГІ ПОЗНЯЙ ЦІХІ СМУТАК...

Якога колеру туга
У зрэнках ясных і глыбокіх?
Яна то сіняя смуга
Азёрнай хвалі невысокай,
То водбліск вечара ў глушы,
Дзе жыцьмеш толькі яркай згадкай
І музыкаю тых цішынь,
Дзе думак ураджай багаты.

Якога колеру туга,
Што пад павекамі цяжкімі
Падсцеражэ цябе наўзгад
І ўжо ніколі не пакіне?

Што тут прынадзіла яе,—
Дарогі позняй ціхі смутак?
Вось прыжылася і пяе,
Згубіўшы якасці атруты.

Яна то сіняя смуга
Азёрнай хвалі невысокай,
То схаладзелых крыг бяга
Бурлівае калісь патокі.

Ды назначаюцца за ёй
Абрысы постаці знаёмай.
Спыніся, сэрца, перастой,
Дай апрытомнець.

СТАРАЯ ЗНАЕМАЯ

Ізноў сягоння стукала сініца
У шыбу, зацярушаную снегам.
Я заўтра ўранні выеду ў сталіцу,
А там па радыё перадаюць адлегу.

Сінічка з бору, з казачнай яліны,
Каторы раз ты стукаеш у шыбу?
Чыю ж душу тут я ў тузе пакіну,
Ці па тугу сама паеду хіба?

Другой душы ў тузе ты не пакінеш
І па яе табе не трэба ехаць:
Яна з табой, на снезе, на яліне,
На гэтых белых, вельмі белых, стрэхах.

А ДЫХАЦЬ ЧЫМ...

Былі ж яны, былі сустрэчы,
Раптоўныя і дарагія:
Іх пасылаў вясновы вечар,
На лодках ветразі тугія.

І хваля гойдала спагадна,
Не тоячы глыбінь пагрозы...
Але якой страшной уладай
Мне гэтая сустрэча грозіць...

Куды ж нам дзецца з ёю сёння
У цесным свеце сініх раніц?
Чакаць, што тэлефон зазвоніць
І злой драбніцаю параніць?

А дыхаць чым, каму насупар
Ісці ў натоўп, смяяцца ветру,
Каб поруч ветлая падступнасць
Ізноў напяла шэры ветразь?

Любоўю гэта клічуць людзі,
Любоўю горкай, палыновай.
І за яе мяне асудзяць,
І непамысным кінуць словам.

ЧАЙКА

На белай успененай хвалі
Распраствае чайка крыло,
Памкне яна зараз удалеч,
Дзе неба агнём працяло.

І раптам на хмарыне чорнай
Маланка прарэзала след
Ды лінула дожджыкам спорным
У мора, у рэкі, на лес.

А чайка, звясціўшы навалу,
Як з братняй краіны пілот,
Над хваляй ізноў залунала,
У новы памкнуўшы палёт.

Крылатая морская песня:
Ні ўтомы, ні сну, ні цішынь.
Яна, як спагадлівы веснік:
Зважай, ды вясла не сушы!

А Я Б НЕ ЗДОЛЕЛА ТАК ЖЫЦЬ...

Суровы час маёй бяды
Я знала, што рабіць тады:
Была ў ім праўда пачуцця,
А з ёй не схібіць і дзіця.

Любоў вяла мяне на ўсход,
Не дэкларуючы пагод,
Не абяцаючы спагад
І сцежкі лёгкае назад.

Любоў, узяўшы за руку,
Вяла мяне на шлях пакут,
І ў радасць тых юнацкіх мар,
Дзе ні імжы, ні лжы няма.

Суровы час маёй бяды!
Нас шмат на ўсход ішло тады.
І матчын дом глядзеў услед,
Як кожны з нас пачне сталець.

Суровы час маёй бяды!
Якім жа быў ты маладым:
Не знаў мізэрнай барацьбы
За ўежны, дробны дабрабыт,
За славы смешны падгалос,
За гэтак званы шчасны лёс.

Не церпіць песня гэтых зграй:
Пазбудзься іх — тады спявай.

ДЗЯЎЧЫНЕ

За высокай агароджай
Кволы цвет чаромхі белай.
Што душу тваю трывожыць,
Дзе, каго ты не заспела?

І вясна ў красе нязвыклай,
І сама ты, як барвенак.
Дык чаму ўся радасць знікла,
Што з табой была нязменна.

Апазніцца можа шчасце:
Ахініся песняй цёплай —
Ні нягодам, ні напасцям
Не зглуміць з яго ні кроплі.

Падуладнае спрадвеку
Харастау і снам дзявочым,
Шчасце з'явіцца няўмекам,
Ты яго навучыш крочыць.

НА ПЯСКУ

У гэтай азёрнай ясноце
Я зноў акрыяю душой:
Пачуцці і думы ў дрымоце
Пад хваль аксамітных прыбой.

А сэрца? Яго не ўтаймуеш
Ні золкам спрадвечнай красы,
Ні вечарам не зачаруеш,
Што йдзе з Нарачанскай касы.

Яно у сваім, у адменным,
Трывожным і яркім жыцці,
Хіба толькі заклік праменны
Пад вечар, пад захад ацісі...

Ацісі, бо ўжо яркне рабіна
Паміж тапалёвых прысад:
Яна, як жывы напамінак,
Што й гэта мінецца краса.

У ЛЕСЕ

Восень мажной палымянай красы,
Соннага лесу сцяна.
Мякка ступаючы на верасы,
З песняю ходзім звідна.

Хвоі кранемся — суладжаны гук —
Гліца пасыплецца ў мох.
Некуды коні шашой прабягуць,
Нейчы ўстрывожаць парог.

Гонкай асінкі мае не пазнаць:
Кожны лісточак пяе.
Цёплая чырвань, як спелы гранат,
Афарбавала яе.

Не насцярожваюць крокі зімы,
Не пахіляецца лес,
Нават і гром недзе воддаль грыміць,
Кроплі дажджу на чале.

З песняй на золку прыйшлі мы сюды,
З сэрцам, адкрытым красе,
Не здрасавалі тут нашы сляды
Ані сцяблінкі ў расе.

Не патрывожылі ціхага сну
На верасовай зямлі:
Толькі з асіны галінку адну
Мы на дваіх узялі.

ЛІСТАПАД

Як мала лісця засталося
На ліпах і таполях,
І золата зусім звялося
З ляснога наваколля.

Яшчэ ж за тыдзень на гасцінцы
У ім зіхцелі клёны,
І мы — бадзягі-нехацімцы —
Брылі між іх з паклонам.

І ты, па восеньскім законе,
Душа, згалела чыста:
Жывеш у сціску, у палоне,
На дол злятаеш лістам,

Слатой прыбітым і дажджамі,
Нагою прытаптаным,
Што лёг, без крыўды і без жалю,
Зямлю накрыць аддана.

Жывеш па восеньскім законе,
Цяпло стаіўшы скнара.
І ўвесь твой сум і боль бяссоння —
Аб весняй хмарцы — мара.

ШЛЯХІ МАЛАДОСЦІ

Прайду шляхамі маладосці,
Каб згадкай наталіць душу...
На кожным кроку кліча хтосьці,
І я у госці ўсіх прашу.

А сэрца зрок шукае мецін,
Што ўбачыць можа толькі ён:
За гэтай брамкай стыне веццe —
З лісцін пажоўклых медальён.

Была там велічная крона
І сховішча дзявочых мар,
А ў гэтай рамцы медальёна
Які чужы твой сумны твар.

Пад ганак падыходзіў вечар,
І зоры кідалі агні.
І ўжо каханне йшло насустрэчу,
Каб некалі табе зманіць.

І стукала рука у шыбу:
Трывожны і няпэўны крок...
Твой голас я пачула нібы
За трыдзевяць зямель, здалёк.

Мы тут хадзілі з марай поруч
І ростань не ішла між нас.
А поплеч рос юнацтва горад,
Дзе цэлы год цвіла вясна.

. . . .

Іду шляхамі маладосці,
А ці натоліцца душа?
Мы ўсе ў юнацтве толькі госці,
Але куды было спяшаць?!

ГЛІЦА

Навагодняю ноччу запальвалі ёлку,
І ў вачах люстраваліся, гаслі агні.
А сягоння ж усе яе мілыя голкі
На кілім асыпаюцца, ледзьве крані.

Штосьці роніцца з імі: ці радасць, ці смутак,
Непазбыўная любасць ці шчасця крыха,
Што паіла душу і вінам і атрутай,
Але нельга было гэта ўсё не кахаць.

Навагодняю ноччу запальвалі ёлку,
І адбіткі агню зіхацелі на шкле,
Сёння толькі крані — асыпаюцца голкі:
Год памкнуў у нябыт на стамлёным крыле.

СТАНСЫ АСЕННІЯ

Усцешан сад астатняй ружай,
Што так наўздзіўна расцвіла,
Хоць засталося ўжо нядужа
Пяшчот праменных і цяпла.

На сцебліне́ сваёй высокай
Яна і гэты квеціць дзень,
Калі мы ў ростань робім крокі,
Хоць шляхам не адным ідзем.

Ты ад зацятасці нязгаслай
Імкнеш па шорсткіх дзірванах,
Па стромых самалётных трасах,
А я ўнізе́ стаю адна.

Што можаш ты давесці небу,
За срэбным сочачы крылом?
Яму той споведзі не трэба,
Каб толькі ў вушы не гуло.

Ды зверху ўсё як на далоні,
Хоць робіцца зусім малым,
І ў воблаках часамі тоне:
Пылок ад ружы альбо дым.

А я, не хочучы абма́ліць
Таго, чым дыхаю здаўна,
Што сэрца смутным шчасцем паліць,
Не маючы другіх адзнак,

Я не ўзыходжу на пагоркі,
Узброіўшы пагардай зрок,

Не забіваю трункам горкім
Кахання позняга знарок.

Яно ж як ружа ў гэтым садзе,
Што так наўздзіўна расцвіла,
Хоць не ўзгадована ў спагадзе
І вобмаль ёй было цяпла.

СЁННЯ РАНІЦА БЕЛАЯ...

Сёння раніца белая, снег падцярушан,
Ноч так мякка ступала на пухкі дыван,
Каб яшчэ хоць на дзень гэтай цішы не рушыць,
Гэтай белай апоны з душы не зрываць.

За акном ціхі сад белы кужаль гайдае,
Ліхтары на відне жоўтым вокам мігцяць:
Часам раніца іх пагасіць забывае,
І яны быццам водбліск начнога жыцця.

Дай руку мне. У замеці гэтай нязвычнай,
У павевах запозненай сцюжнай вясны
Я хачу хоць драбок таго шчасця пазычыць,
Што ўсе трыццаць гадоў абяцалі мне сны.

КАРА

Ты караеш мяне за усмешку вясёлую,
За праменны агонь у вачах,
За маё пачуццё, і магутнае й кволае,
За утому на вузкіх плячах.

Ты караеш мяне самай лютаю караю
І гаворыш, што гэта любоў.
Без цябе мне ўвесь свет — з папялішча
выгарына,
І таму ты не едзеш дамоў.

5 Зак. 2074

Я ГЭТЫ ЛЁС ПРЫМУ

Расстанне доўгае у нас,
Радок мой занядбаны,
Баюся я цябе кранаць,
Бо абзавуцца раны.

І, можа, нават не таму,
Што сэрца сніць смяротна,
А што я гэты лёс прыму
Назаўжды, беззваротна.

Раўнавага́ і цішыня
У цёмным цёплым лесе...
А то ж струмені забрыняць —
І вецер вымкне весні.

Дзе ж я тады падзену ўсё,
Што сцішыла, зглушыла,
Ахутала шчытным крыссём,
Як дзёранам магілу?

Ці гэта толькі ўпаў прамень
На маладосці крокі?
Твой прамільгнуў употай цень
І кінуў хітрым вокам:

Жывеш яшчэ, марнуеш лёс,
Не падняла і сына.
Пачуццяў ператлелых стос
Павыкідай са скрынак.

Ты адраклася, ты й цярпі —
Астатні раз я клічу.
Спрабуй яшчэ раз слова піць,
Прамый віднюм аблічча!

СЯСТРА

Як быццам воблака спыніла
Задымлены свой кругабег,
І ноч той цуд у снах стаіла,
А золак расказаў табе.

Ты несла: дзіва ў кожным воку,
Бярэма бэзу на руках,
І ўсе дзівіліся навокал —
Якога ж князя сустракаць?

Усе дзівіліся, і кожны,
Не усвядоміўшы чаму,
Хацеў асцерагчы трывожна:
«Не аддавай абы-каму!»

НА БАЛТЫЦЫ

1

Мора сёння ласкавае, чыстае, яснае,
І бурштыну кавалкі блішчаць на пяску,
А душу маю точыць ды точыць нязгасная
Крыўда-мачыха — ёй не трапляй пад руку.

Ціха плешчацца хваля — а цёплая з берага! —
Закалыхвае гэты някліка80 боль.
Не паеду адсюль я ні заўтра, ні ў сераду,
Застануся пры моры, сам-насам з сабой.

Зрэшты, трэба ж пачуць мне з глыбіняў
суцішаных,
Утаймаваных позіркам сініх нябёс,
Што сапраўднае ў сэрцы і што ў ім калішняе
І чаму гэты боль нечакана падрос.

Ёсць жа межы ды часу падмога вялікая,
Калі гэтак душа знебылася ў бядзе,
Значыць ты на ратунак нічога не клікала,
Не ішла прыхінуцца да людскіх людзей.

Дно, як дзюны пясчаныя,— ляж і спачні на іх,
Воблак сонца ад спёкі спагадна замгліць.
Ты, здаецца, няторнай брыдзеш пуцявінаю,
А чаму ж гэта крыўда так моцна баліць.

Так, у шэпце ласкавым мой боль закалыхвала
Хваля нейкай нязнанай дасюль цеплыні,
І я ў гэтай спагадзе так радасна дыхала
На высокім, на белым яе грабяні.

2

Тут мусіць шчасце гнездавацца
У гэтых доміках ахайных,
Тут радасна ў красу прыбрацца
Дзяўчатам мілым на выданні.

Тут бэзу белыя наквецці
На роснай свежай зеляніне,
І травы ў росце, дрэвы ў цвеце
Вакол утульнае хаціны.

А за прысадамі густымі
Не ціхне, не змаўкае мора,—
Яно заўсёды на уздыме,
Бунтарскай моваю гаворыць.

І гэты ўзор спрадвечнай буры,
Вятроў, трывогі і шуканняў
Ратуе сэрцы і падмуркі
Ад плесені і занядбання.

ДУША

Каб хоць здалёк, хоць на хвіліну
У душы людзям зазірнуць,
Напластаванні змату скінуць
І зіркам змерыць глыбіню.

Хіба ты, чалавеча, знаеш,
На што прыдасца поступ твой,
Якую радасць ты мінаеш,
Якой пакуты п'еш пітво?

Сягоння розум твой і сэрца
Спагадзе служаць і дабру,
А заўтра, можа, на паверцы
Ты не падымеш дбайных рук.

Бо раптам з цёмных нетраў мора
Узыдзе цьмяны дзень нягод,—
Нясе нялюдскую ён змору,
Як быццам валачэ сто год.

Яна ў паветры бросню родзіць
І гасіць у душы агні:
Нуда — завуць яе ў народзе,
Яна, як пошасць,— не кані.

І вось ужо ў душы пустэча,
Пачуцці, думкі — дробны мак,
Такая страшная галеча,
Што нават і тугі няма.

Рахункі, дробныя разлікі,
Улік выгод пад сонцам тым,
Што рост дало для душ вялікіх,
Каб пахаваліся краты.

І дзень пры дні драбнота точыць
Тваю душу, маю душу...
І безудзельнасць засціць вочы,
А я ў іх цэлы свет нашу.

Крый божа, прыжывецца немач,
Упадабае ціхі кут
І разгадуецца на семя,
Як пышны, ды атрутны куст.

Карчуй яго, пакуль не позна,
І з дымам, з попелам знішчай,
Марозам лютым вымарожвай,
Сячы сякераю з пляча!

Хай зноў душа твая і розум
Спагадзе служаць і дабру:
Мы ўсе яшчэ ў такой дарозе,
Дзе не складаюць дбайных рук.

У ПАДАРОЖЖЫ

Хто жыў тут у гэтым пакойчыку мілым,
Дзе мушу і я нейкі час бытаваць?
У вокны ўглядаецца ясень пахілы,
І водарыць першага ўкосу трава.

Ці тут засталася якая нагадка:
Дыханне тугі ці адбітак святла,
Ці брала натхненне у рукі асадку
З пісьмовага, збітага моцна стала?

Ды хто б тут ні жыў у часовым прыстанні,
З усім сваім скарбам пачуццяў і мар,
Ён помніць і ясень, і зор узгаранне,
Увесь свой спачын ці гарачы прыпар.

І я прыгадаю, пайшоўшы адгэтуль,
Свой сум, што апалі сузор'і півонь,
І быццам з далёкім сяброўскім прыветам
Мне хтосьці сардэчна пацісне далонь.

ЗАЛЕВА

Запарушыў мне вочы вецер
Перад навалаю ліхой
Атрускамі і дробным смеццем,
Што паўзлятала над страхой.

І я, сляпая, йшла па садзе,
Не бачачы яго красы,
А лісце шастала ў спагадзе
Пад дождж ыкам, яшчэ касым.

У вострым, у раптоўным болю
Я нахіліла галаву...
І раптам цёплаю патоляй
Залева ўпала на траву,

На сад, на кветкі, на мяне ўсю —
Ад белай хусткі і да ног.
Мой зірк адразу прасвятлеўся,
І боль нібы з травою злёг.

Лаўлю я ўдзячнымі вачыма
Тых кропляў чыстых буйны град.
Сляпой бы я жыла, магчыма,
Калі б не гэты вадаспад.

НА ПЕРАВАЛЕ

Памерці тут, у харастве,
У хмельным водары вясновым,
Каб закружыла ў галаве
Астатнім вершаваным словам.

Астатні раз у вочы зор
Зірнуць у шчасці невыказным,
Спытаць, ці будзе вецер з гор,
І не пачуць ужо адказу.

АСТРЫ

На выстаўцы кветак асенніх
Купілі мы астраў ружовых,
І ў дом наплылі летуценні,
Што з фарбаю гэтай у змове.

У памяці сэрца не гіне
Нічога з вясновага лёсу:
Ні ружы ў сухумскай даліне,
Ні мора ўсхвалёваны плёскат.

Ды толькі былі мы няўмекі,
Што так абышліся са шчасцем:
Маглі б залучыць і навекі
Марскою трывалаю снасцю.

На выстаўцы кветак асенніх
Купілі мы астраў ружовых,
Іх жнівень цяплом апраменіў
І пахам апырскаў мядовым.

Каб тут, у маленькім пакоі,
Яны прамаўлялі, як песня,
Жывой і трывожнай тугою
Па тым, што ты сніў, ды не здзейсніў.

МОРА
І СЭРЦА

Шуміць яно зноў, неўтаймоўнае мора,
За дрэвамі сінімі ў сіняй імгле.
Здаецца, і мне яно штосьці гаворыць:
Дакор ці вітанне спагаднае шле.

Яно, неабсяжнае, ўсё разумее,
Высока ўздымаючы хваль грабяні,
Ды я расказаць яму, мабыць, не ўмею:
Ніяк не ўгадаю хвілін цішыні.

І раптам у гэтай нямоўчнай трывозе
Сваё чую сэрца, яго неспакой.
Калі ж яно ціхне на час у знямозе,—
Змаўкае і мора, сціхае прыбой.

НЕ БОЙСЯ ГЭТАГА ПАВЕВУ...

І ў шчасці смуткам ціхім вее,
Бо хіліцца ў змяркание дзень,
А ты ўтрымаць яго не ўмееш
Ні на зямлі, ні на вадзе.

Не бойся гэтага павеву —
Ён неадлучны ад жыцця,
Пад ім так хмельна пахнуць дрэвы
І кроны нежна шалясцяць.

НАШТО ТЫ ПАЕХАЛА...

Нашто ты паехала з гэтага краю,
Дзе позняцца бэз і язмін расцвітаць,
Дзе буйныя зоры і мора без краю,
Дзе ты ніадкуль не чакала ліста!

Абы толькі шчылінка ў воблаку сівым,
Там сонца праб'ецца і кліча — жыві!
Жыві ды збірай кожны промень руплівa,
І, каб не цураліся, шчасцем заві.

Нашто ты паехала з гэтага краю,
Дзе ў парастку кожным натхненне жыло,
Дзе вецер, як хустку, твой смутак зрывае,
Дзе чайка цябе ахінае крылом.

. . . .

Ці рушыш ізноў, сапраўды, можа, вернешся,
Каб мора знянацку ласкавым заспець,
Прабегчы па сцежках задумнага верасня,
Услухацца ў песні асенняй распеў!

ІЗНОЎ НА ВЕТРЫ

Закурым, вецер, не дурыся!
Дай угарэцца аганьку,
Са мною лепей не сварыся,
Наладзім мірны перакур.

Ды, можа, зрэшты, дойдзем згоды.
Ты ўпарта закідаеш зноў,
Што я зракаюся свабоды,
Яе змяніўшы на любоў.

Што б ты зрабіў, мой друг натхнёны,
Бадзяга вечны і пясняр,
Каб сэрца гэткаму прыгону
Прынёс, як самы танны дар?

Не знаючы, чаго ёнварты,
І не чакаючы падзяк...
Так кожны перад першым стартам
Свайму дыханню не суддзя.

ДОЛЯ ГАСПАДЫНІ

На свеце няма ніводнага сэрца,
што білася б для мяне.

Эльза Трыале

— Нялюдская доля твая, гаспадыня,
На шумным застоллі ты воч не надымеш.
Ні жонка, ні маці, ні мачыха, зрэшты.
Якую ж у хаце тут вахту нясеш ты?
Ці ёсць жа хоць слова дабра і спагады,
Ці толькі на мове гавораць пагарды?
Ці ёсць жа хоць кут для сяброўкі-самоты,
Ці толькі радку ты пажалішся ўпотай?

— Хапае ўсяго мне, ты сэрца не кратай.
Пакуль не прагоняць, вартую я хату.

БУДЗЬ НЕНАТОЛЬНЫМ!

Будзь ненатольным, маё сэрца,
Галодным, прагным да красы,
Бо горш ад самай лютай смерці
Табе спакой і перасыт.

Раскашаванне на застоллях
Мядовым трункам дзень пры дні,
Душы атрутная няволя
Пры чадным ды чужым агні.

Выходзь на межы залатыя
Налітых зернем каласоў,
На горы вымыкай крутыя,
У нетры баравых лясоў.

На возеры гайдайся ціха,
За ўзлётам чайкі прасачы,
Раптоўным нараджэннем віхра
У срэбнай месячнай начы.

Хай шчасцем тым, што не зазнана
І не прыкмечана раней,
Як хваляй бурнай з акіяна,
Тваё прыстанне скалане.

Ты выйдзеш у сваё дасвецце
Пад ружаваты далягляд,
І ўсё табе ўсміхнецца ў свеце,
Чым ён для прагных душ багат.

НОРД-ОСТ

Мы верыць не прывыклі ў лёс,
Што сёння раптам нас узнёс,
А заўтра плазам распасцёр,
Навек скалечыўшы жыццё.

Мы самі свой тварылі свет,
За шчасцем імкнучыся ўслед,
А часам, схібіўшы няўзнак,
Шукалі позіркам стырна.

Ды вось прыходзіць насланнё,
І ўсё быццё ідзе агнём.

Дык што тут: доля, фатум, лёс?
Адкуль той боль, па чым узрос
І што прынадзіла яго
У змрокі вечара майго?

Ішла я сцежкаю наўпрост,
Не абмінаючы пагроз,
Не баючыся цёмных хмар,
Не муляў мне і мой цяжар.

Калі ж ты вызвалішся з пут
Някліканых цяжкіх пакут,
Людская спеўная душа?

Бязмежны хвалісты абшар...

ГАНУЛЬЧЫНЫ ВОЧКІ

Дзяўчынка лічыла ганульчыны вочкі
І з бояззю пальчыкам кратала іх:
А хто яго ведае, можа быць, сочаць
Ці мама, ці тата, а то і ўдваіх.

На кветні ж было намалёвана столькі,
Што й бабка не ўмела пра ўсё расказаць:
У гэтых стракатых вясёлых крамзолях
Прыходзіла з казкі каза-дзераза.

Жар-птушка ў жоўтых, як сонца, пялёстках,
У колерах зыркага летняга дня,
І коцік у ботах, у белай матросцы,
І морда агністага, ў цуглях, каня.

Чырвоная Шапачка з кошыкам зграбным,
Галоўка у кудзерах, вочкі — блакіт,
А вось і трохмачтавы сіні караблік,
Няма толькі мора, ні нават ракі.

А гэта ж бабуля, як смешна, напраўду!
Вось бабчына хустка — у краткі паркаль...
І кветачку тую з ласкавай спагадай
Прыгладзіла злёгку дзяўчынкі рука.

А казка ўсё шырыцца — вось і дыван той,
Пярэсты і мяккі дыван-самалёт...
І раптам пад белым распушаным бантам
Галоўка схілілася — столькі дзіўнот!

Заснула дзяўчынка на кветні духмянай,
А казка працягвае дзіўны развой:
Сыходзіць красуня з высокага ганка
І нежна заносіць дачушку ў пакой.

ЯБЛЫНЯ

Сярод ялін вечназялёных
Ды хвой выносістых, да зор,
Ва ўтуллі, шатамі прымглёным,
Узгадаваў суровы бор

Галінку яблынькі ружовай
На гнуткім маладым ствале:
То вецер, вымкнуўшы з дамовак,
Укінуў семя ў цёплы след.

Яна ўжо набірала сілу
У цесным коле баравым,
Але зіма яе скасіла,
Здавалася, насмерць, зусім.

Тады з жальбою неадольнай
Яліны гойдалі над ёй
Завеянае ў шэрань голле
І гора гушкалі сваё.

І толькі горкім напамінам
Тае наўздзіўнае красы
Звінела гнуткая сцябліна
Блішчынкай ледзяной расы.

Ды вымкнуў зноў цяплейшы вецер,
З дамовак пах прынёс жытла,
У лесе скалануўшы вецце
І снежнай намеці палац.

А яблынька. Хоць нерухома
Стаяла кволае сцябло,
Ды ў ім пад цёплы лесу гоман
Спявацца нешта пачало.

Нібыта кроў пайшла па жылах,
Пупышкі набухалі ўслед,
Ужо на золку спеўнай сілай
Павыганяла іх на свет.

А там пайшло. Яліны прагна
Сачылі гэты буйны рост:
Як наквець набірала брагу
З усіх лясных духмяных рос.

І зразумеў той бор суровы,
Зноў дачакаўшыся красы:
Яна жыла і ў сне зімовым
І чула лесу галасы.

Хваіна ў шапцы, век зялёнай,
Цябе мароз не прытаміў,
А паспрабуй пабыць ты клёнам,
Бярозы белай лёс прымі.

ВЕСНАВАЯ ВАДА

Пасля спусташэння, руін, бездарожжа
Як хутка, на крылах, крыяе душа:
Патайныя скарбы збірае і множыць
І ў парасткі гоніць хмялісты пяршак.

Адкуль гэта сіла, што здужвае рэзрух?
Пакуль свецяць вочы, трываць і трываць,
Паўзці на нагах, на руках, на пратэзах
Прарошчваць зярняты — і сеяць, і жаць.

Вось тут кагадзе ў неправідным адчаі
Зракалася сэрца жыцця і красы,
А зараз на веру аберуч прымае
Усіх абяцанняў жывых галасы.

Не чуецца ў іх ні гаркоты, ні суму,
Ні той засцярогі, што родзіць бяда:
Маленства вясёлага радасным тлумам
Цурчыць, як заўжды, веснавая вада.

Душа спасцігае гадзін незваротнасць
Для думкі, для шчасця, для песні тваёй,
Дарэшты жыццё вымагае на ўзлёты,
На ясны, на дужы, на плённы развой.

Каб тая жывая крынічная сіла,
Што заўжды натхняла і сеяць, і жаць,
У час, як не вернешся з ціхіх развілак,
На справы твае не стаўляла крыжа.

СОНЦА

Ад навагодняга цяпла,
Ад студзеньскага грому
Зіма злавацца пачала
У вокны грукаць дома.

Так зацялася на вясну,
Так сыпанула снегам,
Што неабудна лес заснуў
Пад хвойны спеў-кунегу.

Але тым часам сакавік
Пастукаў ціха ў браму,
Як кожны год ён стукаць звык:
Не позна і не рана.

Ды зачапіў яго мароз
За сэрца, за жывое.
І нават снегу не абтрос
Ён з веснавога строю.

Пакіраваўся шпарка ўдаль
У стане невясёлым,
Адтуль, нябачаны амаль,
Падаў маркотны голас:

«Супроць зацятае зімы
Надзейны ёсць ратунак:
Пярун хай толькі прагрыміць,
І будзе ёй ушчунак».

А мы выгуквалі ў адказ,
Што перуны не тыя:
У іх грымот паблытан час
І вёсны залатыя.

Цяпер грыміць пад Новы год
На здзек зіме вясёлай.
Здзіўлёна слухае народ
У снежні весні голас.

Відаць, не чуў ён, сакавік,
Аб навагоднім громе,
Што твар зіме перакрывіў
На сцюжным пераломе.

Затым і лютуе яна,
Што не сваю часіну
Займаць памкнулася вясна
З неперaward:неперраможнай мінай.

І засмяяўся весні госць
З праменных далячыняў:
«А сонца, ваша ягамосць? —
Яго вы не ўлічылі?»

Яно пагодзіць спрэчкі ўсе
На ганачку памытым,
Дзе сеў прамень і хлопчык сеў
Без шапкі і без світы.

І поплеч седзячы удвух
Ў гульні святла бясконцай,
Яны увасабляюць рух
Зямлі навокал сонца.

Яна ўжо горнецца к цяплу
Захаладзелым целам,
Ёй белай наледзі кару
Скідаць пара прыспела.

САДЫ ЗАЦВІЛІ
Ў БЕЛАРУСІ

Сады зацвілі на світанні
Працягам дзявочага сну,
Дзе песню складае каханне,
Каб сэрца чыёсь скалануць.

Галіна сплялася з галінай
Пад промневы дождж залаты,
Нідзе не асочыш лісціны
За беллю пялёсткаў густых.

Знямела дзіця ў захапленні,
Памкнулася ручкай дастаць,
Ды сад у ласкавым шасценні
На вушка шапнуў: «Не чапаць»...

Духмянае веснае шчасце,
Дарунак квяцістай зямлі!
Так хочацца тварам прыпасці,
Каб вусны той водар пілі.

Каб вочы у зрэнках схавалі
Пахучага кіпню красу,
Каб плёну таго прычакалі,
Што наквеці шчодра нясуць.

ЛЮБОЎ

Вяселля срэбнага бакалы
Ужо звінелі за сталом,
Ужо на гэтым перавале
Нам скроні добра замяло.

Таежным снегам завірушным
Прыцерусіла і чало,
Ды не крапула, пэўна, душы,
Што так на смутак павяло.

А кім ёп клікапы на сёння,
На вечар ціхі, на мароз,—
Той сум трывогі, сум бяссоння —
Лісток з аснежапых бяроз.

Як насланнё ліхое,— ростань
Зноў завітала на парог,
А іх было бадай удосталь
На двух, а можа, і на трох.

Варожы вырыс адзіноты,
Што з кожным днём усё сквапней,
Наўсторч ідзе, ужо не ўпотай
Кіруючыся да мяне.

А сэрца поўніцца такою
Любоўю даўняй і сівої,
Вякі пе ведаўшы спакою
І ў шчасці і ў бядзе сваёй.

Хай ты пе зпаеш, дзе пачатак
Яе вытокаў і крыніц,
Жабрак ты з ёю ці багаты —
Япа пусціла карані.

ПРАЗ ГОД

І той жа лес, і тыя ж зоры,
І лапы белыя ялін,
І тая ж ціхая пакора
Глухой заснежанай зямлі.

І нават жоўтая сініца,
Што летась стукала ў акно,
Між голля гэтак жа мігціцца,
Як птах з кітайскага пано.

Аднак усё нібы не тое —
Душа не ў ладзе з хараством
Зачараванага спакою,
Дзе праз яліны свеціць дом.

Гарыць ён вокнамі здалёку,
На снег кідаючы святло,
А навакол, як кінуць вокам,
Ўсё, што любіла я малой:

Заечых лапак след імклівы,
Вавёркі рыжай мітусня.
Заплюшчу вочы — і шчаслівай
Я чуюся на схіле дня.

Ды гэта ж з тых, неверагодных
Часоў дзіцячага быцця,
Калі пад ёлкай навагодняй
Лясное казкі быў працяг.

ЯЗМІН АСЫПАЕЦЦА...

Язмін асыпаецца замеццю белай
На вузкія вуліцы Рыгі старой.
Раптоўнаю крыўдай душа засмылела,
Што я тут адна, а не разам з табой.

Ужо даўнавата не ходзім мы разам,
З самотай спазнаўшыся ў хмарныя дні:
Не ўмелі над хмарай узняцца адразу,
Каб там, на вышынях, пагоду змяніць.

Аблокі, аблокі... О, як жа нялёгка
Прабіць іх гарачым праменным лязом!
За гэтай ватоўкаю шэрай і вохкай
Не ўбачыш ні сонца, ні радасных зор.

Язмін асыпаецца замеццю белай
На вузкія вуліцы Рыгі старой.
У садзе на лаўцы я збоку прысела,
Бо тут наўкруга галубовы прыбой.

Крышу ім салодкія крохкія вафлі,
А хлопчык уважліва сочыць за мной,
Ці я здагадацца нарэшце патраплю,
Што ён з галубамі пароды адной.

А ўзяўшы аберуч пахучы ласунак,
Ён есці спяшаецца, як верабей,
Што раптам нарваўся на добры частунак
І, ўкраўшы кавалачак, шпарка дзяўбе.

Вось так і сядзім мы тым гуртам у садзе,
А цвет абсыпаецца з белых кустоў.
Як крыўдна, што з намі ты поруч не сядзеш,
Мінуўшы за плошчай гарбаты масток.

РАНІЦА

Самота мілая, сыходзь
З пагорка весняе раскошы,
Я выбіраюся ў паход,
Дзе ўсё жыве, дзе луг не кошан.

На берагі лясных азёр,
У ноч ласкавае спагады.
Там у мігценні чыстых зор
Душа ізноў зазнае радасць.

Я гэтых зор не сцерушу
Ні смуткам кволым, ні гаркотай
І больш радка не напішу
Ад сонца яснага употай.

Яму зірну я проста ў твар,
Найменшай хмаркай не замглёны,
І ў гэты радасны пажар
Укіну ўсіх часоў прыгоны.

Не аглядаючы шляхоў,
Таптаных з болем ці з усмешкай,
І я ў вясновы свой паход
Той самай мілай рушу сцежкай.

На ёй і песні адгалос,
І ягад першых смак гаркавы,
І мой жаночы дзіўны лёс
З любоўю злою, неласкавай.

З людзьмі мне трэба гаварыць,
Свет спасцігаючы паволі:
І безудзельнасць, і парыў,
І смагу шчасця, і паталю.

Усё даруючы за спеў,
За лад бруістае гаворкі,
За слова роднага нагрэў,
За гумар мужны, часам горкі.

І за бяседнае цяпло
Табе я здраджваю, самота.
Не ахінай мяне крылом —
Твае наперадзе турботы.

ХАЙ СПЛЫВЕ ТУГА

Ой, як цяжка разлучацца
З гэтым светам мілым,
З гэтым сонейкам гаючым,
Яварам пахілым.

З цёмнай ночкай, з ясным раннем,
Адвячоркам хмельным,
Залатым маім каханнем,
Шчасцем непадзельным.

Дык пакуль душа з крывёю,
З думкаю жывою,
Хай сплыве туга з вадою,
Бурнай, веснавою.

Каб у зрэнках адбілася
Уся краса свету
І на сіняй поўні мора
Ружаваты ветразь.

ЯШЧЭ НЕ ЗАЦВІТАЛІ ЛІПЫ...

Яшчэ не зацвіталі ліпы,
А дзень прыгас на нейкі час,
Як гаснуць раптам гукі скрыпак,
Калі пачуцці ўсе маўчаць.

Маўчаць не ў стоме анямення,
Не ў сумятні трывог і сноў,—
Яны маўчаць перад натхненнем,
Каб узляцець і жыць наноў.

Жыць у барвовых фарбах рання,
У ружах белых на стале,
У тым запозненым вітанні,
Што чайка несла на крыле.

У шуме хваль, у ветры прагным,
Што спадарожнічае мне
І поіць добрых вёрстаў брагай,
Каб сэрца акрыяла ў сне.

Яшчэ не зацвіталі ліпы,
А дзень прыгас. І ў ціхі час
У закліку далёкіх скрыпак
Твой родны голас прагучаў.

ЛЕС ЗАСЫНАЕ

Ізноў ты іншы, сіні бор мой!
Зусім адменнае красы,
Ужо не той, што быў учора,
Калі шасцелі верасы.

Яшчэ дыван твой спрэс зялёны
І тоіць мой няцяжкі след,
Але ў хваіны з добрай кронай
Як бы задума на чале.

Ты змоўк, нічога мне не кажаш,
Не абзавешся птушынай,
Воч павуціннем не завяжаш
І песні не складзеш са мной.

І я хаджу тут без усмешкі
З бярэмам восеньскіх турбот,
На ціхіх просеках і сцежках
Згубіўшы захад і ўсход.

Як заўжды ў лесе, я не знаю
Ні накірунку, ні мяжы,
Бо лісце, як гады, гартаю,
А сцежка недзе ўбок бяжыць.

Вядзе мяне ў глухія нетры,
Дзе засынае шчыры бор:
Сюды не маюць ходу ветры —
Ён пад аховай пільных зор.

ПАЭТУ

Не абмяжоўвай свет свой думны
Сядзібаю свае душы,
З яе уцехаю ды сумам
І нават прагай да вышынь.

Завінавацішся навечна
Перад радзімаю сваёй:
Ёй і твае патрэбны плечы
І ўвесь набытак сціплы твой.

Ўсе запаветныя задумы,
Усхваляванасць спеўных слоў,
І мова, зрошчаная з сумам —
Пячаткай даўніх кайданоў.

Твае натхненне і адданасць
Красе радзімага кутка,
І кожнай думкі беззаганнасць
Ў заганах рытму і радка.

Арбітай праўды найвялікшай,
Што людзі ведаюць у твар,
Ідзі і за сабою кліч іх,
Як клікаў у вяках пясняр.

ВЕТРАЗЬ

З майго акенца бачу ветразь
І белай чайкі дужы ўзлёт,
Фіранку надзімае ветрам
І выдзімае навылёт.

Уседзець цяжка мне ў пакоі,
Старонкі ру́дыя гартаць,
Калі зямля не ў тым настроі,
Каб кнігу даўнюю чытаць.

Яна разгортвае малюнак,
Што не відзён з майго акна.
Збірай жа самы лёгкі клунак
І ў падарожжа руш звідна.

Не аглядайся на прытулак,
Дзе вецер ходарам хадзіў:
Не дужа пэўная затула
І неспрыяльная наўздзіў.

Цяпер ты бачыш: гэты ветразь
Так блізка, як кранудь рукой.
Ён сонцам ліпеньскім прагрэты
З абодвух трапяткіх бакоў.

Яго пагойдвае ласкава
Лілова-сіняя Дзвіна,
Ці прыбалтыйская Даўгава —
Яна мне ўся цяпер відна.

ЗГАСАННЕ

У жыцці тваім раніц ці мала бывала,
Калі сонца цябе на агледзіны звала
Неабсяжнага зіркам праменнага свету
На зямлі гэтай цёплай у травах, у кветках.

І цябе падымала шчаслівая сіла,
Што красу тую ў велічы рупнай расціла.

І за светлыя ранкі, што дзень абуджалі,
Што прадчуццем высокае радасці ззялі,
Гэты вечар без скаргі жыццю я дарую,
Калі скарга складзецца, спяваць не магу я.

Сёння вечар бясфарбны, пад воблакам хіжым,
Быццам псіна калматы, шрамы свае ліжа.

ЦІХІ АДВЯЧОРАК

Ціхі адвячорак,
Утаймуй душу мне,
Каб не стаць пячорнай
Ёй у гэтым тлуме.

То яна люцее,
Сківіцы заціяўшы,
То гарыць надзеяй,
Немаўлёнкам стаўшы.

А яшчэ бывае:
Патанае ў смутках
Без мяжы, без краю
На ўвесь дзень цалюткі.

І замест спачыну
Ў залатым прымор'і
Новую пуціну
Цераз пушчу торыць.

Сіні адвячорак
Са смугой асенняй,
Дай ты ёй хоць зморы
З лёгкім сном у сене.

ПЕЦЯРБУРГ

Ішоў народ, як у выгнанне,
На подзвіг-катаргу ішлі:
Рабіць у холадзе, ў тумане,
Згінаючыся да зямлі.
На золках прывідных і цьмяных
Яны будзілі далячынь
Размахам працы нечуванай,
Непараўнанае ні з чым.
Абрыс суровых збудаванняў
З туману пакрысе ўставаў,
Адбіўшы ўсе выпрабаванні,
Што дойлід тут ператрываў.
Бо дзень пры дні ўсю мужнасць продка
І плёны спрацаваных рук
Змывала хіжая паводка,
Не прысягаючы цару.
Гарматны стрэл з мастковых паляў
Спачын чаканы спавяшчаў,
І дойлід у іржавай хвалі
Акраец хлеба свой мачаў.
Неверагодны, немагчымы,
Нібыта казачны міраж,
Назвалі горад царскім імем,
Як немцы клікалі цара.
Тады, распростваючы плечы
У прапацелых рызманах,
Суровых дойлідаў галеча
Па кубку выпіла віна.
І ўпершыню падняўшы вочы
На гмахі залатых званіц,
Перахрысціліся уроча,
Каб падлілі яшчэ ў збаны.

НЕ АДЫХОДЗЬСЯ...

Не адыходзься так далёка,
Мая заўсёдная туга,
Не загубіся ж у аблоках,
Не застудзіся ж у снягах!

Хоць сэрца кроіш на кавалкі
Агнём пакуты і любві,
Ды без твае жывой навалы
Яно не хоча гнаць крыві.

Яно не рдзее і не жывіць
Заўжды няўтольнае душы,
Што дзень пры дні чакае дзіва
З нагрэтых промнямі вяршынь.

У ПОЯСЕ ВЯСНЫ СУРОВАЙ

Так заўжды прагнуць пачуцця,
Пазнаючы яго бясхібна,
Як маці пазнае дзіця
Праз ростані глухія скібы.

Так прадчуваць яго ва ўсім,
Драбніцу кожную аслухваць,
Каб як агню не прыгасіць
Пустой будзённай пацярухай.

Ад безудзельнасці людской
Навослеп крочыць у нягоду,
Да вуснаў тулячы рукой
Яго дыхання чысты водар.

І зноў насустрач ідучы
У навальнічную аблогу,
Не засланяючы нічым
Ні сэрца, ні жыцця самога.

І жыць без гэтага цяпла
У поясе вясны суровай,
Дзе і пралеска не цвіла
Пад шаранам сухога слова.

У КВАТЭРЫ ПУШКІНА

«Няма на гэтым свеце шчасця,
Ёсць толькі воля ды спакой».
Так светла пра свае напасці
Гаворыш сёння ты са мной.

Мінула болей як стагоддзе,
І вось у гэты зольны дзень
Схіляюся ў маўклівай згодзе,
Не знаючы, куды падзець

Сляпы, слязой замглёны позірк
Тут у нярадасным жытле,
Куды цябе Данзас адвозіў
І дзе ляжаў ты на стале...

Астатняе тваё прыстанне,
Халодны змрочны кабінет.
Адсюль на Біранавы стайні
Прымушан быў глядзець паэт.

СЛОВА

У радасці цябе не клічу,
Не ахінаеш ты крылом:
З другімі ўсе хвіліны лічыш
Між золкам і шчаслівым сном.

А на мяжы таго адчаю,
Калі ні променю ў душы,
Як збаўцу, я цябе страчаю,
І ты загадваеш: пішы!

Пішы, каб прадыхнуць, каб дыхаць,
Каб заўтры дзень яшчэ заспець,
Каб знаць, што гэты боль аціхне,
Каб новаму пад сэрцам спець...

БУДЗЬ ТОЛЬКІ САБОЮ...

Будзь толькі сабою, кіруйся спагадай,
Усё зразумей, даравоць не спяшайся.
Ці прыйдзе яна, ці міне цябе радасць —
Рабі па сумленню, з душой не спрачайся.

Будзь толькі сабою... Шануй сваю неруш.
Не змыць і не збыць тае плямы праклятай,
Як сэрца чужым, чужародным застрэміш —
Ў вачах адлюструецца толькі зацятасць.

Насупар сабе, сваййму сэрцу жывому,
Не руш напралом у тузе, у адчаі.
Аціхне хай боль, ахіне цябе стома,
А там, можа, й зоры ізноў запалаюць...

НОВЫ ГОД

Гэты год я страчаю між белых ялін,
Кагадзе ад хваробы ліхой акрыяўшы.
За руку мяне сны сюды доўга вялі,
Але міма ішла я, усё занядбаўшы.

А вось зараз зачэрпаю з поўні красы,
З акіяна, што небам высокім завецца.
На зямлі ужо клічуць усе галасы,
Ўсе, яшчэ незазнаныя, сцежкі на свеце.

Не натоліцца сэрца зімы хараством:
Шаты шэрані студзень гасцінна развесіў,
Не нап'ецца удосталь жывічным пітвом,
Што мароз выціскае з хваінак на ўзлессі.

Аціхае душа ў баравой цішыні,
У некранутай велічы белага вецця.
Новы год запаліў нам жывыя агні,
Што апоўначы ўспыхнуць на цэлай планеце.

Ціхі вецер сцярушвае снежны пылок,
Дзяцел хвою дзяўбе у рытмічных паўторах.
І кунежная свежасць кранула чало,
Быццам блізка дыхнула Балтыйскае мора.

І нібыта наноў пачынаю я жыць
І жыццё паўстае ў нечапанай уяве.
Някім полыскам зыркім у сэрцы імжыць —
Што ні ўбачу навокала ў снежнай аправе.

І, нібы ўпершыню, зазнаю я усмак,
Як ласкава да рук прыхінаецца слова,
Як да людскага слова хінуся сама,
Як душа абазвацца ўсім лепшым гатова.

Як мне дорага зараз усё на зямлі,
Што да цвету, да росту ідэй і сумлення:
Сёння вымпел на месяц мы смела ўзнялі,
Заўтра самі падняцца туды летуценім.

Я — сучасніца нашых вячыстых падзей —
Удыхаю паветра вяршынь незамглёных.
Лепш, чым дома, не можа быць сэрцу нідзе.
З Новым годам, краіна мая, з новым плёнам!

КРЫНІЦА

Каменнем, глінай ды жарствою
Забіўся твой бруісты рот,
Які вадою ледзяною
Усе збанкі ўганяў у пот.

У смазе вусны прыпадалі
Да палыскоўнага пітва,
Што люстравала неба далеч
І дзеўчыны ружовы твар.

Ішлі гады. Вада маўчала
Глыбока ў кінутым лагве.
Вясёлы некалі прагалак
Не прыбіралі вёсны ў цвет.

Ды раптам, на малым адхоне,
Пры самым багнішчы іржы,
Струмень загаварыў спрасоння
І лёгкі пошчак закружыў.

Павеяла нязвыклым сумам
Ад скаргі здушаных гадоў.
І лес выслухваў песню-думу
З неакрыяўшых тых ладоў.

Але крыніца ўжо забіла
Халоднай чыстаю слязой,
Што праз гады яна таіла,
Струмень вастрыла, як лязо.

Каб ім прасвідраваць паволі
Каменне, гліну і пясок,
Каб вымкнуць, выбіцца на волю
З усёй вячыстаю красой.

Апырскаўшы траву навокал,
Крыніца ў сонцы паплыла
І, да маіх дабегшы крокаў,
У свет свой ціха павяла.

Ва ўладзе сціплага узору,
Прабіўшыся праз мжу і золь,
Патрушчыўшы каменне зморы,
Ідзе душа, імкне за ёй.

Кіруецца за светлай плынню,
Ужо люструючы ў вачах
І купал неба цёмна-сіні,
І адвячоркавы мой час.

ЗЯМЛЯ ГЛЯДЗІЦЬ...

Зямля з прыхільнасцю глядзіць
На спадарожніка малога:
Адно з тых нечуваных дзіў,
Што ўшчэнт прэстыж папсулі бога.

Яго зрабілі ў краі тым,
Куды часцей сягае сонца,
Дзе людзі розных моў — браты,
Зямлі сыны і абаронцы.

І хоць не зычыць ім дабра
Той-сёй за межамі братэрства,
Яны ўвесь свет ператвараць
Ўзяліся з розумам і сэрцам.

І гэты месячык малы
Арбіту торыць так заўзята,
Што варты ўсякае хвалы,
Як першы ў космасе наватар.

УСЁ ПРАСЦЕЙ...

Усё прасцей, чым свет уявы,
Што ўзгадавала ты ў душы,
Прасцей і здаравей па справе,
Ад караню і да вяршынь.

А гэты гафт — залішне тонкі,
Дарэмна вышываеш ты,
Бо і звычайная фальбонка
Быць можа мерай пекнаты.

Не ускладняй, не абцяжарвай
Таго, што родзіць ясны дзень:
Дождж праліецца з той жа хмары,
Што тут люструецца ў вадзе.

Усё прасцей, чым свет уявы,
Ускалыханы ў марных снах,
Усё жыццё, ва ўсіх праявах,
Дзе за зімою мкне вясна,

З сваёй красой непераможнай,
З настоем дум, з навалай сіл...
Усё прасцей, хоць і трывожней,
Чым кожны з нас сабе прасіў.

Не вымагай празрыстай сіні
Ад зааблочаных нябёс:
Там зоры губяцца ў ваціне,
Пакуль не вызарыць мароз.

Не патрабуй турбот надмерных
Ад сэрца, блізкага табе:
Яно ўсіх скіб не пераверне,
Груш не наспеліць на вярбе.

Не прыспяшай развою шчасця:
Яно дужэе дзень пры дні,
Дай час зіме кудзелю спрасці,
Каб зерне спала ў цеплыні.

Планета наша пасталела,—
Сівым стагоддзям не пазнаць,
Але ніколі не старэла
Зямнога шчасця цаліна.

ЗАГАДКА КРАСЫ

Дыяменты буйныя заззялі на снезе —
Награніла іх сонца на зорны узор.
Захацелася ўзяць іх малому гарэзе
Ды засыпаць за весніцы, ў ціхі свой двор.

Ён залез у сумёт, пагубляў рукавічкі:
Палыскуецца зорка, а схопіш — няма.
Іх жа мноства навокал, на пальцах не злічыш,
Дый у ручках халодных не можа ўтрымаць.

У дзіцячых вачах — і дакор, і здзіўленне:
Так блішчыць і чаруе, а ўзяць і не мар,
Уцякаюць па снезе з шаўковым шасценнем,
І смяецца з хлапца папрадуха-зіма.

Вось якая яна, гэта першая стрэча
З таямніцай спрадвечнай, загадкай красы:
Нейкі смутак мільгае у зірку хлапечым,
Нейкай думкі няўцямнай чуваць галасы.

З далячыняў павабных гучыць абяцанне
Гэту прагу красы праз гады наталіць.
І нязнаным узрушан хлапчук хваляваннем,
І маленькае сэрца паціху смыліць

Прадчуваннем трывог, велізарнай работы,
Што у рукі дае харaство ўсёй зямлі,
На якой ад любві, не ад лёгкіх залётаў
Выспявае і водарыць белы наліў,

Наліваецца колас і пчолы хмялеюць
На ліловых кілімах — лясных верасах,
Нараджаюцца зоры у цёплых завеях
І алмазам іграе на золку раса.

І, адразу за дзень пасталеўшы як быццам,
Хлопчык ціха ўзіраецца ў белую даль,
Дзе вялізнае сонца на ўзлессі садзіцца,
Выплаўляе са снегу ружовы крышталь.

НАТАША

Жоўты ліст. Пачатак восені,
Прамільгнуўшая краса,
Ранак ходзіць яшчэ босенькі,
Яшчэ цёплая раса.

Але з куста сум вітаецца,
Вокам хітрым сочыць след:
Лета бабіна вяртаецца,
Ды ўсё менш яго прыкмет.

Разгайдалася ваколіца,
Самалёт над ёй гудзе,
І маленькая свавольніца
Пачынае сіні дзень.

Абувае ножкі быстрыя,
Распагоджвае дамок,
Наравістая, іскрыстая,
Не ўхапіць — як вугалёк.

Наля, Таля, Ната, Натачка —
Усе дотыкі смычка,—
А для таткі будзе Татачка,
Як і Герцэна дачка.

Не забава дні жанчыніны —
Поступ лёгкі, лёс цяжкі...
А пакуль — збірай рабініны
І нізы з іх ланцужкі.

Надзявай на шыйку кволую,
На запясткі ручанят,
Маё сонейка вясёлае,
Ні дзяўчо, ні хлапчаня.

АСАМОТНЕНАЯ ПТУШКА

Асамотненая птушка,
Дзе бярэш ты моц на ўзлёт?
Недзе кінецца асушак,—
Падзяўбеш — і пад галлё.

Там сасніш, як у гняздзечку,
Вырай тых магутных крыл,
Што ўзняліся па-над рэчкай,
Дальні воблак іх укрыў.

Там магла быць твая доля,
Каб не верад на крыле,
Каб паменшала хоць болю,
Каб гаёк мой не згалеў.

Узляціш, а крыльцам — квола...
І далёка ж матчын дом,
Там чуцён быў мужны голас —
Піў ён песню ўсю нагбом.

ХАРАСТВО

Зіхціць рухавае святло
Праз хвоїнік кучаравы,
Нібы там штосьці расцвіло,
Як смолкі па атавах.

А каля ног звініць рака,
Плюскоча па каменні —
Тут цэлы свет для мастака,
А доўжыцца — імгненне.

Ды ўжо узрушана душа,
Красой зачаравана,—
Вятры ёй трэба суцішаць,
Лагодзіць ураганы.

І зноў, схіляючы пагляд
Перад чароўнай з'явай,—
Зялёны луг, праменны сад
Рабіць жыцця аправай.

Прырода родам з хараства,
Што падуладна часу,
Схмялеўшы ад яе пітва,
Ты да паўтору ласы.

Ды не паўторыцца вякі,
Што ўдарыла знянацку
У зрэнку сэрца напрасткі
І мусіць там застацца.

* * *

Са слоўнай нерушы, са сховішч
Нястрачанага пачуцця
Складзі па каліву аповесць
Свайго дзівачнага жыцця.

Як распраменіў золак першы
Табе ў прасторы сцежыну,
Калі і сны снавалі вершы,
Ледзь-ледзь кранаючы струну.

Свет асягаўся ў чыстай поўні,
У нераскіданым святле,
На тым, на самым тым узроўні,
Калі ўжо мара на крыле.

ТОЛЬКІ СНЕГ...

Такою завейнай мяцелічнай ноччу
Ізноў па завулках нязбытнага крочу,
Шукаю, шукаю... Няма таго дома,
З якога ішла я на вострыя стромы.

А быў жа... Ён быў... Там народжаны мукі,—
Яны і сыны мае зараз, і ўнукі.
І нават у рысах вясёлай дзяўчынкі
Нібы прадчуваюцца смутку сцяблінкі,
Абы толькі дрэвам не сталі адчаю,
Абы вачаняткі мае не крычалі...

А зараз, па кодэксе вёснаў няўрымсных,
Я зноў у чужыя ўглядаюся рысы,
Ды гэтай завейнай мяцелічнай ноччу
Адно толькі снег засыпае мне вочы.

ПАД СУЗОР'ЕМ ЛІРЫ

Дзве кволых кветкі на акне —
Асенняя даніна,—
Яна мяне ўжо не кране
Ніякім напамінам.

Лінялай фарбай, без душы,
Без водару і цвету,
Лепш акварэляў не пішы
І не штукуй санетаў.

Сышла пара ўсіх зыркіх фарб
З аціхшае прасторы,
Хай сэрца жывіць новы скарб,
Каб не скарыцца зморы.

Каб не зашыцца у бярлог
Да будучай адлегі,
А ў буру выйсці за парог
На пошук яркай Вегі.

Яна з сузор'я Ліры той,
Што і праз хмару свеціць,
Яна дадасць і ў песню тон,
Такі, што сціхне вецер.

Заслухаецца ночка ўся
Над возерам люстраным,
І рыбы спыніцца касяк,
Ад хмельнай песні п'яны.

Такой бы яснай цішыні
Хоць на адно стагоддзе,—
Мы б засвяцілі ўсе агні
Ды не сказалі б — годзе.

Там бы пачаўся той развой
І той уздым на стромы,
Каб чалавек самім сабой
Быў і ў гасцях і дома.

НОВАЯ ВЯСНА

Зноў надзея зелянее
Разам з дрэвам на вясне.
Веснавая асамблея,
Ці паклічаш ты мяне?

Расцвітае ўсё жывое
Без падмогі дбайных рук,
Першай кветкай агнявою,
Адратоўчаю травою,
Што для сэрца я збяру.

Горкі сродак сэрцаведаў
Гэта наквець на зямлі,
Дзе, як госць, ты паабедаў...
А вячэру?
Ці далі?

Густа-сінія нябёсы —
Не часовы — вечны дах...
Дзіўным бралася ты лёсам
У радзімы на вачах.

Не патрапіўшы у ласку,
Засталася на мяжы,
За якою па парнаску
Хтосьці песняй затужыў.

Веснавая асамблея,
Не забудзься пра мяне:
Сонца зрання палымнее
Скрозь, на тысячу ганей.

І ў зіхценні нестрыманым
Луг мой зноўку зацвіце:
На уцешныя паляны,
На вячэру кліч гасцей.

АДЗІНОТА

Самота — здрадная істота,
Калі не сцерпіць пустак дзень,
Яна падручыцца ў ахвоту
Папасвіць мары ў чарадзе.

І раскашуюцца на ўлонні
Твае спустошанай душы
Натоўп ілюзій, свет староннi,
Дрымоты, забыцця гашыш.

Распасцірае вечар крылы,
Агні ўзгараюцца між дрэў,
І мой радок бярэцца ў сілу
І ляда сэрцава арэ.

З МАЛЕНСТВА

Ці быў той час, калі ад шчасця
Смяяўся дзень пад брылем стрэх,
Калі так весела упасці
Было на коўзкі белы снег.

Калі смяяліся з нагоды,
А без яе бадай ямчэй.
Смяялася і ўся прырода,
Смех пырскаў з сонечных вачэй.

Калі расказвалі, бывала,
Аб нечым змрочным і смутны́м,
І раптам смех грымеў абвалам,—
Смяяліся, як дзікуны.

Ці быў той час?!

Я РАЗУМЕЮ

Яно прыходзіць — разуменне —
Сваёй парой, сваёй ігрой,
І, не збіраючы камення,
Не выкрываючы пяром,—
Нікога ты не вінавацііш
У спаконвечнай той патраце,
Што з песенькі гучыць старой...

Відно і цені, ў вечнай змене,
Шмат што хаваючы ад нас,
Раптоўна ў нейкай мізансцэне
Пакажуць сутнасць без акрас.
А разуменне, як сумленне:
Прымай яго ці прагані,
Яно таксама плён натхнення
І тыя ж лёсу карані...

Але журлівіцца і плача
Старое песенькі рэфрэн:
Каму і чым за боль аддзячыць? —
Сляпец урэшце добра бачыць,
Ды як састáрала Кармэн!

ТОЛЬКІ ДЗІЦЯ...

Трэцяй ці першай ступені апёк —
Сэрца гарыць, як у полымі сінім,
Што падымаецца аж да аблок.
Хто ў гэтым вінен — папроку не кінем.

Толькі дзіцячых вачэй зіхатня
Годзіць жыццё з небыццём і нямотай,
Толькі дзіцячыя ночкі не сняць
Ні ашуканства, ні здрады, ні квоты.

Гэта малая істота — узор,
Чым мусіш быць на зямлі, чалавеча:
Зорны твой век ці пазбаўлены зор,—
Сэрца сваё уратуй ад галечы.

Толькі дзіця — гэты сплаў пачуцця,
Ласкі, лагоды, бяззбройнай усмешкі,
Толькі яно спадзяванняў працяг,
Матчына песня пад роднаю стрэшкай.

У ЗІМОВЫМ БАРЫ...

У святле невыразным за шэрым акном
Разгайдала мяцеліца вецце.
У нязвыклай красе надыходзіла ноч
У малым гэтым, нашым, сусвеце.

Толькі празе душы не акрэсліш тых меж,
Што пазначаны вешкай ці дротам —
Мару мараю хіба калі дажанеш
У яе незлічоных палётах.

Ціхай музыкі хваля ўліваецца ў слых,
Хваля цёплая, нават жывая,—
Камячок цеплыні, як дзіцёнак малы,
Што за шыю цябе абдымае.

РОСНА

Какая бесконечная возможность
дана человеку страдать — и какая крошечная — наслаждаться.

Герцэн

Ні спаць, ні ўстаць — ізноў пісаць! —
А думцы мулка і журботна,
Буйная ў верасні раса,—
Дзень спрацаваны быў і потны.

Маўклівай восенню душы
Так абзываецца утома,
Як быццам сто палос шашы
З чужых краёў прайшла дадому.

Нераспраменена згло
Ішло маёю пуцявінай,
Калі ж усё такі цвіло,
Што расцвісці было павінна?

Дажджыстым летам, без нябёс,
Зазімкам сівым, як утрата,
Абы той парастак прарос —
Расплюшчыць краска вачаняты.

ДЗЯКУЙ

Цяпер мы часта кажам «дзякуй»,
Ліецца пахвалы рышток,
Так раскідаемся падзякай
І немаведама за што.

За тое, «што ты ёсць на свеце»,
Паэт цябе уславіць рад,
За тое, што ты робіш дзеці
І ў хаце з жонкай нібы лад.

За тое, што сумленне маеш.
Не крадзеш і не забіваеш,
Што недзе песню заспяваў,
А хтось заплакаў, не стрываў.

За ўсё падзяка і ухвала,
І прывыкаеш ты памалу
Чакаць яе, патрабаваць:
Лі, дождж, каб вырасла трава.

Не прычакаеце дажынак,
Згніе укос, счарнее лес,
Згалее добрая адрына.
І знікне дума на чале.



...Яшчэ магу рабіць я шмат —
Пашырыць нейчы далягляд,
Дзіця з благога скіраваць
На шлях дабра, на троп адваг.

Магу і кнігу напісаць,
Як сэрца ўмее ўсё трываць:
Яго расколеш, як арэх,
Яно ж растком зямлю арэ.

І хоць не тая ўжо ралля
І хлеба толькі да каляд,
Ды ёсць жа людзі на зямлі
І гнёзды птушак у галлі.



Я ўжо не з тых,
Што там плывуць, людзей...

Байран

Б'ецца ў сэрца злагоджаны даллю павеў,
Калыванне аслепленых шэранню дрэў.
На марозе стаю пад шырокім акном:
Нешта ломкае ў памяць ліецца з віднам.

Ці то радасці дотык, ці песня ў тузе,
Холад коўзкай вужакай па горле паўзе.
Каб да сэрцава сховішча не дапаўзла,
Трэба недзе пастукацца ў дом, да цяпла.

Ці з тае парушыны, што цьмяніць пагляд,
Азіраюцца вочы ў былое, назад.
Ці то зноў абзываюцца болем душы
Фэст юначых гадоў, пачуцця кірмашы.

А ці быў, ці зацвіў снамі сінімі фэст,
Ці не выспеў і ён, як зрудзелы агрэст,
Што ад сонца ўсю завязь сваю затаіў
І бурштынам гарачым плада не наліў.

Недзе сцеплела ўжо веснавая вада,
Што сплывала тады пад заснежаны дах,
Што выводзіла з дому, вяла за руку,
Проста ў шчасце кідала адну, на вірку...

Дзьме ў душу гэты з далечы дальняй павеў,
Калыванне аслепленых шэранню дрэў.
На марозе стаю, нізка зоры мігцяць,—
Яны моцна зіхцяць на астатак жыцця.

РАЗМОВА З СЭРЦАМ

Ты, сэрца, спеліш неабачна
Блакітны лён і злы драсён...
Я мушу зноў брысці жабрачкай
Да апраменепых акон.

Світае, днее, вечарэе,—
Я з тою ж прагаю святла
Душу чужым зіхценнем грэю
Праз неспагадны холад шкла.

Але табе ж няўцямна гэта:
Гады размылі берагі,
А ты ўсё спеліш кожным летам
Лугі не з медунёвых кветак,
Не жытні водарны палетак,
А клін заворанай тугі.

Ахамяніся, азірніся,
З табой раўня мы па гадках,
І ты слугуеш не актрысе,
Што можа роль сыграць катка.

Маўчыш і ціснеш мне на скроні
Такой слязінай без расы,
Такой сумотаю бяздоння...
Дай божа дождж!
Буйны, касы.

ЛЕТУЦЕННІКІ

На ўзлётнай паласе
Ніводзін летуценнік,
Што рана, па расе,
Пасе сваё натхненне,
Каб стаць на сіні тор
Пад зорныя вяршыні,—
Ніхто з іх не памёр,
І след іх не астыне...

На ўзлётнай паласе
Ўстаюць на мужны голас,
Яшчэ — жывыя ўсе —
Там не бывае гола.

За імі след у след,
З лятункамі пад пахай,
Нягучна йдзе паэт
І філасо́ф з размахам.

Чутны іх галасы,
Зямля не дасць прапасці,
Іх сцерагуць лясы
І тумановы засціл.

Разыдзецца туман,
Раскрыецца сінеча,
Азорыцца ліман
Надзеі чалавечай.



Ізноў ты позніцся, як некалі,
Мая астатняя вясна,—
Тады ж мы санным шляхам ехалі,
Каб потым бегла я адна.

Насустрач прыцемку бяззорнаму
З малой смужынкаю святла,
А сэрца ж білася нязморана,
Адно агонь у ім палаў.

Ён ахапіў душы ваколіцы
І гэтак высака шугаў,
Здалося, ў неба ён дамоліцца,
Каб сціхла сівая пурга.

КОЛАСА НЯМА...

Змоўкла шумлівая Нарач,
Хвоі застылі ў тузе,
Важкі уздых па абшарах
Весткаю страшнай паўзе...

Ноч ахінае вазёры,
Купы зялёных прысад,
Вымкнуў са срэбра Баторын,
Мілай старонкі краса.

Дыхаў ён тут так свабодна,
З плеч адкідаючы век,
Самы сапраўдны народны,
Родны усім чалавек.

Змоўкла шумлівая Нарач,
Хвоі застылі ў тузе,—
Важкі уздых па абшарах
Весткаю страшнай паўзе...

МАДЭРН

Старыя рыфмы выйшлі з моды,
Як крой шырокіх нагавіц,
А цётка-мода, як пагода,
На чвэрць, на сама больш — паўгода,
А там ізноў старонкі рві.

Не рыфмаваць жа век каханне
З несамавіцейшым жаданнем
Альбо спакучанае сэрца
З уцешнай весткаю ў канверце.

І смешна гэта, і балюча,
І недакладныя сугуччы.

Ты іх у слове — напачатку
Шукай, па новаму парадку,

Дык як жа будзе рыфмавацца,
Напрыклад, «мора»?
«Морак, змора»...
А калі сціпла, без авацый,
Дык лапаць мусіць мець абору.

ПЕРАЙМАННЕ СЯБЕ

Што з ветрам прыб'еш ты, мой лёс, на астатак,
Які яшчэ сэрцам не сплочан падатак? —
Нязнаная трызніць вясна...
Прыходзяць надвечар няўмекі-радочкі:
— Бярэзіне кожнай не ўнікнуць падсочкі,
Пакуль не чуваць перуна.

Сок пырсне, і золкі схмялеюць шчасліва.
Зальюцца ружовай смугой.
Цябе я не клічу, вясновае піва,
Уласны мой хмель, як агонь.

Душой абмінаю ўсе стромы Сіная —
Мая зелянее Зямля,
А можа, і ў хвалях вясёлых Дуная
Ёсць кропля з бярозы камля.

Цябе я не знаю, не чую, не клічу,
Бяроз прыцярушаны свет!
Чаму ж так назольна ўстаеш ты ў аблічч
Суровай чаканкі манет.

Ні руху, ні знаку,
Адны толькі вочы
З нямотным пытаннем:
— Чаму?
Ды плешчацца песняй далёкая рочаць
З ракі паўнаводнай Амур.

ШАСЦІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ



МЫ ПАЎТАРАЕМ З ВЕКУ Ў ВЕК...

Ужо ён спісаны наўскрай,
Твой сшытак дараваны.
Але яго ты не чытай,
Як цітры на экранах.

І надта пільна не сачы,
Хто там каго іграе,—
Часцей пісалася ўначы,
Без сівай месячнай свячы,
Дый п'еса ўжо старая.

Мы паўтараем з веку ў век
Шэкспіра ў перакладзе.
Часцей бывае з мовы здзек
І ў роспачы, і ў здрадзе,

Прасцей з забойствам —
Льецца кроў,
Змывае рэтуш калькі,
І ты, забойца, будзь здароў,
Здымай і далей скальпы.

Жыццё паказвае нам сны,
Што мы зазналі ў скруце,
А ці схаваеш ад вясны
Птушыныя пачуцці?

Калі сусвет адно пяе,
Вакалам апантаны,
І кветкі мая — ўсе мае,
І прадаюцца танна.

НЕ ХАЧУ РЭПАРАЦЫЙ

Пад заслону навалы?!
Я туды не пайду,
Хоць бы сіньшы прагалак,
Хоць бы промня кавалак
На дзён чараду...
Пад сутонлівы колер
Распасцерлася даль,
Можа, болей ніколі
Не задзьме той містраль.
Не раскідае хмары,
Не сатрэ іх з нябёс,
Каб зіхцелі стажары,
Каб лунаў альбатрос.
Можа, гэта астатні
І радок мой благі —
Непакораны ратнік
І палоннік тугі.
Без яго, без затулы
Найчысцейшых снягоў
Мяне немач садзьмула б
З ледзяных берагоў.
Ужо час адкасацца,
Адысці, супачыць?
Не хачу рэпарацый
Да астатняй свячы.
Хай іх сыскваюць тыя,
Што азглілі мой шлях,
Я ў світанкі густыя
Ахінаю свой дах.

МАЛАДОСЦЬ

Цяжкавата даваліся будні,
Лёс чапляўся за шпалы дарог,
Ледзянелі вандроўныя студні,
Бог хіба што напіцца з іх мог.

Маладосць мая, мілы мой госць,
Горкай радасці хмельная млосць,
Дзе ты зараз гасцюеш без нас
І ці ўспомніш знянацку хоць раз?

Колькі прагі мы неслі ў вачах,
Каб агонь твайго свята не чах.
Ды сышла ты зарана ў гады,
Дзе пазначаны смуткаў сляды,
Не паслаўшы нам дзён наўздагон,
Каб яшчэ маладзеў наш загон.

Маладосць мая, мілы наш госць...

НАПЯРЭДАДНІ

Успамянуўшы свой выток,
Я зноў паклікала радок.
І ён прыйшоў, зірнуў сурова
І адхіліў чужое слова,
Не паспытанае душой
На смак, на горыч, на пакуту...
І, можа быць, тае ж мінуты
Жывы прамень у дом зайшоў,
Каб слоў пабольшала раскутых.

...Гучыць суладдзяў вадаспад,
Я прагна слухаю імгненне —
Залоціць лісце лістапад,
Часіна нашых нараджэнняў.
Пад шэпт лістоты марыць дол,
Дрымотай поўніцца прастора...
Мой дом! Я зараз маю дом,
І ён нічога не паўторыць.

Ён не адважыцца...
                    ў кутках
Паснулі разам гнеў і смуткі,
Хоць музыка хістае дах,
Ён можа выстаяць, цалюткі.
Ён знае — ростань блізка ў нас,
Ды ў кожнай ростані ёсць межы,
Хіба што прыімчыць вясна
З цяплом паўднёвых узбярэжжаў.
Не буду сэрца прысպяшаць
На перадчасную маркоту...
Ці ўсё спытала ты, душа,
Ці штосьці спытваеш употай?..

ВЕЧАР

Экран душы. На ім смугою
Пазначан шлях вечаравы́,
Твой позні шлях, што сэрца гоіць
Відном някошанай травы.

І раптам камеры рухавасць,
І між лістоты — буйны твар,
За ім лугоў маіх патравы
І вобраз жалю — ясакар.

Шуміць лістотаю трывога,
Нібы абвешчана яна —
З майго вячэрняга парога —
Святая сэрцава вайна.

А з кім? З сабою ды з журбою,
З той пасівелаю журбой,
Што нішчыць сэрца ў перабоях:
Трывога — полымя — адбой...

ВЯСНА — ІМЯ ЖАНОЧАЕ

Вясна за вокнамі прыстання —
Зялёных колераў паўстанне,—
Супроць каго? Зіме насупар,
Ці гэта свету спеўны рупар?

Гучыць там сіла, мужны голас.
Ён пранікнёны, ён вясёлы.
А весялосць даброты родзіць
І песні спеліць у народзе.

Ты сыдзеш з ганка веснім ранкам,
Махнецца хусткаю паўстанка
Бярозка ў слёзках, хоць малая,
А як жа з промнямі гуляе.

Вясна жыве ў кутку павабным,
І зранку строіцца ў ядвабы,
Сіня-зялёныя тканіны,
На вершалінах, і ў лагчынах,

І ў зрэнках мілае жанчыны,
Што ўся ў тузе, з нягнуткім станам,
Яшчэ не стрэўшыся з каханым.
А вобраз маці — ўся адданасць.

Цалуе рукі ёй праменне
За сто пакут душы — найменей,
Яны далёка альбо блізка,
Але пазначаны ўжо рыскай —
Там, дзе усмешка родзіць радасць,
Суседзячы з сяброўкай-здрадай.

* * *

Як на сэрцы марозна,
Калючая шэрань...
А вяртацца запозна —
Насмяюцца хімеры.

Вынаходлівы лёс
Так заблытаў пуціну,
Што, пачаўшы свой крос,
Ты яшчэ без прыпыну.

Няма за што ўчапіцца,
Каб з возера напіцца...



Пад густа-сіняю сінечай
Пачаўся гэты дбайны вечар:
Ён зоры высыпаў з каша,
І страпянулася душа!

Так зазіхцеў той свет высокі,
Куды заўжды хінецца вока,
На мой пачатак, на астатак,
На ўсе мае глухія раты...

ЦЯПЕР Я ЗНАЮ...

Табе не пішацца, пяро,
Відаць, ад рук маіх ты ў стоме,
А некалі ж такой парой
Радкі ішлі са мной па строме.

Найбольш без сцежак, на гару,
У воблак белы, тумановы,—
Жыццё там ладзіла ігру
У словы зману, праўды словы.

І, скасаваўшы іх усе
На лёгкім сонечным адхоне,
Ману ад праўды ты адсек,
Але скрывавіў мне далоні.

Цяпер я знаю, што тапор
Не можа быць без тапарышча:
Скрывавіць можна цэлы бор,
Як дзень пры дні галіны нішчыць.

МАЯ ТЭЛЕПАТЫЯ

Не хачу ні вясны, ні яе зеляніны,
Ні раптоўнага цвету пад лісцейкам кволым,
Не хачу я чаромхавай белай галіны,
Не хачу нават песні тае, салаўінай,
Бо варушыцца ў сэрцы няпраўды асколак.

Ён вастрэе штодня, як бы хто яго точыць
Асялком той будзённай маны драбязговай,
Дзе разбаўлена праўды крыха на прымочкі
Ад апекаў душы з выкрываўчага слова.

СОН

А дарога, як пустка... Адна я ды стромы,
І калі ж я дастануся, ўрэшце, дадому?
Ні жытла, ані дыму, цяпельца малога,
Толькі думак самотных ліхая аблога.

І дарога, дарога... А стромы, а стромы
Мае плечы ўціскаюць каменнаю стомай.
Напаўзае сутонне туманавай парай,
І займаецца сэрца раптоўным пажарам.

А як гасне пажар, тое полымя злое,—
Нібы я не адна ўжо іду, а з табою,
Лёгка крочыцца нам, а насустрач — пагода,
І ружовая хмарка, як мальва, з усходу.

Ты сказаў мне: «Спачнём, ты ўхадзілася
вельмі!»
(А малы вымаўляў вельмі хораша — «эльма»)
Гэта маці твая расказала з усмешкай,
І цяпер прыгадала я з горкім дамешкам,
Бо ізноў я адна, толькі стромы ды стромы...
І чаму так высока ісці мне дадому?..

НА НЁМАНЕ, А НЕ НА ЗЕІ...

Зіма ў нас сёлета — красуня! —
Без завірухі ані дня.
Турботы ўсе мае касуе
Мяцелічная мітусня.

Снег растае на цёплай скроні,
Паруюць кроплі на чале...
А віхар гоніць, гоніць, гоніць
Адны снягі другім услед.

Было ўжо так... У маладосці...
(Ішоў мне дваццаць трэці год.)
Яшчэ на свеце з песняй госцім
І прычакалі ледаход.

На Нёмане, а не на Зеі
І не ў марыінскіх барах...
Мяці, мяці, мая завея!
Сягоння сэрца не азглее
І не застудзіцца ў вятрах.

ЛЮТЫ

Падлесачак за ноч стаў белым бэзам,
Купчастым бэзам, гордасцю садоў.
Вавёрка мільганулася, гарэза,
Пялёсткі атрасаючы на дол.

Нацерусіла поўнач столькі цудаў,
Аж раніца знямела пры сасне,
Вятрыска сціх, і дуб ляны — няўклюда,
Зацяты дуб, лістком не варухне.

Мянёнае, вясёлае зіхценне —
Блакітны снег па-над галлём ялін:
Ўсе скарбы свету у адным трымценні,
І ты — ўладар, пакуль ты на зямлі.

Сюды ідзі, у гэты снежны водар,
На тую трэль, што сонца заняло:
Не трэба поўдняў і не трэба водаў —
Адужвай сэрцам і крыяй крылом.

Зямля ў снягах, у тонкім белым мліве —
Узор яднання плёну й хараства —
Яна ўжо спеліць ураджаі ніве,
Да сонца паварочваючы твар.

ЖЫЦЬ!

Калі разнядужыцца сэрца,
У кратах б'ючыся сваіх,
Як быццам за сажань ад смерці
Ты ўласны свой чуеш уздых,—

Пакліч на ратунак былое,
Дыхні успамінам такім,
Што зрушацца сцены ў пакоі
І вецер усходзіцца ў ім.

А з ветрам і морскія хвалі
Апырскаюць соллю парог:
Пакліча павабная далеч
Яшчэ нетаптаных дарог.

І зноў ты пачуеш, як прагай
Напоўніцца сэрца тваё,
Няўтомнае сэрца бадзягі,
Шукальніка спеўных краёў.

І зноў у нябыт не паверыць
Душы акрыяўшай узлёт:
Ёй жыць і бязмежжамі мераць
Ружовы усход і заход.

ВЯСКОВАЯ НАСТАЎНІЦА

У страях вясёлых восень цябе стрэла:
Золата, ды чырвань, ды прымглёны цвет.
Цішыня у школцы, з траўня апусцелай,
Водбліскі закату на густой траве.

Ты ўзышла на ганак. Рыпнулі прыступкі.
Дзверы прачыніла ў сенечны паўзмрок.
Гэта твая сталасць зараз пераступіць
Бесклапотных вёснаў залаты парог.

Строгае аблічча і на вейках смутак,
Але позірк ясны: з-пад аблокаў сінь.
Шмат, дзяўчо, зазнаеш — шчасна будзе
й скрутна,
Але, як пасееш, так табе й касіць.

ЗАРОК

Калі на самоце адзіным ратункам
Мне будзе здавацца радок,
Калі я ва ўсіх сваіх цяжкіх стасунках
Ныраць буду ў слоўны паток,—

У што ж ператворыцца радасць натхнення,
Чым стане няўтомны мой верш?
Баяцца пачну я яго нараджэння,
Як поўні жахаецца звер.

І слова, што зрошчана будзе з пакутай,
Зрачэцца, напэўна, мяне.
Шануй жа ты верш свой ад горкай атруты,
Каб здужаў ён шчасцем звінець.

ЦАНА ШЧЫРАСЦІ

Сябе, свой лёс абца́жваць зноў
Больш не адважуся ніколі:
Усіх цікаўных стараной
Я абыду і выйду ў поле.

А там прызнаюся жытам,
Як дорага каштуе шчырасць,
І больш ні шэлега не дам
За вашу, таечкі, настырнасць.

Са спачувальнаю слязой
Вы выціскаеце атруту,
Злаславай радасці лязом
Ганьбуючы мой чысты смутак.

Калі ж усходзіцца туга,
Як верад на глухой самоце,
К людзям пайду, ў цяпло спагад,
Падалей ад хлуслівай процьмы.

І жніўня мудрага спакой
На плодных восеньскіх палетках
Падкіне ў сэрца мне радкоў,
Жывою шчырасцю сагрэтых.

ЛІСТАПАД

Адсвяткавала цветам лета,
І лістапад мяце лісты:
У яр скідае, у кюветы
І пад дарожныя масты.

І лісце шастае тужліва,
Гамонячы з самой зямлёй,
Заўжды спагаднай і руплівай
У неўміручасці сваёй.

Ёй давярае таямніцы
Ужо адцвіўшае красы,
Што вечна прагне адрадзіцца
І вылюдзець у каласы.

Душа, пакуль ты не ў кювеце,
Хоць і хінешся да зямлі,
Ты памятай аб тых наквецціях,
Што ўчора ў сэрцы прараслі.

Даверся ж ты зямлі спагаднай,
Яе няўхільнаму цяплу:
Душа ва ўладзе лістапада,
Дай супачын яе крылу.

ДЗЕНЬ ПАЧНЕЦЦА ХОЦЬ ЗАРАЗ...

Як жа будзем мы жыць на самоце з табой?
Золак сеў на яліне за нашай вярбой.
Дзень пачнецца хоць зараз: рукою крані
І ружовае дрэва крыху скалані.

Колькі фарбы ружовай расплешчацца скрозь,
На аблокі, на белай сарокі пяро,
Пырсне ў вочы спачатку, на вейках спачне
І ружоваю пасмаю ляжа на снег.

Як жа будзем мы жыць на самоце з табой?
Зноўку з раніцы піць гэты моцны настой
Неадхільнай, няўтомнай, праклятай тугі,
Хоць ты з левай, хоць з правай устанеш нагі,
Хоць ты дурнем сябе сто разоў назавеш,
Хоць ты сотню радкоў, напісаўшы, парвеш.
І тады, гэтак моцна настрашыўшы свет,
Усвядоміш раптоўна, што ты не паэт,
Калі з кола праклятага выйсці не змог
За мяжу гэтых смуткаў, за нізкі парог.

Дзень жа зараз пачнецца: рукою крані
І ружовае дрэва крыху скалані.

ДАРУЙ МНЕ, ПЕСНЯ...

Даруй мне, песня, друг найлепшы,
Што не даю табе я ўзлётаў.
Са мной ты толькі гора хлебчаш,
Аб шчасці марыш толькі ўпотай.

І за руку цябе узяўшы,
Я не вяду ў вясновы росквіт,
У горад наш, з руін паўстаўшы,
Дзе кожны дом у госці просіць.

І не паказваю здабыткаў
У сонцы слаўнай перамогі —
Я толькі свой гартаю сшытак,
Свае замглёныя дарогі.

Але каб ведала, каб чула,
Як трэба мне твая спагада,
І музыка твая, і чуласць,
І усхвалёванасці ўлада.

Так той вандроўнік, што ўжо чуе
Хвілін астатніх крок стамлёны,
Яшчэ ўсё зрок з жыццём нітуе,
Свайго юнацтва бачыць крону.

Я ЗМОЎЧУ ІМ...

Бягу пад ветрам маладым,
Пад зоркаю вясёлай,
А ўслед крычаць мае гады:
— Куды ты з сэрцам кволым!

Я змоўчу ім — каторы раз! —
Назад не азірнуся,—
Ўсё роўна прыйдуць па адказ,
Калі дамоў вярнуся.

БЕСПАРАДНЫЯ РАДКІ

Многа іх, радкоў сірочых,
Тых бяздомкаў, тых бадзяг,
Што глядзяць так пільна ў вочы,
Нібы ты для іх суддзя.

А суддзя, не меўшы рады,
Сам не ведае, адкуль
Пасылаюцца загады
Беспараднаму радку.

Хай жыве, калі народжан,—
Ці ў наветранай начы,
Ці калі твой дзень зняможан,
Ці калі душа крычыць.

А радок, хоць не цукровы,
А хутчэй ён баламут,—
Але робіцца замовай
Ад усіх зямных пакут.

Свет па-свойму перайначыць,
Пераблытае сляды,
Ў доме шчасця пабатрачыць
І адхіліць цень бяды.

А душы прымерыць крылле —
І, здаецца, узляціш,
Як услед за эскадрылляй
Рвецца ў неба лёгкі стрыж.

ПАЧУЦЦЕ МЕРЫ

Мы лічым вёсны з асцярогай:
Ці не астатні гром аціх?!
Хоць кажуць: «Дзён у бога многа»,
А колькі м н е належыць з іх?

На сцяжыне́ зямнога шчасця,
Зазнаўшы меры пачуццё,
У збыткаванне цяжка ўпасці...
А як жа з мерай на жыццё?

І тут хіба, угнуўшы плечы,
Пакіравацца на прычал?!
Прайшоўшы круг пакут
спрадвечных,—
Якраз бы зараз жыць пачаць.

Раскрыць акно у сад праменны,
Адчуць расіну на чале...
Каб так было заўжды, нязменна,
Без меры зім, без меры лет.

КАСМАНАЎТЫ

Мы даўно, даўно не чулі,
Як пяюць вятрыскі ў полі,
Лісце падае з таполі
У прысадавым утуллі.

Мы даўно не чулі крокаў,
Маладых і прытамлёных,
Ці каб нехта загалёкаў,
Так шчасліва, так шалёна...

Мы не чулі нават грому,
Тых магутных перакатаў,
Калі страшна выйсці з дому,—
Неба ў полымі зякратым.

Палыновая сцяблiна
З намі ў космас заляцела,
Горкім водарам хваіны
Поіць нашу каравелу.

А зямля нам сніцца, сніцца
Сівай параю на ўзгорку,
Шчабятліваю сініцай,
Першым снегам на падворку.

Мы даўно, даўно не чулі,
Як зіма халодзіць чола,
Як вясна прабуе голас,
Як там клічуць нас матулі!

РАМЕСНІЦТВА

— Ні дня без радка,—
Гэта піша рука,
Ды сэрца ж удзелу не мае,—
Бо што за карысць ад радка-жабрака,
Які мне душы не кранае.

Калі ж і зачэпіць, дык толькі таму,
Што пусткай дыхне, занядбаннем,
Халодным выслоўем, як быццам прымус
Паэзію знішчыў дазвання.

* * *

Чым далей на поўнач,—
Гасцінец даўжэй
І з кветняў не водарыць ружа,
Тугое паветра птушына стрыжэ,—
І ёй, і табе трэба мужнасць.

СМЕЙСЯ...

Слова, слова — часцей ты вымова,
Што бяру цябе загрудкі зноў,
Але ж бачыш само, як сурова,
Пад лядзянага неба замовай,
Адцуралася дому відно,
А далёкіх лятункаў пано
Укрываецца спрэс туманом...

Смейся ж, смейся, як людзі смяюцца,
Калі вусны слязьмі захлынуцца...

Ды засмейся ж насупар слязіне,—
Хто ж тут вінен — opinion [1].
Да душы мне ўжо час пасмяяцца
З гэтых кплівых рыфмованых рацый.

---

[1] Погляд, думка (лац.).



Бяры за руку мяне, мужнасць мая,
У вочы зірні без дакору...
Не буду я болей так сэрца краяць,
Падкошваць дзянёчкі пад корань.

Прыстанак халодны, а чысты, глядзі,—
Ні пляміны, ні парушыны.
Чаму ж не магу я жыццю дагадзіць
Ці ўкрасці хоць наквець з галіны?

Сумленне, сумленне, ці знаеш ты смак
Скарынкі ад бохана шчасця?
А людзі ж вясёлыя ходзяць, аднак,
Ці ж лёгка было ім украсці?

ЯК ТОНКА СПЯВАЕ ТУГА...

Пакуль я па прорвах блукала,
Дзе сонца радку не стае,
Патолю сабе адшукала
На горкія ночкі свае.

Сасню, як праменяцца недзе
Гарачыя стрэлы галін,
Зіхцяць ад шчаслівых адведзін,
Дзе ўсе пакрысе падпілі

І ты з гэтай сцежкі вясёлай
Дадому свой хмель данясеш,
І трэмала, гучнае сола,
Даўно не спяваўшы, спяеш.

Паслухайце, добрыя людзі,
Як тонка спявае туга,
Нідзе яна ў нотах не зблудзіць,
Сфальшывіць не дасць і салгаць.

Журліва пяецца з устатку
Ад плоенай хвацкай маны,
Як спрытна, як хораша й гладка
Ілгуць на планеце паны.

Нібыта звядзецца іх кодла,
Аж зноўку пачат карагод:
Жыве неўміручая подласць
І душыць нас тысячы год.

МЯЦЕ МАНА

Друг, абзавіся, дзе твой дом,
Прыстанак ці паўстанак?
Гудзе наўкол аэрадром,
Не распагоджан ранак.

На вылет рэйсавы бягуць,—
У тлуме не пачую,
Калі мой нумар назавуць,
І зноў тут заначую.

Канечне трэба мне ляцець,
Ад глебы адарвацца,
Тут на зямлі адно мяце,
Няма за што ўтрымацца.

Мяце мана, як з перуна,
І снежыць, слепіць вочы...
Я столькі год ужо адна,
Магу і з тропу збочыць.

Друг, абзавіся, дзе ты ёсць,—
Ты мусіш быць у свеце,
Хіба праз лёсу майго злосць
Ты на другой планеце.



Ці гэта толькі графаманія,
Ці, можа, нават клептаманія,
Прасцей — рабунак тых радкоў,
Што служаць рупарам вякоў,
Што моцна ў часе прагучалі...

Але не нам іх прысвячалі.

РЫФМА

Імжака шэпча штосьці, як баечнік,
І сыпле, сыпле золь адну.
Па сходцах верш ідзе кульгаючы,
Пляцоўку нашу абмінуў.

Вышэй, вышэй! Паэты высака
Гняздуюцца ва ўсе часы...
Ён нешта ім пад дзверы высыпаў,
А ці не зблытаў адрасы?

Наш дом, як цытадэль паэзіі
З аблогай прозы... І штодня
Закуты рыфмай, бы ў жалезе мы,
І горда ланцугі звіняць.

А рыфма ўжо не маладзенькая,—
Ёй хіба столькі ж, як і мне:
Паміж паверхамі падзейкае,
Пакуль у сэрцы боль міне.

Прыступкі ж з кожным годам большаюць,—
Апошні ўзлёт, як эшафот...
Дык хай яе падгоніць збольшага
Той, хто пад дахам,— вершаплёт.

СТАРАСЦЬ

Абсягі неба ў цёмных хмарах,
А сонца ў вочы б'е напрост,
Яшчэ нібы марудзіць старасць,
Як з берага на борт матрос.

Яна марудзіць і збірае
Да купы ўсе зямныя сны,
А жаўрукі вясёлым граем
Вястуюць зноў прыход вясны.

Лягчэй як быццам чалавеку
Адольваць старасць па вясне,
Яе ж сястра падступіць знекуль
І човен з берага штурхне.

ГАВОРЫЦЬ НОВЫ ГОД

Я голас прачулы пачула здалёку,
А мне ён патрэбен быў вока на вока:
«Ці праўда ўсё тое, што спела ў радках,
Калі неаднойчы раскідан быў дах,
Калі маладосць папялела ў агні,
Калі не шкада было сэрца ані,
Калі ад няпраўды згіналіся рукі,
Калі без прынукі ішлося на мукі...

Калі гэта праўда, што склалі радкі,
Застанься са мною і ты —
на святкі!»

СОН
У СНЕ

Мне пралангіравалі сон,—
Я спала ў доўгім вызваленні,
І нада мной, як парасон,
Спагада веяла трызненні.

Я ўсё паспела асачыць:
Усмешку губ негаманлівых,
Някідкі шалік на плячы,
Святло за вокнамі, як мліва,

Сваё бяссілле, свой палон,
Душы шчаслівай нерухомасць,
І рукі, што ўвайшлі ў мой сон,
Як літасць зерня да саломы.

Якое рэшата дабра!
Яго ж так сэрцу бракавала...
І даўняй наледзі кара
З ласкавай хвалі раставала...

НЯСКОНЧАНЫ РАМАН ЛЬВА ТАЛСТОГА

У нумарах француза Шэвалье
Праз дваццаць год сустрэлі дзекабрыста,
І пагалоска дожджыкам ліе:
— Вяртаюцца, нарэшце, усе чыста...

— І нават больш... Такая процьма іх! —
Здаецца, нібы высылалі меней...—
Зайшла сястра, і едкі голас сціх:
Другое ўзгадавана пакаленне.

А ён быў дома... На Радзіме зноў,
Апанаваны згадкамі юнацтва:
Каменны мост разгледзеў праз акно,—
Там недзе лазня... Вось куды падацца!

Астатні вечар, без чужых, адны:
Дачка і сын — вясёлыя дружочкі,
Наташка-жонка — літасць без маны,
І шчасце тояць вусны у куточках.

Астатні вечар. Там гудзе пурга,
Спеў завірухі лашчыць і кунежыць,
Высока плешча, коціцца вагар
Жыццёвай хвалі... Чыстае бязмежжа.

Астатні вечар. Чым адорыць дзень?
Хутчэй з Масквы, туды, дзе спее лета.
...А дожджык пагалоскі ўсё гудзе:
— Дачку вывозіць, сына — у карнеты...



Пад небам маім летуценным,
З лагодным абліччам аблок,
Мігнулася шчасце імгненна,
Ды гром яго недзе звалок.

І з гэтай навалы зайграла
Ружовая далеч смугі,
Зардзеліся выспы-каралы,
І шчасным стаў нехта другі.

Так бавіць сябе незваротнасць,—
Гады ці імгненні — адно!
А шчасцем бывае самотнасць,
Даспелага веку віно.



Н. Г.


І слова сірацее ў горы,
Як вецце хіліцца пад гром...
Учора ты стаяла поруч,
І верасень прасіўся ў дом.

Пайшла, спытаўшы так, як маці
Пыталася астатні раз:
«А як жа ты? Паўсэрца страціш,—
Яшчэ ж не нарасла кара».

СНЫ

Табе я часта буду сніцца
На сцежцы незваротных год,
Дзе елка ў снезе з рудай гліцай
І смуткаў весніх надыход,

Сон — скульптар, сон — мастак праўдзівы:
Хоць без дэталяў палатно,
Але якая празарлівасць —
Душы абнажанае дно.



Здавён пытаюцца ў жыцця:
Якою мерай шчасце мерадь,—
На зорны свет, на мірны сцяг,
Суседзяў чыстыя намеры?

Ды кожны мае свой рэзон,
Аб шчасці марачы употай:
Злятаць канечне да тых зор,
У самыя зайсці вароты.

Збыткуецца журбой душа
У доўгай здрадзе весялосці,
А ўжо ж на донцы ўвесь пяршак
І разышліся з дому госці.

На клямцы сон,
І неба спіць
Тут, за акном маім шырокім.
І толькі птах благае: пі-і-іць!
Бяроза, пырсні яму соку.

РОДНЫ ГОРАД

Разбудаваўся родны горад,
Сталіцы нашай не пазнаць,
Мы ёй падаравалі мора,
І ў ім люструецца яна.

Уся — з зялёнымі агнямі
У кронах незлічоных ліп,
З буйнымі паркамі, садамі,
Што ў мірных вёснах зацвілі.

І на праспектах беласценных
Палаюць кветняў дываны,
Пакуль зазімкі не надзенуць
На іх апоны да вясны.

У гэтым стольным будаванні
Па сілах кожны браў удзел,
Каб нехта ў Мінску нешта зганіў,
Дык зачапіў бы ўсіх людзей,

Што так ад сэрца тут рабілі,
І вуліц шырылі прасцяг,
І плошчаў разгарнулі крылле,
Каб вольна прасціраўся сцяг.

Дамы стаўлялі з мерай добрай,
І навырост, і на прырост,—
І нашай мары першы вобраз
Мінск відавочна перарос.

НОЧ

Блукаючы ў гушчары сну,
Між вобразаў нібы прымглёных,
Сама сябе не абміну
За невядомасці апонай.

Таксама рынецца душа
На голас твой, як на збавенне,
Таксама трэба ёй спяшаць
Праз рэкі, стромы, праз каменне.

І, асягаючы зямлю,
Стамлёным сэрцам, без спачыну,
Твой воблік з воддалі лаўлю
Ужо адкрытымі вачыма.

РАДКІ

Радкі мае, браткі — ў бядзе,
Вы і спагада і затула,
А ў шчасці вас няма нідзе,
Сыходзіце ў глухі завулак.

Гукаеш — водгуку няма,
Так снегіроў нябачна ўлетку,
На дрэвах іх шукаць дарма:
Знялі чырвоныя жылеткі.

А шчасце выпырхне з рукі,
Мы з ім не знаем абыходку,
Мы толькі марым праз вякі
Здалёк пазнаць яго паходку.

І зрыхтаваць тады жытло,
Каб не манулася пакінуць,
Каб там, пад сэрцам, узышло,
Што з радасці расці павінна.

А толькі грымне ў сенцы гром,
Раскоціцца па ўсёй акрузе,
Вы пад дажджом імчыце ў дом,
Звязаўшы рыфмы ў моцны вузел.

Радкі мае, браткі — ў бядзе,
Вы не крыўдуйце, калі часам
Сярод абуджаных надзей
Я не гукаю вас з Парнаса.

З тае гары вам шмат відно,
І ўсё, бадай што, зразумела:
Калі азорыцца акно,
Калі ізноў яно зацьмела.



Дзе ты, айчына недасяжнасці? —
Глыток вады з твае ракі!
Адмерадь шчасце можна сажнямі,
А як дастацца напрасткі?!

Калі душа агнём захмеліцца,—
Твая вяршыня паўстае,
Дзе ў распрамененай аселіцы
І сумны птах вясну пяе.

Яму вядома ўсё нязнанае,
Што ў даўняй нерушы жыве,
І мара наша апантаная,
Што на караблiку плыве.

Куды, па што, нікім не ўгадана,
А сэрца, вось яно, трымціць...
Хоць долю нейчую бязладную,
Ты узялося б асвятліць?

* * *

Пакуль мяне кліча радок,
Я тут,
на зямлі,
не памру,—
Хоць моцна хістаецца крок,
Ды я не пярэчу пяру.

Дрыжыць яно дзіўнай струной
Напятай дарэшты журбы,
Не раіцца болей са мной,
Само гаспадарыць нібы.

І неба тугі парасон
Ратуе мяне ад слаты.
Тут росны рунее адхон,—
З яго набліжаешся ты.

СПЕЎНЫ ЧАС

Ну што сказаць? Ізноў я трачу
Адну сінечу за другой...
А як бы ты жыла іначай,
Журбу чаргуючы з тугой.

З лядоўні змроку і самоты
У палымнеючы касцёр,—
Відзён ён быў і з самалёта,
Што крылы над табой прасцёр,

Тады, калі зямля гарэла,
І ты на ёй — адным адна! —
Надзеі нават не сагрэла,
Хоць так хінулася яна.

Я помню ўсё, удзячным вокам
Благаслаўляючы крыло,
Што пасылала мне з аблокаў
Дасюль нязбытае цяпло.

Я помню ўсё. Але ці трэба
Так раздзімаць агні вясны,
Каб сэрца зноў ламала рэбры
Ад кожнай вы́крытай маны.

Надходзіць спеўны час змяркання.
Хай уладарыць на зямлі
Маё міражнае каханне,
Як у пустыні караблі.

Хай нам міргне, хоць і звысоку,
Планета дзейснага дабра,
Каб не сышла ты з відавоку,
Мая патхнёная пара.

ЛІМІТЫ

Крыха увагі, крыха патолі...
Ці не занадта, ці не даволі?
Рахункаводу не быць без працы:
Парад пачаты ўсіх аперацый.

Перш-наперш сума выдаткаў сэрца,
Ліміт пачуццяў у мегагерцах,
Мільённых дозах тых калыванняў,
Што з хваль глыбінных у акіяне.

Ліміт пачуццяў, ліміт спагады,
Абмежавальнік дарог у радасць,
Усмешак жменька у цэлафане —
Ці ў ёй ухвала табе, ці ганьба,
І ў гэтым слове, што цэдзіш з вуснаў,
З ласкавай мовы чыесь атрускі.

Прайшла залева, і пыл прыбіты,
Сыдзіце з тропу — хто за ліміты!

Ну, а прыбыткі? Ды ёсць жа кніжкі,
Куды складаюць пачуццяў лішкі,
Растуць працэнты на радасць жмоту,
Ад раты севу да умалоту.

А як з любоўю маёй адкрытай,
Куды ёй дзецца, несамавітай?!



Няма й няма, а золкі чэзнуць,
Трывожна дыхае паўзмрок,
І постаць хмары велічэзнай
Паволі ладзіцца з аблок.

Здавён жыву я вартаўніцай,
Пільную неба злы замах
І адхіляю навальніцу
Ад дрэва, дзе спявае птах.



Нялетавае гэта лета.
Сціскае холадам душу.
Нічым, нікім ён не сагрэты,
Радок, які я тут пішу.

Даўно мы не былі на ўгрэве,
Дзе першай чырванню суніц
І першай завяззю на дрэве
Туга касуецца наніц.

Мы не былі, і нас не кліча
Ні дом, ні літасць, ні цяпло,
Адно ўсё сэрца нешта клыча —
Выпрабаванне сіл на злом.

Дах прагграваецца за ранак,
Як сонца выблісне з-за хвой,
І зноў той голас за экранам,
За кадрам кліча:
Перастой!

Ператрывай! Жыве надзея,
Сястра малодшая твая,
Яна чамусьці лілавее,
Як сну пушыстага сям'я.

* * *

Радок зацяты, як іслам,
Твая рэлігія — пакора,
Дык хіба я цябе аддам
На здзек іроніі, на сорам.

Які ты ёсць, такі жыві,
Жыві затоенай істотай,
Палай агнём мае крыві,
Мае тугі, мае самоты.

АПЁК

Пройдзе і гэта Азорскімі выспамі,
Пройдзе апёк у журлівай душы:
Ёсць прэпараты ад сэрцавых прыступаў,
Сродкі — агністыя ўспышкі тушыць.

Штосьці скранулася ў доме самотніцы —
Ранак, ці ноч, ці вятрысты ўспамін —
Віхар узняўся, і дрэва калоціцца,
Можа, і ёсць гэта белы язмін.

Водар нягоды і болю нязводнага,—
Гэтак гарэніць твая маладосць,
Але ні з чым незраўнаная зводдалек,
Зблізку — бядачка, такая як ёсць.

РОСКВІТ

Дождж лье на лес, на яблык чысты,
На росквіт кветкі не ў пару,—
Яна пад купалам імглістым
Свой дзень пачне, свой першы круг.

Хто хараству не спагадае,
Хто не паклоніцца красе?
А гэта ж з тых, што ўладу маюць
Твой смутак выпіць пакрысе.

У келіху, бадай што, чорным
Агонь ірдзее на відне,—
Ён запаліўся позна ўчора,
А дзе запален быў раней?

Што гэта полымя жывіла
Пад шпагай вострага ліста,
Якая выбухнула сіла,
Каб так скарылася слата?

І дождж агню таго не гасіць,—
У кожнай кроплі ён гарыць,
І на маёй журлівай трасе
Запальваюцца ліхтары.

9 Зак. 2074

ЗАЦІШАК

Вяршыню бярозы, абраўшы сядзібай,
Успыхнуў заход, запаліўшы бязмежжа,
І песня ў тузе загайдалася нібы,
Ды ў воблаку згасла на жоўтых мярэжах.

Зацішак, зацішак, абы толькі шышак
Не спорваў вятрысты, зухвалісты вечар,—
Ён недзе ў дарозе браў добры кілішак
І зараз у кронах наладжвае веча.

А веча пярэчыць, аспрэчвае рэчы,
Бяспрэчныя здаўна пад тым небасхілам,
Дзе вечна жывое адно —
чалавечнасць,
Яна з рудыментаў адрошчвае крылы.

ЦІ ВАРТ БЫЛО

Няўмольна восень скасавала
Набыткі веснія душы,
Снапы сухія павязала
І ўдалеч звезла па шашы.

Яны так шасталі на возе,
Заўчасны холад кленучы,
Што нехта мудры пры дарозе
Патраты сэрца падлічыў.

Ці варт было,— сказаў сабе ён,—
Жыць пад уладаю вясны,—
Яна ж, як толькі загрубее,—
Кладзецца спаць на дзірваны.

Праспіць і лета запаветы,
І фэст вясёлых верасоў,
Хоць з неба падаюць каметы,
Як пераспелыя ранеты,
І дух грыбны чуваць з лясоў.

Вясна у снах, сама, як спенне,
Як птушка сіняя з нябёс,
Яна усіхнае натхненне,
І на адно хіба імгненне
Такім нястрыманым зіхценнем
Маланкай працяла мой лёс.

ТЫ НЕ СНІСЯ, НЕ СНІСЯ НАМ...

Ноч прыходзіць з загадкамі,
З цяжкім рэбусам сноў,
Аніяк не ўпарадкаваць,
Не дайсці да высноў.

Ты не сніся, не сніся нам,
На прыцэле курок,—
Хай на мірную місію
Перакінецца змрок.

Заставайся за кадрамі,
Раць варожых прыкмет!
Месяц квадра за квадраю
Шле салюты з ракет...

Хай прыходзіць увечары
Сыпаць дробненькі мак,
Той, у баечку ўверчаны,
Сон — стары наш дружбак.

Ён патрэбен і ўнучачцы,
Як галіне лісток,—
Дацямна з ёю змучыцца
Гэты дзедаў дамок.

Сон, ратуй нас ад скрогату,—
Зноў свідруюць бетон! —
І ад джазавых рогатаў,
І ад гучных ратоў.

Хай нам сніцца павабная
Лугавіна між рэк,
Тое лецейка бабіна,
Мілы восеньскі век.

СЯМІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ



ВІШНІ

Вішнёвы год. Панююць вішні,
І раскашуюцца дразды.
На іх палюе кот руды,
Бо сапраўды крычаць залішне.

Злятаюць костачкі паўсцяж,
Афарбаваны дзюбы, вусны...
Вясёлы жніўеньскі кірмаш,
Банкет на дрэвах непрымусны.

Дзяўчо праз тонкі ўзор галін
Глядзіць з усмешкаю рухавай,
Вяночак вішні аплялі
Вакол галоўкі кучаравай,

Вось гэта птушка! Якава?
Акселерантная надзіва...—
На дрэве — многа пераваг.
І ветру цёплыя парывы.

ТАМ ПАЧУЦЦЁ БЫЛО СВЯТОЕ

І ўсё ж з радкамі я не ў згодзе:
Руйнуе рыфма думак лад,
Бывае, ў пушчы ўбок сыходзіш.
Абы пралеска павяла.

Так часам роджанае сэрцам,
Яго крывёй, яго тугой,
Нібы прысыпанае перцам,
Пячэ і паліць, як агонь.

Ды гэта полымя не тое,
Не ім ахоплена душа,—
Там пачуццё вяло святое,
А тут багульнік ды імшар.



І ты, далёкая хваіна,
Гудзеш кунежна свайму бору...
Не ўзгадаваўшы табе сына,
Нібы зракласся я паўтору.

Нідзе, ні ў кім не будзе болей
Таго, што меў бы ён канечне —
Чала высокага раздолле
І непагоджаныя плечы.

НАШЫ ЛІСТАПАДЫ

Задажджылі дажджы...
Не кажы...
Залілі ўсе сцяжыны,
пачарнелі ажыны,
Не ўзгарэцца агніскам дажынак.

Толькі хмара, удзячная ветру,
Зараз дыхае снегам Ай-Петры.
Мне туды не зірнуць ужо болей,
Перадчасна мой дзень запаволен.

А вось зараз, глухім адвячоркам,
Калі дождж пазмываў з неба зоркі,
Ехаць лёгка было і прасторна
Замакрэлай дарогаю чорнай...

Горад родны, праз вокны машыны
Ты здаваўся дзіўною чужынай,
А як сталі на плошчы Якуба,
Зноў зайшлася душа гэтай згубай.

Нам чысцей і ярчэй з ім жылося,
І сваячкай вітала нас восень:
Расчыняла блінцы на світанку
І з каша выкідала паганкі.

Ой вы, людзі! Грыбы вас чакаюць
І за кепскія вочы ўпікаюць.
Мокры лес для прыхільнікаў родзіць
Пры пагодзе і злоснай нягодзе.
Не бярыце з сабою трывогі,
Толькі ногі, спрытнейшыя ногі.

Не бярыце з сабою турботы,
Пакідайце на потым, на потым.
На дажджыстых узмокшых палянах
Вас чакаюць рыжы́ без падману.

Тут уцешная ваша часіна —
Срэбрам падае кропля з лісціны.

МІР

Ранак вочы расплюшчыў і стаў за дзвярмі:
Чалавеча, выходзь і кіруйся да мэты,
На зямлі яшчэ мір, зразумей,— яшчэ мір! —
І ты можаш быць майстрам, вучоным, эстэтам,
Свет яшчэ заклапочаны ціскам крыві
І стасункам бялка ў тваіх фондах абменных,
Ён табе вітамінаў запас аднавіў,
Каб сапраўдны з цябе быў
Зямлянін карэнны.



Я ўсё цяпер дарую небу,
Змываючы буйной слязой
З чала захмаранага Феба
Маланкі вострае лязо.

Я ўсё дарую за крупіну
Адвечнай літасці зямлі,
Дзе мы народжаны часінай,
Што самі выбраць не маглі.

Дажджыстай ноччу лістапада
З табой зірнулі мы на свет:
Ні зор, ні месячнай спагады,
Ні нават воклічу камет.

Крупіну літасці сягоння!
І я дарую холад хмар,
І сны у вобразах прадоння,
І мар маіх знябыты твар.

Дарую я, і ты даруй мне,
Што так расквілена жыву:
Дзе нават мужнасць абхітруюць,—
Мой боль схіляе галаву.

* * *

Ды што за насланнё? —
Каторы дзень трызню я...
Душа, як дзеўчанё,
То плача, то святкуе.

Ці гэта ўжо гульня
Пад цёмную заслону,
Ці хтосьці пераняў
Вясну з галлём зялёным?

Пасыпалі снягі
На парасткі, на травы,
І сэрцавы багі
Сышлі з сваёй дзяржавы.

РАДКІ-ВІТКІ

Загон задзірванелай праўды
Капай рыдлёўкаю тугі,—
А можа, спраўдзіш, можа, спраўдзіш,
Чаго не ўздужалі багі.

Твая работа не для квоты
І не для змушаных падзяк,
А для душы, для той істоты,
Што жыць не хоча абы-як.

І маладзее і люцее
На схіле, на падліку дзён.
Звініць званок астатняй дзеі,
А ёй нібыта не чуцён.

Зноў ранак, крочачы на ганак
З кашом суніц, збанком чарніц,
Як і даўней, не дасць іх танна,—
Хіба за золата зарніц.

ДАРУЙ, ЖЫЦЦЁ...

Як змарнавала ты свой лёс,—
Даруй, жыццё, даруй! —
За цёсам цёс, за цёсам цёс
У спеўную пару.

Узлёты білі навылёт,
І падалі радкі...
Каторы год, каторы год
Рвеш сэрца аб сукі.

Агарак сплаканай свячы,
Каму баліць твой боль?
Адно гайдаецца ўначы
Узрушаная столь.

ПРЫМАЮ ТВОЙ ВЫРАК

Пякучыя згадкі,
Пякельныя словы:
Не руш іх асадкай,—
Успыхнуць гатовы!

І вочы у хмарах,
І сэрца у сціску...
Ды я ж не артыстка —
Відно ўсё на твары.

Пад ветрам, пад зыркім,
Пад воблачным дахам
Прымаю твой вырак,
Жыцця майго захад!

Сабой заставацца —
Як гэта няпроста!
Без хвал, без авацый
Сыходзіць з памоста.

Роль меўшы смутную,
Майстэрства не трэба:
Мой боль не мудрue,
Б'е ў сэрца,
Пад рэбры.

ПЯРСЦЁНАК

Не засынаецца ніяк,
Не спяць і ў небе аблачыны,
Палае зорка, як маяк,
І горна мне без дай прычыны.

А вымагальніца-душа
Упарта падымае вейкі,
Каб сон гаючы не спяшаў,
Каб не круціў сваёй батлейкі.

Я знаю, што ёй трэба зноў,—
Вярнуцца ў свет майго сталення,
Здалёк зірнуўшы на любоў,
Спазнаўшы ўсе яе адценні.

Дык гэта ж страшна, бог святы,
Чаму ж урэшце так зацята
Пярсцёнак рэжаш залаты,
Адзінае зглуміўшы свята?

Даруй, душа, але з табой
Так доўжыцца цяжкая ночка,
Паслухай сэрцаў перабой
І больш абручкі не надточвай...

* * *

Надзея, надзея, твой бор не радзее,
Пад воблакам кроны гудуць...
А дзень мой астатні,
Ці ён ужо днее,
Ці лёсы адгул мне дадуць?

Тады прагуляю і ўсё, што я маю,
І тое, што мець бы магла,
Каб прагу сваю не забіла сама я,
Не ўзважыўшы сілы крыла.



Адчай страчай усмешкай,
Ману ператрывай.
Гудуць вятры на сцежках
У пекла або ў рай,
А ты не выбірай!

Ідзі, пакуль ідзецца,
Не заглядай у ноч,
Што болем абзавецца...
Куды ж цяпер падзецца?
Стае ўсяго, апроч...

Апроч часіны светлай,
Апроч патолі ў снах,
Апроч густога цвету,
Што выгнала вясна,

Апроч дзіцяці ў хаце,
Апроч спагады з рук...
Адкуль і як прыждаць іх,
Каб сцішыць сэрца грук?

ЗОНА САРДЭЧНАЙ РАДЫЯЦЫІ

Набліжаецца час, калі рысу падводзяць,
Падрахунак пражытых, пяройдзеных год,
І астатні таксама пазначан на сходзе
Са сваёю няўмольнай, як заўтра, бягой.

Лёс жанчынін — надмерныя захады сэрца:
Камень смутку і радасці буйнае смерч.
І ніводнае крыўды не дадзена сцерці,
І нічога жыццё не дало напавер.

Ўсё было: і каханне, і зайздрасць, і мукі,
І агністае сонца лятункаў маіх,
І бяды неадольнай уладныя рукі,
І мізэрнасці, подласці дробнай раі.

А «шагрэнь», ён кароткі, як сон на світанні,
Як нагадка пра шчасце ў юначай красе.
Сэрца выдала ўсё — на гады больш не стане —
І любоў, і нянавісць, і сілы — усе.

Можа, і зарана
Зару зайгралі:
І сонейка села,
А яшчэ б паспела...
Ды ішлі ж мяжою
Муж і жонка, двое,
А дзіцяці не было...
Вось яно й зайшло.

СЭРЦА І РОЗУМ

Маленькі мускул, пульт нябачны,
Рухавічок мае душы,
Ты ўсё стрываў, і ўсё прабачыў,
І ўсё як мае быць рашыў.

Але, знябыўшыся дазвання
Ў трывозе, ў шчасці, у жальбе,
Ты на званіцы б'еш да рання,
І рады я не дам табе.

«Так, як гаворыць тваё сэрца,
Рабі і не ўпадзеш у зман...»
Ці ж можна гэтай мерай мерадь
І, як закон, яе прымаць?

Бывае сэрца з болю глухне
І слепне ад ліхой тугі,
А колькі ж рознай пацярухі
Яго трывожыць берагі?

І з гэтай ношкаю надмернай
Яно за кратамі ў грудзях
Ужо само сабе не верыць,
Не хоча браць на ўласны страх

Ні лёс твой, ні твае прасцягі...

. . . .

Хай розум пакладзе на пульт
Руку цвярозае развагі
І чысты паўнакроўны пульс.



Усцеш мяне, слова, цяплом і спагадай,
Будзь шчодрым, як сонца у бабіна лета,
Бязмежна твая нада мною улада,—
Ты ж ведаеш гэта!

Усцеш мяне, слова, сваім самацветам,
Дзе сонца, і неба, і роснае голле
Зліюцца у фарбах, што дорыш паэтам
З патайным паролем.

Усцеш мяне, слова, сягоння, вось зараз,
Пад поўню прадвесні, пад песню паводкі,
Пакуль за узгоркамі дрэмлецца хмарам,
А сон іх кароткі.

Ты ўдзячных не знаеш, хай буду я першай:
Дыхання твайго пе зглумлю ні расіны
І дзень твой астатні спакутую вершам
Свае Хірасімы.

БЕЗ НАЗВЫ

Каранаваныя хлусы!
Віншую вас! Уладай здрады
Вы сцялі з нівы каласы,
Каб ухапіць сваю прынаду.

Чыесьці вочы гасіць змрок,
Душа заходзіцца ў знямозе,
І анямелы мой радок
Адно хрыпіць і рыфмай грозіць.

А што мы можам? Праўда спіць,
Трызніць няспраўджанай надзеяй,
Калі ж на шлях маны ступіць,
Глядзі, куды нас завядзе ён!

Асілкі падаюць наўкол,
Камлі буйныя пад пагрозай.
...Ужо не вешаюць падкоў,
Каб не ліліся ў хаце слёзы.

А ўвесь жыццёвы каштарыс,
Што быў заўжды сумлення мерай,
Сягоння ён — каптан стары
Сатлелай літасці і веры.

ГУДЗІ, ГУДЗІ НАБАТНА...

Які на адвітанне
Займела ты куток!
Астатняе прыстанне —
За вокнамі каток.

Як прагнула ты дому,
Тады, калі ішла
У боль і невядомасць
Сібірскага жытла.

Часова, ўсё часова,
Зваротнасці няма,
І б'ецца нават слова,
Загнанае ў раман.

Яму там непамысна
Ўсе зманы спасцігаць,
Угадваць па абрысах,
Чым хто гатовы стаць...

Каток мой бела-чорны,
Ад лёду, ад людзей!
І ён так непаўторна
Пад музыку гудзе.

Гудзі, гудзі набатна,
Глушы маю тугу,
Што ўсватаў, стаўшы катам,
Сустрэты на рагу.

Не чэпаная болем
Жыве чыясь душа,
Хай будзе ёй паталяй
Увесь зямны абшар!

* * *

Дзесяць год цішыні, адмаўлення, затоеных
страхаў,
Каб не горш, каб хоць так,
Каб не плакала сэрца ўначы,
Каб ізноў як не ўпасці навослеп, з размаху,
Калі змогі не маеш ні ўстаць, ні ўцячы.

* * *

Адходзь ад сумятні,
Ад злосці адступіся,
Мані сабе, мані
Ва ўласным летапісе.

Менш страшыць будзе зман,
Дзе дол замінаваны,
Дзе маняць, як цыган,
Ад рана і да п'яна.

Дай выбух, не марудзь!
Іду яму настрэчу...
Без правілаў ігру
Не маю чым аспрэчыць...

МАРА

Сысці мне трэба так далёка,
Дзе знікла б крыўда з відавоку,
Каб раптам стаць мне раскаванай,
Па ранах скрозь разбінтаванай,
Дыхнуць так глыбака, так страсна,
На ўвесь цэйтнот мой, рэшту часу,
На ўсе хвіліны даастатку,
На ўсе нязлічаныя страты,—
Дыхнуць і ўпасці там, далёка,
Дзе ўсё знікае з відавоку.

ЛЯЎША

Калі душа — ляўша,
Не наракай на неба,
Яго сівы абшар
Сцябла не вырве з глебы.

Яно пратне пласты
Варожасці ды злосці,
І зашумяць лісты
Зялёнай маладосцю.

Хай будзе не з рукі
Ім намнажаць праменне,
З крынічнай піць ракі,
Дужэць парой сталення,

Ды хоць не зыркі цвет
З пагоднага павеву,
А знойдзе свой букет
Квітнеючае дрэва.

Адно запрагне больш,
Чым дадзена істоце,
Зазнаўшы скрутны боль
І па вясельшай ноце.

Бо з кананады дзёп,
Гуллівых і агністых,
Яму будзе чуцёп
Па сэрцы кожны выстрал.

ПАДАЮЦЬ З СЭРЦА РАДКІ...

Жнівеньскі смутак густы
Пад зааблочаным небам,
Падаюць з яблынь лісты —
Скаргі да восені немай.

Гэта мае сваякі,
Жалем нам звыкла дзяліцца —
Падаюць з сэрца радкі,
Жоўкнуць, як з бору ігліца.

Боль мой, ты ўрэшце маўчыш,
Сціх у асенняй лагодзе,
Толькі каб як не ўрачы
Той сціхаты на адходзе.

Ды спадзяванняў душа
Сварыцца з гэткім спакоем:
Зноў будзе сэрца змушаць
Біцца да смертнага бою.

ЛАТЫНЬ

Здалося мне, нібыта святам,
Што падхарошвае твой свет,
На чыстай мове — alma mater [1]
Павінен гаварыць паэт.

Чаму яна ў нас занядбанай
Сышла гасцінцамі ў нябыт,
Хоць кожны музамі абраны
Не абмінуў яе арбіт?

Хай бы жыло раскашаванне
Яе прастораў гукавых,
Афарыстычнае гучанне,
Крылатых выказаў правы.

In crudo [2] ўсё, што дзеля люду:
Сумленне, сонца, пачуццё
І тое, што ў душы здабуду,
Яе не ранячы асцём.

Вясна in crudo, боль in crudo,
Вады крынічнай светлы ўсплёск,—
За ўсё плаці не срэбным скуда,
А тым, што вылічыць твой лёс.

Плаці за ранак адзіхцелы,
За любасць, што з табой жыла,
За свет, пакуль яшчэ ён белы,—
Імгла са свету не звяла.

---

[1] Маці карміцелька.
[2] У арыгінале, у чыстым выглядзе.

Плаці, плаці душы бяссоннем
І апантанасцю ліхой.
Яшчэ крычыць жыццё: «Па конях»,
І за яго ты мкнешся ў бой.

ПАД НОВЫ ГОД

Быть без сердца — мечта!
Андрэй Вазнясенскі

У сабе насіць стыхію,
На сябе прымаць агонь...
Сэрца! Чуеце, глухія,
Несціханы звон яго?

Не падолець, не пазбыцца,
Не сысці ў далёкі свет:
Будзе біцца, як тыгрыца,
Каб на вострае узбіцца,
Каб ізноў крывавіць след.

Хто зайздроснай сціхатою
Збег з дзяржавы гэтай прэч
У краіну супакою,
Дзе ні згадкі, ні сустрэч.

Ты, ці я, ці той здатнейшы,
Што не знаецца з тугой,
У каго змярканні з гейшай
І не паліцца агонь...

Сэрца, сэрца! Гэта скерца
Не таймуецца вякі:
У расхістаныя дзверцы
Рвецца вецер ад ракі,
І, як злодзеі, радкі
Падкрадаюцца з-за весніц,
Там, дзе свеціцца акно,
І над ім халодны месяц
Прэпарыруе кіно.
Зноў без паузы мантаж
І ў вітраж глядзіць міраж...

Хто ж дамогся, здзейсніў мару —
Сэрца выхапіць з грудзін? —
Нават старасць, нават старасць
Звон той золкам абудзіў.

Горне боль і горне смуткі,
І трывозе след у след
Прагне, мкнецца суткі ў суткі,
Падстаўляючы страле
І аблуду, і нявер'е,
І ману на ўвесь прасцяг.

Пачуццё згубіла меру,
Пачуццё, як скварку скверацць
Для нязванага гасця.

Поле, поле, твая воля,
Водар сцежак, спеў жаўны...
Крок у шчасце запаволен,
І радок пашыт з маны.

Здрада, здрада, ты не рада,
Ты цураешся святла?
Пачынаюцца каляды,
Елкі губяць у прысадах,
След завея замяла...

Новы год рыхтуе стрэчы,
Сэрца, звону ашчадзі!
Ты, шчаслівая малеча,
Боль з дарогі адвядзі.

МОЙ ЛЕС

Мой лёс узрос не з цёплых рос,—
Ён долі матчынай аскепак:
На золку, прагнучы нябёс,
Узгадаваны між свірэпы.

Але ж за тое знаў ён смак
Той battle of life [1], яе узлёты,
Хай быў ён з дзівакоў дзівак
І донкіхотавы сваяк,
Б'ючыся з дробяззю і слотай.

І прасачыць мог след у след,
Пазнаць здалёк, адчуць з пагляду,
Дзе будзе рэчышча мялець
І дзе падробка пад спагаду.

Злічыўшы ўжо мае гады,
Дзянькі, магчыма, падбіваеш...
Мой лёс! Яшчэ ты малады,
Калі пра літасць забываеш.

---

[1] Бой за жыццё *(англ.)*.

БЯРУ НАДЗЕЮ ЗА РУКУ...

Глынула раніцы глыток
І ўжо шчаслівая нібыта,
І неабжыты мой куток
Павевам свежасці прамыты.

Бяру надзею за руку,
І мы ідзём уздоўж вазёраў,
Сядзіць ваверка на суку,
І птах мігціцца жаўтапёры.

Няшчодрым сонцам зорыць шлях
Зіма, пачатая заўчасна,
Са мной чужы ты дзеліш дах
І боль таксама — мой і ўласны,

Не знаю, што у гэтым ёсць —
Павеў цяпла ў начы вятрыстай,
Ці наша скнара-маладосць
Здалёк махнула яркім лістам.

ВЕРТАЛЁТ

Ва ўсёй прасторы і красе
Паўстала слава для дзіцяці:
І на крылах яго нясе
У сад жыцця свайго — да маці.

Там спее ўсё, чым дуж малы,
Ад сцяблінь да чалавека,
Салодкі яблык і палын,
Усіх карэнняў пах і млека.

Пакуль жыве праменны сад,
Усмешка лашчыць вусны сына,
І казка спіць у верасах,
І грыб хінецца да асінак.

Дый шлях за брамкаю відзён,
Яшчэ не важаны трывогай,
І куст каліны так чырвон,
Як сонца захад на нарогах.

Гудзе над хатай верталёт,—
Буйная казачная птушка,
Сын прадчувае сэрца ўзлёт,
А ў небе след віецца стужкай.

І акрылёная душа
Шчыміць нязнаным узрушэннем:
Дзіця трапляе ў дзіўны шал
Пад вышыні рухавым ценем.

— *Там верталёт,*— гаворыць сын,—
Там ветралёт — крычыць ён моцна,—
І адгукаюцца лясы
І галасы касмічных лоцый.

— *Там ветралёт?* — пытае ён
Вачамі, вуснамі, дыханнем.
І слова бомкае, як звон,
Нібыта знаў яго здавён,
Пазнаў на сэрцавым экране.

Расхваляваная душа,
Малая светлая істота!
Крылаты бог цябе змушаў
Парваць усіхную самоту.

Спыніць мяне, спыніць яго,
Даверыць нам такое дзіва,
Што з вышынёвых берагоў
Плыве павабна і шчасліва.

І я, бадай упершыню,
Паветра чую калыванне,
Наяве сына свайго сню,
Маё з ім разам існаванне.

Струмені шчасця, як трава,
П'ю з воч захопленых малога,
Што поўні гэтай не стрываў —
На аднаго было замнога.

ВЕЦЕР

Б'ецца ў вокны скваппы вецер,
Аблягае дом і сад,
І разгойданае вецце,
Як развітая каса.

Так стаіць, дрыжыць дзяўчына
На пагорку, на юры,
Тонкі волас павуцінай
Вочы мілыя накрыў.

Дакранаецца рукою,
Адкідае светлы сноп,
Ды няма, няма спакою —
Б'е віхура ў чысты лоб.

Ночка, ночка, на паўвочка
Дрэмлеш ты, але не спіш:
Вобмаль дадзена гадочкаў
На бясклопатную ціш,

Ды і тую бомбай трушчаць,
У імя дабра нібы...
Толькі досвіткам, у пушчы,
Можна *ціха* браць грыбы.

ПАБЫВАЎ У РАІ

Мой смутак сябе перарос,
Як гонкая хвоя між пушчы,—
З зямлі ён відзён і з нябёс,
Дый сам не сляпы, а відушчы.

Аблічча здаўна ён таіў,
А зараз лагодзіцца вока:
Ці ён пабываў у раі,
Ці змогся ў сваіх Налібоках.

І ростані як не было,
У твар углядаюся зблізку:
Высокае гэта чало
Знаёма мне кожнаю рыскай.

Праходзілі разам вякі,
Мінаючы змрочныя светы,
Да мэты ішлі нацянькі,
Чапляючыся за каметы.

А сэрца... Адно цеплыні,
Адно вымагала — спагады!
Ты, ў новым абліччы,— зірні
І дай яму, беднаму, рады.

МЫ НЕ СХАПІЛІ ЗА РУКУ

Ахаяць стол, паспратваць думкі,
Пакласці рыфмы пад руку,
Нататкі павытрэсаць з сумкі,
Клаксонам даць сігнал радку.

Тады пачне жыццё паэма —
Тварыла ёсць, і будзе твор —
Не з бору сосны і не схема,
Не толькі сённяшняя тэма,
А ліра-драматычны ўзор.

Культура мовы як аснова,
Жывыя постаці людзей,
І, як запэўніла прадмова,—
Высокі гарт саміх ідэй.

У спрэчцы стрыманых калізій
Сталее талент мастака:
Старая Муза не капрызіць
І не калоціцца рука.

Бягуць радкі, за рыфмай рыфма,
Метафара не траціць след,
Хоць часам сэнс ніби пад грыфам,
Ды гэта аўтарскі сакрэт.

А так — глытаецца аповесць
Ці то паэма для душы,
Такая шчыраванькая споведзь
Сваяі і тых, хто награшыў.

Ніхто не каецца, вядома,
Твор услаўляе зорны час
Той непаўторнай ідыёмай,
Неперакладзенай для нас.

Мы разумеем і даруем,
Не ўсё дазволена радку:
Хоць аўтар праўдай ахвяруе,
Мы не схапілі за руку.



Я не з анёльскіх вітражоў
І не з евангельскага неба —
Мне ў сэрца ўдарылі нажом,
І расквітацца ёсць патрэба.

Але мінуўшчыны рака
Зіхціцца хвалямі юнацтва,
Хіба падымецца рука
На мову дзіўную смыка,
Што ў гуках тут магла застацца.

Не засталася. Усё маўчыць,
Заціяла вусны мілай музе,
Яна, ў рачулцы плывучы,
Яшчэ фарватар свой абвузіць.

І мне ўжо болей не міргне,
Зашмат гадоў чакала цудаў.
Плыву я ў тым жа мулкім сне:
Дадому тысяча ганей,
Але палон і там не збуду.

АКРЫЯННЕ

У лёгкіх няма запалення,
Гарачкі згасаюць агні,
Закрыліся ўсе бюлетэні,
Падлічаны хворасці дні.

А сэрца? Якою цаною
Яно пачынае свой бой
З застоямі і сухастоем,
З сабою і нават з табой.

Зялёнае вымкнула веццe,
Высока, бадай да аблок,
Трывожна і ў леце, і ў свеце,
Ды смешна галёкаюць дзеці,
І іх пераймае радок.

МАНА

Маніць, маніць, каб апраўдацца,
Каб лепшым некаму здавацца,
Каб Эверэстам узвышацца,
А пад гарою аблачына,
Растаўшы, падае слязінай —
Адна маленькая патрата,
Як валасінка для чубатых.

Маніць, маніць, як лёгка гэта,
Лягчэй, чым верш злажыць паэту.
Бывае часам блытаніна,
Калі ўпляцецца ў зман жанчына,
А так каўтаецца няпраўда,
Не б'ецца праўда з ёй на раўндах,
Не ломіць рэбраў, ані сківі̇ц...
Нікога, ўрэшце, і не дзівіць.

БЕЗ ВЕРША

Дзень без верша, як сляпы,—
Вобмацкам у тлуме вуліц,
Абмінае ён слупы,
А яны якраз і туляць.

Белы голуб не відзён,
Не зардзелася заранка,—
Толькі сон, дрымотны сон
За сутонлівай фіранкай.

Дзе ж ты, братачка радок,
Ці ты снегам зацярушан,
Ці хіснуўся недзе ў бок
Ад мае ліхой уструшні?

Дзе б ні быў — вяртайся ў дом,
Невысокі дый не нізкі,
Не кідай яго на злом,
Бо ўжо ростань наша блізка.



Па мілай краіне ісці адзінотна
І, сэрца аддаўшы вятрам,
Адчуць у спакоі, істотай дрымотнай,
Як зырка згарэла зара.

Надыхацца даллю, бязболевым жалем.
Збалелай дарэшты душы,—
Няхай ахінецца ласкавейшым шалем —
Вятрамі на сіняй шашы.

Па мілай краіне ісці адзінотна,
Без песні і скаргаў сівых,—
Удалечы сцёрты ўсе фарбы з палотнаў,
Адзін толькі воблік жывы.

ШТО ЯШЧЭ?

На парозе вызвалення
Ты мяне дагнала болем,
Той тугой аб незваротным,
Што не ведае паталі,
Лёсам зраненым ушчэнт...

Што табе, любоў, яшчэ?



Мы забываем словы —
Якія яны ёсць.
Гучыць адно — прадмова,
Як наша маладосць.

Не трэба аглядацца,
Бо і на тым шляху
Не чулі мы авацый,
Дый воплескаў — крыху.

А ці яны патрэбны,
Каб чалавек сталеў,
Каб піў ён з кубкаў срэбных,
Як госць у каралеў.

У сонечнае ранне
Павінен ён ступіць,
Як радасці абраннік,
Адно праменне піць.

Але чым болей смага,
Тым менш стае крыніц,
Састáрала біклага,
І чад ідзе з газніц.

Цьмянеюць адвячоркі,
Хоць вокны ў снезе спрэс.
На яблыні вавёрка,
А за сядзібай лес.

Мы забываем словы —
Якія яны ёсць,
Мы слухаем абмовы,
Калі звяглівы госць.

Ён маладзей за век наш,
На слова не скупы,
I з выгляду ён лепшы,
Ды мае нож тупы.

Ён кроіць ім той бохан,
Што выпекла нам печ.
Усім дае патроху —
Хоць мала — не пярэч.

АСТАТНІ РАЗ...

А як ішлося б па даліне,
Па лузе, па лясной сцяжыне,
Па наваколлі успамінаў,
Праз вёскі, хатачкі, адрыны,
Праз цэлы свет разбудаваны,
Табе на дзень, на два адданы,
Каб ты пастукалася ў дзверы
І голас маці, неймаверны,
Адзіны голас на ўсім свеце,
Як цёплы вецер у наквецці,
Зноў ахінуў цябе пяшчотай,
Астатні раз прарваў нямоту...

ЧАРНАВІКІ ДУШЫ

Аркадзю Куляшову

Чарнавікі душы ніхто не перабеліць.
Пішы, жыццё, пішы.
Рукамі варушы,
Пакуль не падубелі.

Гартаюцца лісты, ссыпаецца лістота,
А ты — хіба не ты і не твая істота:
Сягоння там смыліць, дзе прамянела ўчора,
Ці ж гэта мы калісь так пагарджалі горам?

Чарнавікі душы ніхто не перабеліць,
Пішы, жыццё, пішы — мы ўсё перахварэлі:
І ганьбу, і любоў, і здрадныя часіны,
І зараснікі сноў, і радасці радзіны.

Чаго яшчэ жадаць, працягваючы рукі?
Яшчэ таго ж, бадай, але без гэткай мукі.



Як? Жыць з пяра — пісаць на друк?—
Я з тых, што не пускаюць з рук
Жмут споведзі, скразняк душы.
Не можаш не пісаць — пішы,
Ды ўсчаўшы з гукамі гульню,
Хіба смыком не станеш ты,
Хіба ты вернешся да тых
Вясёлых злыдняў і манюк?

Не можаш не пісаць — пішы,
Касцёр быццё падварушы,
Няхай уздымецца агонь
Да скаржанелых тых багоў,
Што запальнічкі не знайшлі,
І сцюжа выдзьмула Алімп.

Тваё пісанне не тавар,
Не ў пáру творыкам няздар,
Яно, як кажуць, для душы:
Не можаш не пісаць — пішы,
Вось толькі фальшам не грашы.

ІЛЮЗІІ

Ілюзіі, ілюзіі! —
Як вы душу абвузілі,
Як вы сусвет пашырылі
У вандраванні з ліраю.

Ці ж хітравацъ з развагаю,
Дзяліць журбу з адвагаю,
Жыць на пазычкі скнарыя,
На марнай мары варыве?!

Лепш хай жыве ілюзія!
Сама з яе дзіўлюся я:
Не ўкараніўшы парастка,
Ніхто ж бы не папарыўся.

А вось цвіце і барвіцца,
Гульнёю з сэрцам бавіцца,
А як з дажджоў заводарыць,
Дык водзіць сэрца ходарам.

ТЭЛЕПАТЫЧНЫЯ РАЗГАДКІ

Ты чуеш, як шасціць мана,
Як ад выпадку да выпадку
Яна наскрозь табе чутна
І дамагаецца разгадкі.

Яшчэ і родзіць рэха ў доме,
Дзе ты жывеш, нібы плывеш
На бераг той, як на пароме,
Вяслом тугім па хвалі б'еш.

Плыві, плыві, праворвай глыбі
Маўклівай радасці быцця!
Ужо цяпер хіба не схібіш —
Малы адмераны прасцяг.

Дайсці б, дабегчы без парома,
Ды хвошча дождж такой маны,
Што ў тумане не знойдзеш стромы,
Адкуль прыстанкі ўсе відны.

Ах, як там весела, як гола —
Ні авантур, ні кашалёў,—
Адно гучыць матулін голас
З-за апрамененых палёў.

Час адпачынку для жанчыны:
Паклаўшы голаў на руку,
Прысні без болю на хвіліну,
Пакуль пераплывеш раку.

Адна на свет увесь вялікі,
На зорны свет і на вякі,
І ўсе завершаны разлікі...
Жывіце, спеўныя радкі.

НАЧНОЕ СОНЦА

Маладзік плыве за хмарамі,
Вызваляючыся з пут
Аблачынак абцяжараных,
Як раскрыты парашут.

А ў блакіце неазмрочаным,
Там, дзе зорнае шытво,
Шляхам ён плыве скарочаным,—
Летняй ночы хараством.

Усміхаецца ды каецца,
Што забавіўся плысці
У наш край, дзе пачынаецца
І ніколі не канчаецца
Вышыня ў яго жыцці.

Усміхнуўшыся па-змоўніцку
Ці то ночцы, ці то мне,
Зноў плыве па сіняй роўніцы,
Як па сэрцавай струне.

Што гучыць у ёй — ці музыка,
Ці нявызнаны парыў?
Ён не знаецца ні з музамі,
Ні з паважнымі журы.

Яму смешна, што там журыцца
Неўтаймоўная душа,—
Ён плыве нябеснай вуліцай,
Асвятляе земны шар.

АСЦЯРОЖНА — ГРЫП!

Так хворасць рыфмы скасавала,
Што проза просіцца да рук,
А ёй жа ўсё здаецца мала,
Абы скарылася пяру.

Дык пацярпіце вы, радочкі,
Крыяйце добра на вясне
І снегу свежыя прымочкі
На бровы пакладзіце мне.

Яшчэ гарыць чало ад рання
І снег на скронях растае.
Дзень падымаецца ў тумане,
А сны вясны трызняцца мне.

Такія сны! Неверагодна! —
Яшчэ і мары ажылі...
Абы не грыпавала годнасць,
Яе са свету не звялі...

Наўкола вірусы, паліпы,
Няма дзе ўпасці і радку...
Няхай хутчэй бяруцца ліпы
Лістоту гнаць у халадку.

Такія сны! Неверагодна!
І грып стварае дзіўны свет —
Ён нібы твой і чужародны,
Гарачкай моцнаю угрэт.



Ізноў такі ж спякотны дзень,
Шчаслівы і няўцешны,
Ён повен сэрцавых падзей,
Няўцямных, пэўне, для людзей
І, можа, нават смешных.

Ды не скасуе іх нішто —
Ні холад, ні развага:
Надарыўся такі суток,
Як непратораны вiток —
Вясны паўночнай сага.

Дык памаўчы цяпер, радок,—
Яе тут перавага!

ЗАМОВА

Замовай, слова, будзь чысцейшае
І ад нягоды затулі
Маю любоў, што ўсё расце яшчэ,
Пакуль мы разам на зямлі.

Карэннямі душа аплецена,
Каб ростань сцягвала вузлы,—
Смыляць тады старыя меціны
Для дрэва згубнай амялы.

Дзень, даляглядамі народжаны,
Скідае коўдру шэрых сноў,
Ідзе да вокнаў насцярожана —
І пачынае ўсё нанова.

* * *

> Сожгла леса Аленушка
> На тыщу верст до пенушка.
>
> *Бунін*

Гады бяды ішлі мы поруч,
А воддаль цень валокся злы,
Раджаліся і мерклі зоры,
Ды зноў праблісквалі з імглы.

Завеі, зімы, водар вёснаў,
Вандроўны шлях, няпэўны дах
Гучалі музыкай дзівоснай,
Калераваліся ў вачах.

А цень змяняў свае пастаці —
То цёмнай хмарай наплываў,
То рысы здрадлівасці траціў,
То паніжаўся, як трава.

Не зналі мы, якою сілай,
Якой бязлітаснай рукой
Ён вынішчае дзівасілы,
Што там на пойме за ракой.

А цень як цень,
Ён гасіць дзень,
Ён ладзіць зноў гульню без правіл:
Нас разлучае авадзень —
Я йду налева, ты направа.

Каб адкасацца ўсіх назол,
Заўжды кусачых ненажэраў,
Я свой адшукваю атол,
А ты сцігуеш за хімерай.

ЗАБОЙЧАЯ МАНА

Забойчых слоў ты повен, свет,
І мы на іх не маем рады,
У грудзі цэляць, як кастэт,
Пад здрадным выглядам спагады.

Плюскоча ў свеце гамана
На мовах знаных і нячутых,
Плыве падступная мана
Перасалоджанай атрутай.

Якія вынаходкі слоў
У шчыльных строяцца кагортах!
Аднак мізэрны іх улоў:
Не вераць людзі богу й чорту!

Смяюцца ў вочы ілгунам
І вушы закладаюць ватай,
Але забойчая мана
Зноў раздзімаецца пасатам.

Хай зрынецца яна на тых,
Хто, азвярэлы ад набыткаў,
Пазашываў бы ўсе раты
Барацьбітам і барацьбіткам.

Так дзеецца у тым раі,
Куды склікаюць люд са свету,
Дзе хваляцца быццём сваім,
Дзе здрада й гвалт
На сцягі ўздзеты,

НА ГОЛАС ЧАЛАВЕЧЫ

Не мелася я скардзіцца нікому,
Што сэрца не даруе мне тугі,
Ні далечы да выснецага дому,
Ні лёсу, што ўсырычылі багі,

А слова, уціскаючы мне плечы,
Паводкаю заліўшы берагі,
На голас падалося чалавечы...
І сціхлі ўсе варожыя багі.

КАЛІ АЦІХНЕШ ТЫ, ДУША...

1

А лёс мой дзівіцца з мяне:
Якая ўпартая людзіна,—
На глыбі летаў не тане
І ўсё мінае дамавіну.

Абы спачын,— без дай прычын
Гукае музу рыфмавання
І, ёй ахвяры несучы,
Ідзе ў страі свайго змагання.

Калі аціхнеш ты, душа,
Калі, ўхапіўшыся за біла,
Рассыплеш вершы ўсе з каша,
Што за жыццё намалаціла?

2

І чамусьці той часінай,
Калі ціхне тлумны свет,
Слухаць сэрцы я павінна
З прыназемленых камет.

Яны б'юцца і таўкуцца
У сусветавай імжы,
Мне да іх не дакрануцца
У няўпынным віражы.

Але чую, як віруе,
Як журлівіцца душа...

Час, што смуткі замуруе,
Я не буду прысппяшаць.

Бо ізноў жа той часінай,
Калі ціхне тлумны свет,
Чую клёкат жураўліны
І лагоджу боль камет.

ЧУТНЫ ГОЛАС

Зняверыўшыся сто разоў,
Ізноў паверыш спагаданню,
Хоць будзе зман на той жа ўзор
І тым жа чыстым вокам гляне.

Душа, душа! Яе абшар —
Усёй планеты спадзяванні,
Прысуд выносіць не спяшай,
Як і прысяжных апраўданне.

Душа вердыктамі тугі
Сама сябе навек асудзіць,
І тыя карныя кругі
Яе і выведуць у людзі.

Ёй ведама, чаго табе
За дваста год жыцця не вызнаць,—
У чыстых смутках і ў журбе
Не строіцца яна ні ў рызы,

Ні ў снегавых вяршынь святло,
Ні ў краскі з лугавін альпійскіх,
Ні ў ружаватае крыло
Славутых чаек з-пад Нарыльска.

Абы было, абы жыло,
Чым лёс з малепства узбагачан:
Людзей вялікае сяло
І голас чутны, голас матчын.



Такой вясной, такім змярканнем,
Калі наводараны свет
Гучыць, як першае прызнанне
І як астатні запавет,—

Хачу сказаць табе —
шчасліва!
Ідзі і сэрцу давядзі,
Якое можа стацца дзіва
Ад бессмяротнага парыву,
Што тут юнацтва абудзіў.

Раптоўны ўдар. Маланка ў вочы,
І распасцерлася душа
На белых крылах весняй ночы,
На ўвесь пялёсткавы абшар.

Я тут стаю ў ружовым вецці,
Нібыта сто гадоў назад,
І мы спраўляем паўналецце,
А з неба коціцца сляза.

СМУТКІ

Ах, смуткі, смуткі, колькі з вас
Расце адвагі пачуццёвай —
Той моцы — ўсё пературваць,
Той змогі — ўсё пачаць нанова.

Перакідаючы за плот,
Далей ад сэрцавай сядзібы,
Усё, што ўчора навылёт
Душу тваю прабіла нібы,

Ты пачынаеш ранне зноў,
Без падрахункаў, без крыўдоты,
Усведамляючы адно:
Спачатку літасць,
сіла — потым.

БЕЗ ПАДРАХУНКАЎ...

Маўклівы дзень. Без ветру, без развag,
Без надужання ў стамлёным слове,
Без падрахункаў, хто і колькі варт
На прыкрай, на гандлярскай мове.

Маўклівы дзень. Без светлага радка,
Што пагадзіў бы ранак з адвячоркам,
Без тэлефоннага твайго званка
З трывожнай насцярожанай гаворкай.

Маўклівы дзень. Без песні за акном,
Без смеху развяселенай суседкі,
Без музыкі ў паркавым кіно
І без майго адчаю сведкі.

ТУГА

Дождж прыбіў маю тугу,
А, змакрэўшы да рубіны,
Яна страціла вагу,
Выгнула катóву спіну.

Часта ў злосці мы жывем —
Поруч ганкі, поруч сцежкі —
Хто ж управіцца жвавей:
Жыцьме ці памрэ усмешка?

Даняла туга мяне...
Сонца, зоры, будзьце сведкі!
Дзень пры дні і ў мулкім сне
Нішчыць сэрцавы палеткі.

Насланнё гэта ці гвалт
Некай чорнай згубнай сілы...
Хто б дасюль яе трываў,
Каб не грэбаваў магілай.

ДЗЯЎЧЫНКА

— Я знаю, чаго я плачу,— дзяўчынка
сказала лесу,
І ён зразумеў адразу, дыхнуў цеплынёю хвой,
Расінкі павевам лёгкім з павек завільжэлых
стрэсаў
І нешта шамрэў ласкава, на вуха шаптаў малой.

Іх цяжка пазнаць і змерыць, згрызоты
душы дзіцячай,
У тлуме жыцця, у стоме не згледзіць
і матчын зрок.

— Не знаю, чаго ты плачаш?!
— Я знаю, чаго я плачу...
Самотніца! Ўжо трымае маўчання святы зарок.

ДОМА

Я цябе абмінаю, жыццё,
Абыходжу твaё наваколле,
Дзе зласліва ўладарыць асцё,
Раскашуе жыгучка на волі.

Тут дзядоўнік спыняе мяне,
За крысо пацягнуўшы балюча,
Але словам ніхто не кране
І не ўдарыць ганьбоўным сугуччам.



Самападман, самападман —
Душа хаваецца у спраты,—
Яна не ведае сама,
Чым збеднена і чым багата.

Хіба праявіць гэта змрок
Бяссоннем злым ці абуджэннем,
І, не адвёўшы вочы ўбок,
Яе ты ўбачыш на імгненне:

Шырокі выярчыць экран,
Як зранку чыста прыбіраюць,—
Каб знешні свет не меў заган,
Душу старанна вымятаюць.

ВЕРШЫ

Дзе толькі ні пішуцца вершы! —
На сходах бальнічнай чаргі,—
А там ты апошні ці першы,
Не вызначаць нават багі.

У лесе, вясёлым і хмарным,
Дзе ціўкне ўстрывожаны птах,
І ты разам з ім між выгарын
Гатова пяяць у кустах.

Цягнік падкідае на рэйках,
А ўдалечы снежыць Сібір,—
На шапцы, на скронях, на вейках
Бялюткі, мяцелічны вір.

Змагаюся з ветрам радкамі,
Духі забівае пурга,
Мой лёс узмахне ветракамі,
Ды зноўку заслепіць імга.

Ці гэта было, ці сасніўшы
Парою трывожнай тугі,
Дасюль пад трызнёю калішняй
Брыду на свае берагі.

Дзе толькі ні пішуцца вершы
Ці шэпчуцца ў сэрцы ў мяне,
А колькі іх страчана змерзлых
У праламцы недзе, на дне.

СНЕЖНАЕ ПОЛЕ

Снегам засыпаны снежань,
Смутак завеіны, бязмежны.
Мне ён належыць.
Чым перабіць?
Як перабыць,
Крок разняволіць?

Падае сэрца паволі.
Чыстае снежнае поле.
Хочацца жыць,
Не *канчаецца* доля.

* * *

Так, акіян жыцця малога
Свае глыбіні доўга тоіць,
Ды, зрэшты, зруйнавана Троя,
Што ад твайго ішла парога.

Але не будзе больш пачатку
Мае дарогі заімшэлай,—
Адно пашэпчамся з асадкай
Пад гукі Шырмавай капэлы.

ВЯСНА ЗІРНУЛА НАМ У ТВАР


І ўсё, па сляце. Сціхла хата,
Адно гадзіннікавы бой...
А сэрца дыхае, як кратэр,—
Штуршок, як шок,— і перабой.

Давай, радок, яго ўгаворым:
Вясна зірнула нам у твар,
А нам вядомы вёснаў нораў —
Перад усім глядзець папар.

І прыйдзе час, ён не міне нас —
Карэнне віты пойдзе ў рост,
І мужны голас, як сірэна,
Гукне цябе на твой фарпост.

Вясна дажджоў, вясна праменняў,
Вясна пралескі, сініх сноў,
Яна ідзе, як вызваленне
Ад завірушных кажаноў.

Дык ці рэзон так сэрцу біцца,
Нібы ў ім спее землятрус?
Вясновых кропель дай, сястрыца,
І чысты засцялі абрус.



Цябе звалі стрынаткай,
Што лунала над хаткай.
У дзяўчынкі бялявай,
Без таткі, без маткі,
Толькі сінь-вачаняткі
Ды зграбнота паставы.
Ты ўцякала з нядолі,
Што дзесь рыхтавалі,
Ты была нейчым болем
І шчасцем, што ўкралі,
Дзверы знаді твой вечар,
Спачын твой і смутак,
Адчынялі настрэчу
Твой горкі закутак.

Як гаруецца слёзна
З тваіх адыходзін,
І ці рана ці позна,
Пры кожнай нагодзе...

Так, аглухшы, аслепшы,
Пражылі два дзесяткі,
Можа, самых найлепшых,
Са сваёю стрынаткай,
І сястрою і другам
Ты была мне ў нядолі...

Зацвітаючым лугам
Мы беглі на волю...
Ды яе не заспелі
Ні дома, ні ў прочках:
Будзем спаць, як засцелюць
Самотныя ночкі.

ВОЗЕРА

Мастачыць захад на вадзе
Ці залатое Каларада,
Ці тую сцежку, што вядзе
У неабуджаную радасць.

А ты, ці знала ты калі,
Што ўсё ж была наканавана
Табе тут радасць на зямлі,
Усім на шчасце дараванай.

Яшчэ гараць твае сляды
На мігатлівай аблачыне,
Што выпараецца з вады,
Каб зноў плысці блакітнай плынню.

І зноўку падаць з вышыні,
На глебу родную патрапіць:
Яшчэ не згашаны агні,—
Спакойна кроч па гэтым трапе.

ПАДРОБКІ

Словы, словы — аковы мае і прыгон!
На сябе дайце глянуць з аддалі:
Трэба ўсім нам дыстанцыі строгі закон,
Каб падробкі ў жыцці нас міналі.

Падрабляецца ўсмешка, сляза і агонь,
І мастацтва падробкамі скута:
Калі сад атрасае пялёсткі з півонь,
Нацюрморт гэта альбо пакута?

І, магчыма, самота мая спакваля
Пачала падрабляцца пад драму.
Дайце мне на сябе збоку кінуць пагляд,
Ці мяне падрабілі таксама?!

І ТОЛЬКІ ГЛЫТАЙ УСПАМІНЫ...

Надыходзіць пара выслаўлення
Таго, што замкнута ў душы,
І ты перад ёй на каленях
Зарокі даеш не грашыць.

А грэх не арэх, не расколеш,
Не знаючы — вырас на чым,
Якое было наваколле
І хто яго так падсмачыў.

Грашы, але каяцца смешна —
І памяць смяецца ўдвая:
Салодкая ў садзе чарэшня,
Адно, што яна не твая.

І толькі глытай успаміны:
Ні саду, ні дрэва ў раі,
Ні белай галіны язміну,
Ні сцежкі, дзе цесна ўтраіх.

Замкнута ў душы ці адкрыта,—
Няма тут чаго выслаўляць,
Адно недасведчаны крытык
Пытальнікі будзе стаўляць.

МОВА СЕНТЫМЕНТАЛЬНАЯ

Не меўшы дому доўгі час,
Я так люблю свой кут,
Адкуль пачаўся мой прычал
І дах майму радку.

Ад'едуся, і мне карціць
Зноў апынуцца там,
Сваім ключом *свой* дом адкрыць
І увайсці у храм.

А на парозе пачакаць,
Каб абняло святло,
Каб вокам бліснула рака
У вока мне праз шкло.

Тут прачакаліся радкі
У шафе і ў стале,
Тут намнажаюцца гадкі
З адзнакай на чале.

Жывуць затоеныя дні,
Што руйнавалі дом,
Гасілі сэрцавы агні
Чужым ліхім крылом.

Зацерусілі іх снягі,
Змяла тады пурга,
І уратоўчыя багі
Пасталі наўкруга.

Яны жывуць са мной дасюль —
Бог скрухі, смуткаў бог:
Асцерагаючы ад куль,
Як выйду за парог.

ЯКІ Ж ГЭТА ЗЛОМАК...

Бязладна ганяючы хмару за хмарай,
Здарожыўся вецер, у садзе аціх.
Я дум не спарадкую вечарам шарым,
Ліецца патока, хоць кладкі масці.

Чаго не нагоніць рака адзіноты,
Як хваля у бераг усходзіцца біць:
Нясе шумавінне, прыгадак згрызоты,
Да хвілі астатняй не змыць іх, не збыць.

Які ж гэта зломак усё так знявечыў,
На гоні маленства наслаў сухавей
І ганьбай прыгорбіў юначыя плечы
У саменькім росквіце зыркіх надзей?!

Прыснуў недзе вецер, і хмары застылі,
У безладзі думак не збуду тугі,
Яна ўжо не тая, што сцежкай кавыльнай
За мною імкнула амаль без вагі.

Састарала моцна туга мая злая...
Ці ж сэрца якое мінаеш калі,
Ці грэешся толькі, як дзе запалае,
Шчыруючы потым — стаптаць і заліць?

СЭРЦА

Дурное, няўрымснае сэрца! —
Табе ўсё чагось не стае:
І ўцеха табе не па мерцы,
І дождж са слязінаю лье.
Глухое да ўсякай развагі,
Да ўшчунку цвярозых часін,
Не ведаеш межаў адвагі,
Не ўсочыш і здрадніцкіх мін.
Чаму ж бы, чаму ж бы без болю
Табе не прабегчы свой шлях! —
А ты ўсё дзяўбеш у забоі,
Каб недзе агонь не ачах.
Дый путы, дый путы пакуты,
Штогоду яны трывалей,
Нянова такая прыкутасць —
Жыве Праметэй на скале!
Нас губіць яго несмяротнасць,
Рве сэрцы жалезны звянчак...
А там, на касмічных узлётах,
Ці гэтак жа тужыць зямляк?
Альбо ад зямлі адарванасць —
Ратунак ад сэрцавых мук?
Ды земнай дзяржавы падданых
Не выхапіць з матчыных рук.
Карэнне ўрасло і ў каменне,
Прабіўшы металаў пласты,
Карэнне і ёсць прыцягненне
Да матчыных нівак святых.
А сэрцавы, сэрцавы путы,
Пакуль ты жывеш, не парвеш,
Хіба з выбуховых салютаў,
Аглухшы, заснеш у траве.



На мове, далёка не кроўнай,
Гаворыць з табою вясна,
Нібы пераклад падрадкоўны
Табе падкідае яна.

Не чуецца ў ім чараўнічых
Распеваў з нянаскіх пуцін,—
Склады скандзіроўкаю злічыш
І далей радочкі гаці...

Мінае вясна мае ганкі,
Знарок абышла стараной,
Далей ад назолы-цыганкі,
Што тут варажыла са мной.


Яна вымагала ці мала
І з той пазлацанай рукі
Жар-птушку маю выпускала,
Што ў сініх нябёсах растала,
А там задзяўбалі крукі.

Вясна! Не ў мяне ты гасцюеш,
Зрываючы дублі з акон,
І ў песні са мной не смуткуеш,
Прызнаннямі сноў не бунтуеш,—
Гадкі падвяла пад закон!

А я, парушаючы кодэкс,
Насупар табе, артыку́л,
Гарачымі ружамі ўсходаў
Крываўлю душу і руку.

Чым далей, тым больш раскашуе
Вясны захмялелы прастор,
Нічога ў яго не прашу я —
Шугне і пагасне касцёр.

ВАСЬМІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ



МЫ ПІШАМ...

Ратуючы свой ветразь ад мялін,
Ад зноў нераспрамененага неба,
Мы пішам, як будуем караблі,
Як руні даглядаем дзеля хлеба.

І слова, як падкова на дзвярах,
Што дом твой вызваляе ад маркоты,
Што нішчыць, узгараючыся, страх
І думку раскалыхвае з дрымоты.

Мы пішам, падуладныя начы,
Імгненню, што скараецца імкненню,
І нам ужо ад слова не ўцячы —
Нявольніцтва яно ці вызваленне.

І смешна, калі ў вершах гамана:
Ці варта, ці не варта быць у славе —
Мы пішам, каб устояла сцяна
У сэрца адбудаванай дзяржаве.

ЦІ АБЗАВЕШСЯ ТЫ, ПАЭТ?

Ні акравершам, ні санетам,
Ні запраграмленым радком
Не сутыкнешся ты з тым светам,
Адкуль, з зацененых куткоў,
Душы нявызнанай уласнай
Прамень заззяе непагасны
На лёдзе лёсавых віткоў.

Як градзіны, упалі слёзы
З надсечанай на сок бярозы,
І прагна выпіў іх мароз,
Вясну ён сёння перарос.

Што маю я сказаць слязінай?
Няма каму. Вялікі свет!
Ды вось у скрутную часіну
Ці абзавешся ты, паэт!
Табе дадзела і навела,
Што ад Бакачыю грымела,
І дождж абложны скаргаў тых,
Што імі жывіцца святы.

А мне сягоння без паходні
Замлелі рукі і душа —
Ці данясу я навагодні
Свой тост, пякучы, як пяршак?
Пад галалёдзіцай шаша...

А што сказаць ты маеш свету?
Ці зноў пра вёсны і пра леты,
Дзе на цяпельцы грэла дні,
Сама не ўгрэўшыся ані.
Я толькі ў сноў прашу спагады,—

Хай ваш паказ не будзе здрадай,
Ні выкрыццём ліхіх падзей,—
Ёсць сэрцы кволыя ў людзей —
Спагады, любыя спагады,
І ноч у ноч, і дзень у дзень!
Што ў сне ты бачыла, Наташа?
«Каткоў вясёлых татка лашчыў...»

ПАЭТ НА ВЯКІ

Калі спагада не звялася,
На белым свеце існуе,
Калі часамі на Парнасе
Сустрэць вы можаце яе,—
Хай адшкадуе нам спакою,
Зацішша ўзбуджанай душы,
Таго ўратоўчага напою,
Што льецца генію з вышынь.

Ён знаў цану такіх імгненняў
І клікаў лёс свой памаўчаць,—
Пакуль царуе ў ім натхненне,
Хай ціха плавіцца свяча.

Ён знаў, ды сэрца шчыравала
І моцна клікалі сябры,
Якіх эпоха скасавала
У найлюцейшым дзекабры.
Ён разумеў:
міне імгненне,
Што сэрца смуткам ахіне,—
Затужыць, загаворыць геній
І акіяны скалане.

Як многа, як нязбытна многа
Нёс ў сабе ён галасоў
Зямлі айчыннай, што з парога
Яго завабілі красой.
Гучалі скрозь у тых напевах,
Што раскалыхвалі тугу,
Што ў полі падалі залевай,
Вандроўніка вялі ў пургу...

12 Зак. 2074

Ён знаў, ён чуў свой лёс ускрутны,
І важыў раніц настаццё,
І воляю сваёй магутнай
Над светам подзвіг распасцёр.

ПАМЯЦІ
АНДРЭЯ МАКАЕНКА

Не кліч мяне, сіні аловак,—
Быў сёння бязлітасны дзень:
Баюся я чэзлага слова,—
Грызе яно, як авадзень.

Нічога, нічога, нічога
Сказаць я табе не магу,
Ні добрага, ані благога,—
Вазьмі ў мяне толькі тугу.

Дай сну, адранцвення, напою,
Дай маку, што месяц спяліў,
Хвіліну спачыну, спакою
На гэтай пякучай зямлі...



Розум, адкасніся, мне цяпер уцямна,
Што яны зваліся — сонцавыя плямы.
Іх звялі, як зводзяць з мілага аблічча,
Хоць вяснянкі ў модзе ў гарадах сталічных.

Што яшчэ ў той модзе, ад якое выйшлі
Ў нашым добрым родзе перасыту мышы?
Злосць, знявага ў модзе і пагарда нават,
Што гадуе звяга, хоць не мае права
Углядацца ў неба, дзе праменне спее,
І дужэць ад хлеба, што зрабіць не ўмее.

МАЕ КАЛЕЦТВЫ

Адкінь свае радкі,—
І апынешся босай...
На вербе спяць каткі
Такой пароюю млоснай.
Вясна! І зноў яна
Прыходзіць позна ўночы,
Калі ўжо не пазнаць,
Куды ад смуткаў збочыць.

Разуўшыся ідзі —
І лёгка дойдзеш мэты,
Яшчэ раз не ўпадзі —
Не прычакаеш лета...

Каторы раз пад крок
Табе кладзе каменне,
Знарок ці незнарок,
Зласлівае стварэнне.

Цяпер ты басаног,—
Няхістка і няслізка,
Хіба прыстане смоўж
Ці разбяжыцца пліска.

ХАЙ НАМ ДАРУЮЦЬ...

Нічога я не дакляраваю
Сваім прытомленым радком,
Я з ім жыву, хай нам даруюць,
Што не з уцешлівых віткоў
Арбіта наша паўставала —
Падаткі ж горкія збірала
З нераспраменёных гадоў.

Нічога я не дакляраваю.
Я толькі шчасця зычу тым,
Хто маладосць перагарае,
Як гаравалі я і ты.
Хай адасніцца ім гаркота,
І стромы шлях, і мары крах,
Святой даверлівасці вотум
Каб не ачах у іх вачах.

А мы з радком, калі крадком,
Калі адкрыта, самавіта,
Дабру і шчасцю не ў дакор,
Смуткуем смуткам непазбытым.
Мы размінуліся на стромах
З вясёлай песняю слаломаў,
Засыпаў снег, пазней снягі
Вясны лугі, касьбы лугі,
Ці нехта стрэўся нам благі,
І аблягла душу утома...

ЗА ШКЛОМ ЛЕДЗЯНЫМ БАЧУ ПОЛЕ...

Даруй, хто ўпаў неасцярожна,
Каму рукі не падала...
Вяду свой шлях па бездарожжы —
Яго завея замяла.

За шклом ледзяным бачу поле,
Прастору песні, згукі хваль,
А вось каб сэрца разняволіць,—
Я і не важуся амаль.

Яно ідзе сваёй пуцінай,
І па зямлі, і па вадзе,
І валачэ мой лёс жанчынін,
І ціха песеньку гудзе.

А мне відно з нядальняй далі,
Дзе ўжо зыбаецца пясок,
Як зноў яго участавалі
І як наблізілі курок.

СУМЛЕННЕ

Сумленне, сумленне! І ты у адценнях,
І ты у аспектах куткоў ды праспектаў,
І ты цераз сілу
Душы дагадзіла.

Так зблытаны пасмы: дзе хмарна, дзе ясна,—
Абы абаднела, як ночка заспела...
Сумленне ў паходзе, сумленне ў нязгодзе,
І сэрца, як злодзей, дрыжыць перад карай —
Старасць.

* * *

Душа ўцякала пад заслон,
А слова ўдарыла, як камень,
Яно над светам загуло
У камянёвай страшнай гаме...

Не верыш гукам: не было!
Яго не вымавілі вусны!
Хіба завеяй намяло,
Вятроў аглушлівым хаўрусам.

Хай так! Прысуд не прагучаў...
Тады чаму ж душа трапеча?
Зіхціцца снежная парча,
І ласкавее зімні вечар.

* * *

Дзень увесь пераставуляла кветкі на акне.
За душу сябе трымала,— ці падужаць мне?..

Ды не ўмею я, не ўмею без спагады жыць...
Ці астатняя ўжо дзея за акном імжыць?..

* * *

Не дацягнешся рукою,
Ні вачмі не дападзеш
Да звычайнага спакою
Аблачынкавых мярэж.

Ці душа пабунтавана,
Ці лугі з далін сышлі,—
Толькі б'ецца апантанасць
І у сэрцах зрубцаваных,
І ў разорах на зямлі.

З кім жа б'ецца, як завецца,
У імя чаго той бой?
Калі песняй птах зальецца,
Калі любасць усміхнецца,—
Сэрцу ты скажы:
— Адбой!

КЛАВІР ЖЫЦЦЯ ПАЧНЕ ПАЎТОР...

Сышліся дні нашых народзін
У лістападавых садах,
Калі ўжо дрэмлецца прыродзе
І туліць родны цёплы дах.

А хто з нас першы угадаў,
Што сцежкі сыдуцца так блізка?
Калі не зрушыць і бяда
У самым неадольным сціску.

А як натоліць сэрцы боль,
Каб, адступіўшыся часова,
Ізноў нас паяднаць з табой
На пуцявіне год суровых.

І зноў няўцямны гэты тор
Нас павядзе ў гады сталення,
Азорыць зорамі натхнення —
Клавір жыцця пачне паўтор.

Ён лёсы нашы паяднаў
Часінаю выпрабаванняў,
Што вычарпана ўся, да дна,
Цяпер яна — бадай паданне.

ЗАМОВА
НА НОВЫ ГОД

Вершу ты найперш павер,
Што ён вырас, як паверх,
І не першы, а дзесяты,
І завершан ён, як свята,
І не толькі для паэта,
А, бадай што, для сусвету.
Вось які складзецца верш,
Калі знішчыць недавер.

Ве́рыць, верыць, толькі верыць,
Што ёсць друг у атмасферы,
Што праз дождж́ык і туман
Не прасочыцца падман,—
Перад ім замкнуты дзверы
І надзеты талісман.

Гэты хлопчык — Новы год —
Робіць першы свой заход,

Дайце мы яму паможам,
Каб ён сілы не здарожыў,—
Каб шляхі дабра спасціг,
Злыдня ў хату не пусціў.



Усё ж ішла яна паўз нас,
Ішла не так і да́лека,—
Духмяна-росная вясна
У паркалёвым шаліку.

І сонца, хоць хіліла ўбок,
Мінала нашы весніцы,
Але смяялася здалёк,
Што нехта тут нявесціцца.

І дні здараліся ярчэй,
Кульгалі ўсё ж без мыліцы,
А што цяпер глядзіць з вачэй
Вясёначкі без крылейца?

МОЙ УКОС

Мае вы бедныя радкі!
Пазашываліся ў куткі
Ад воч маіх ускрутных,
Не горнецеся да рукі,
Знікаеце нячутна.

І я не клічу вас дамоў,
Я разумею — цяжка!
Вы працавалі без умоў,
Штодня, і ў святы без адмоў,
Але ж была мянташка...

ДУША СТАРЦУЕ, НОЧ НЕ ЧУЕ...

Старцуе душа па падвоканню літасці,
Старцуе ад рання да зорнае бесядзі,
А з кайстры, бывае, нічога не вытрасе,
Апроч аскабалка зякратага месяца.

А што ім сагрэеш у слоце раздожджанай,
Хіба арабінавым выбухне вышугам,
Ці выблісне з дрэва зялёны атожылак,
Маланкаю зыркай уночы ахрышчаны.

Старцуе душа па падвоканню чуласці,
Хінецца да шыбіны, прагнучы людскасці,
А песня зыбаецца хваляй на вуліцы:
Вяселле гуляе ускраіна слуцкая.

АДВЯЧОРАК

Як мала сэрцу трэба
У долі вераснёвай —
Адна усмешка неба,
Адно прыязні слова.

І ўжо зіхціцца поўня
І срэбны адвячорак...
Нічога больш не помню
З таго, што мела ўчора.

Магічны свет у далях,
Свет апантанай веры.
І зноў на той жа хвалі
Вяслую я аберуч.

Пакуль са мною змога
І ветразь на заходзе,
Пакуль жыве трывога
За ўсё, што век мой родзіць.

НА ВЯСНЕ

Яны ўдваіх, русавалосыя,
У цёплы і прымглёны дзень
Ішлі духмянымі пракосамі
Напрост, як маладосць ідзе.

Яму хацелася ружовую
Істужку ў косах развязаць;
Яна упрошвала не словамі,
А зіркам чыстым, як сляза.

І ўся яна, праменна-лёгкая,
З усмешкай светлай у вачах,
Была, як водар, як палёгка мне,
Маёй бядзе, хаця б на час.

А ён, ужо любоўю ўзрушаны,
Таго не ведаючы сам,
З самой вясной спраўляў заручыны
І шчасце браў сабе ў пасаг.

ПЕСНЯ

На справе голас быў адменны,
Ён лашчыўся, ён ахінаў
Той цеплынёю неацэннай,
Што ёсць для кожнага адна.

Пялёсткі ганначак вясёлых
Ён нагадаў мне каля дач,
Калі насілі кветкі ў школу
Закладкамі цяжкіх задач.

Яны сінелі між старонак,
Калі гартала іх рука...
...А голас, крышачку стамлёны,
Плыў па заглыбленых буйках.

Ён кволіў сэрца, ён аплакваў
І недасяжнасць і туман,
Ён весяліў цябе са смакам,
Каб заспявала ты сама.

Быў ціхі лёт у песні любай...
Праз ранішнія туманы,
Са шчасцем поруч і са згубай,
Ён вёў цябе пад енк струны.

І нібы матчына прышчэпка
Супроць адзёру на душы
Быў той напеў, той неадчэпны,—
Аднекуль падаўшы з вышынь.

МАЕ РАДКІ НЕ УБАЧАЦЬ СВЕТУ...

Мае радкі не ўбачаць свету,
Не прагучаць на слых спагадны.
Не буду звацца я паэткай
З сваёю музай непанаднай.

Яна мне помсціцца, і люта,
За здраду колішнім лятункам.
Я мушу зараз адпакутваць
Усе мае з жыццём стасункі.

Відаць, за тое гэта кара,
Што сэрца слухала залішне,
І лёс па ім, адным, ударыў,
Як сівер па цвітучай вішні.

Мае радкі не ўбачаць свету,
Паснуць, не ўзняўшыся з вытокаў.
Яны, як пашарпаны ветразь,—
Спачын для чайкі адзінокай.

МЫ АДЫХОДЗІМСЯ АД СКРУТЫ...

У лістападавай раскошы,
Між дрэў, аголеных бадай,
Дзень пачынаецца, харошы
За ўсе, што лёс мне падкідаў.

Вазёрным зыбівам на хвалі
Прамень з-пад хмарнага брыля
Паплыў у золата аддаляў
І згас на тонях спакваля.

Тады, скідаючы сваволю
Закучараўленых аблок,
Зайграла сонца паміж голля,
Ацепліўшы твой родны зрок.

Мне страшна, радасна, маркотна,
А сэрца, ўдзячнае красе,
Як самалёт на рысе ўзлётнай,
Гудзе і ціхне пакрысе.

Цішэе страх, мякчэе смутак,
Спакой працягвае руку,—
Мы адыходзімся ад скруты,
Плывём ад берага пакут.

У лістападаўскай раскошы,
Пад шэпт кляновага лісця,
Я чую блізкую парошу
Твайго жыцця, майго жыцця.

СУМЛЕННЕ НАША — ЛЕНІН

Жыві, сумленне наша — Ленін,
Жыві, пакуль жыве зямля,
Што ў вечнай змене пакаленняў —
Ад парастка і да камля —
Тваім сагрэтая праменнем,
Людзей гадуе з немаўлят.

Барацьбітоў твайго абсягу,
І чысціні, і вышыні,
Што нашага не зганьбяць сцягу
Ні пад канём, ні на кані.

МАЙМУ РАДКУ

Даўно мы з табой не спявалі,
Ты змоўк, занядбаны радок,
Глядзіш на мяне нібы з жалем,
Хоць я цябе чую за крок.

Не можа так быць, не павінна,
Ты мой да астатняга дня,
Ты быў мне і другам і сынам,
Ты ўсе мае ношы падняў.
З мялін, са знявагі, з пакуты,
Ласкава ты вёў за руку
Праз наледзь мяцеліцы лютай...
І ты ўжо са мной давякуй.

АЎРОРА

Нерэальнай бадай чысціні
За акном прачынаецца горад.
Ты спяшаешся штосьці дасніць
Да ўрачыстага выйсця Аўроры.

Штосьці тоіць усмешлівасць губ...
Дзе блукалася сэрцу да рання?
Адарваць я вачэй не магу
Ад раскошы твайго прачынання.

Вочы ў бляску вандроўных дажджоў
І дзіцячае ў зірку здзіўленне:
Яшчэ там ты і тут ты ужо
З хуткабежнасцю першых праменняў.

ГЕРМЕТЫЗАЦЫЯ ДУШЫ

Герметызацыю душы
Ці забяспечыў ты ў прасторы,
Дзе паміраюць нават зоры
Без журбавання, без імшы?

Пустэча душыць іх рукой
Неіснавання, страшнай сілай,
Калі ў галактык рвуцца жылы,
Ліецца кроў густой ракой.

Дый сэрца клапаны правер
На непарушаную шчыльнасць,
Каб не пачула стогнаў Чылі,
Дзе чыніць здзекі люты звер.

Тады жыві! А чым? Сабой?
Заўжды ва ўладзе дамаганняў —
Набыткаў новых ці кахання,
Дзе па чарзе: алярм — адбой.

Ды як ні кідайся ты ў бой
За скарбы славы, за узвышшы,—
Адзіны сэрца перабой
Усе твае намогі знішчыць.

Дык прапусці, як чалавек,
З адкрытай сэрцавай дзяржавы
Пачаткі ўсіх крынічных рэк,
Што жывяць мары вечным правам.



Скальны адломак над прорваю —
Колькі стрывае рука?
Сонца спагадаю зморвае,
З літасці кліча Ікар.

Крылы памлеўшыя згорнуты,
Вецер раптоўна шумне:
Ні апраўдання, ні гонару
Не застанецца ў мяне.

Месяц з усмешкаю схіліцца:
— Больш за паўвека стаю,
Дбаю пра крок твой без мыліцы,—
Больш не на сілу маю.

МАЛІТВА

1

Я не хачу, каб адгучала,
Каб за паводкамі сплыло
Усё, што з песні стала шквалам...
Жыві са мной, мая навала,
Грымі сваім высокім балам,
Дзевятым валам, што узнёс
Журлівы мой
жаноцкі
лёс.

2

Усіх надзей маіх начары,
Гарачы шэпт усіх радкоў —
Табе я пасылаю, Нарач,
Да лебядзіных тых віткоў,

Дзе мне ўяўляўся вобраз шчасця:
Два лебедзі — яны ў раі —
Прамыюць горда ўсе напасці
Высокім горлейкам сваім.

А ЎСЁ Ж ХАЦЕЛАСЯ Б МЯКЧЭЙ...

Пакуты вытанчылі твар...
Ці гэта ўжо мазок астатні?
Ці гэтак хмарыцца абшар
З бяды мае, нягоды хатняй?

А ўсё ж хацелася б мякчэй,
Лагодней развітацца з лёсам,
Каб з перапаленых вачэй
Не білі градзінамі слёзы.

Такая процьма іх была
І звонкай, і глухой часінай...
І ўсё ж, бясслёзная імгла,
Не ты іх асушыць павінна.

Было: наплачашся усмак,
І сэрца нібы не з табою,
А слухае цябе, аднак,
Хоць мы і ворагі абое.

Яму не верыцца ў той бой,
Што я вяду з душою змалку.
Ізноў трывога і адбой,
Ізноў я вогнішчаў вясталка.

ПАКУЛЬ ПРАМЕНЬЧЫК НЕ ПАГАС...

Як на чужыне птушына́,
Жыву надзеяй на зварот
Туды, дзе Свіслач ад відна
Сумленна шырыць сонцаўсход.

І ў кожнай кроплі залатой,
Пакуль праменьчык не пагас,
Відзён маленькі мой пакой,
Дзе вершаў немалы прыпас.

Куды мне з імі, хоць цяпер
На праўду попыт у чарзе,
Ды з гэтых скрэмзаных папер
Хіба слязіна папаўзе?

* * *

А што ты хочаш ад людзей!
Яны шчыруюць дзень у дзень,
Змагаюцца з нягодай,
Лагодзячы нязгоду,
Вачэй не зводзячы з надзей?
Дык што ж ты хочаш ад людзей?
Дай мужнасці ім, неба,
У здабыванні хлеба
І той спажывы для душы,
Што слёзы ўмее асушыць.



Як ні марудзіць вясна,
Бэз каля ганка цвіце,
Нават сцяна не відна,
Што паміж намі расце.

Хто ж яе ўзводзіць пачаў?
Хіба не я і не ты...
Тут у пакут на вачах
Камень бяруць з каліты.

Ой, як нямотна радку
Выклікаць скаргі на свет,—
Ён жа не знае, адкуль
Градзіны ўдарацць з ракет.

Позняе прыйсце вясны,
Вецер зацяты з вады,
Блізка грымяць перуны,
Тоўпяцца ў сенцах гады.

* * *

Чытаю лісты з незваротнага,
А сэрца смыліць і смыліць,
І маці, жывая, з турботамі,
Ласкава мне ў вочы глядзіць.

Сваёю бядой ды пакутамі
Яе скарачала я век,
Гадкі падкідаючы скрутныя
Вялікаму сэрцу на здзек.

МАЯ ПТУШКА

Спяшаецца буйная птушка
На заклік свае вышыні,
Там воблак пачне яе гушкаць
І песня з нябёс зазвініць.

Шырока расхінуты крылы,
І ўзмах у вятрыстых вірах
Такой дамагаецца сілы,
Каб рэха шугала ў гарах.

Павольна вяртаецца птушка:
На захадзе сосны гараць,
Дзе вечар праменне патушыць,
Там ёй паднач[о]оўваць пара.

СУПАРАТЫ

Мая айчына залатая —
Малы садок, лугі за плотам,
Завея, што малых хістае,
І ўсё ж гукае за вароты.

Хіба тады ўжо сэрца млела
Ад хараства зімовых ранкаў,
Ці я зусім яго не мела,—
Услед яно глядзела з ганка.

Міналі дні, яно ўладарна
У дом зайшло і засталося,
Тады гарэлі вокны жарам,
Вятры шматалі сугалоссі.

Яно зашастала птушынай,
З грудзіны выбіцца хацела,
Але зайшла тады хвіліна,
Калі я сэрцам валадзела.

Ды ўяўная была то ўлада —
Яно так білася зацята,
Што не даходзілі мы ладу,
Жылі ўдваіх, як супараты.

Усю вагу маіх вандровак
Сабе у торбу сэрца пхала —
І скразнякі маіх дамовак,
І год пасечаных завалы.

Яно гняло мяне і словам,
І любасцю нелітасцівай,
Яно стаўляла мне умовы,
Надмерныя імператывы.

Адкуль такая моц вялася
І не ўпадала пад знявагай,
Калі, ў якім спартыўным класе
Яго пазначана адвага?

Пытанняў шмат, як і адказаў,
Ды сэрцаў подзвіг не разгадан...
Да рысы дойдзем хіба разам,
Дайшоўшы ўрэшце і да ладу.

МАГІЯ

Магія слова, пагляду, прыгадкі,—
Што яна робіць з душой?!
Лёс вымагае штодзённых падаткаў,
Калі рубеж надышоў.

Тут сцерагуць цябе горкі крутыя,
Шквал і завал пачуцця.
Не. Гэта — словы, і словы не тыя:
Сэрца ж ідзе напрасцяк.

Кола магічнае.
                    Вернешся ўранні
На схаладалы парог,
А за гарамі такое паланне,—
Хто б гэта вытрываць мог!

Зноў я трапляю ў магічнае кола
Тых, ненароджаных, слоў,
Што з даляглядаў аказваюць голас:
Шчасце, дзіця і любоў.

Гэта ссівелая далеч пад снегам,
Мой асірочаны шлях,
Без ліхтара, пад самотніцай Вегай,
Ўласны на радасць замах.

Зноў я трапляю ў магічнае кола:
Блізка надходзіць святло,
Гэта яно — ненароджаны золак,—
Раптам душу абняло.

ДОМ

Шукаем дом у дзіўных снах,
З няўгойнай крыўдаю на вуснах,
А побач спеліцца вясна,
Хоць і паўзе настрэчу восень.

А дом твой там, дзе маці спіць
І ў снах сваіх пытае:
— Дзе ты?
Як без мяне табе пражыць,
Не датрымаўшы запаветаў?

Яны ўцякалі ад мяне,
Між пальцаў сыпалася зерне.
Не спасцігалася даўней,
Што незваротнага не вернеш.

Нізалася яно, жыццё,
З дарог, наканаваных лёсам,
Дзе праўда стала адкрыццём
І выкрыццём штодзённых цёсаў.

А гэтак званая душа
Так спрацавалася, да поту,
Каб сэрца сэрцам суцішаць,
Асцерагчы яго на ўзлётах.

А дом? Ён там, дзе маці спіць,
З адной гаркотаю на вуснах...
Мой вечаровы час імжыць,
І цішыня заве спакусна.

НЯЎЛОЎНЫ ВОБРАЗ

Гарачыню ліпнёвых дзён
Заспела я ў Маскве,
Там, дзе мой кожны крок чуцён
І кожны ўздых жыве.

Павевам родным абняло,
Прыцішыла мой боль
Радзімы матчына крыло,
Нябёс крамлёўскіх столь.

Няўлоўны вобраз, смуткаў цень...
А музыка журбы
У сэрцы шырыцца, расце,
Не маю сіл пазбыць.

Я тут азорана жыла
Трынаццаць лепшых год,
Хоць пераважвала імгла
Той сонцавы зварот.

Няўлоўны вобраз!
Што ты ёсць?
І ў сне і на відне
Зірне мне ў вочы маладосць
І ў тумане тане.



Памяці У. Высоцкага

Я не люблю чужых прыстанкаў,
Дзе ўсё адмерваюць на час,
Як у паспешлівых каханкаў —
На год, на два або на раз.

Я не люблю крывой усмешкі
Людзей, не здатных да спагад,—
Яны лузаюць, як арэшкі,
Тваю журбу, твой заняпад.

Я не люблю, калі мне ў вочы
Са спрытам маняць, шыюць зман
І з крыкам з'едлівым, сарочым
Шматаюць праўду, як рызман.

Я не люблю, калі за спінай
Аб лёсе дзейкаюць маім:
Як я паводзіцца павінна,
Каб ён не гэткім быў, а тым.

Я не люблю, калі падробкай
Верш зневажаюць залаты,
І ўсім здаецца паасобку,
Што гэта ён паэт — не ты.

Я не люблю нікчэмных сварак,
Бяздумнай злосці калатню,
І зарубежныя тавары,
Як зарубежную хлусню.

Лічыць тут можна багацéнька,
Але ці ёсць у тым рэзон,

Каб нератлелыя апенькі
Бліскучым падразаць лязом.

Любі ці не любі — існуюць,
Азмрочваюць твой белы свет.
Я не люблю, калі пануе
У гэтым свеце — прайдзісвет.

* * *

Ужо ж астатняя бяда.
Калі самой сябе шкада,
Калі ў люстэрка гляне боль,
І, можа быць, нічога больш.

А што хацела б ты цяпер?
Сысці з двара, як робіць звер,
Калі гайдаюцца лясы,
А ён цураецца красы,—
Яму патрэбен срэбны мох,
Каб ён, стамлёны, ўрэшце лёг.

ГАНЮ СМУТАК

Каб не пісаць, каму і што сказаць,—
Не знойдзецца такога выслаўлення,
Каб заспявала ў цішыні кабза,
Празрыста так, як можа толькі геній.

Ці чуў з нас хто, як ён кранаў струну,
Як радасна было ёй абзывацца,—
І музыка лілася без прынук,
Пагодзячы душу, не клічучы авацый.

Цвіці, цвіці, красавіковы шлях,
Сад, літасціва распрастай лістоту,
Хай праплывае смутак на плытах,
Далёка праплывае, без звароту.

Мне цесна стала раптам на шашы,
Я грузну ў снах, у лесе, ў вандраванні,—
І толькі голас кроўнае душы
Ні ў чым не зманіць і нічым не зраніць.

Сумотны дзень, як, можа, ўсякі дзень,
Ён повен непазбытых спадзяванняў:
На кожны цень кідаецца прамень,
Каб цемры запыніць каранаванне.

У ГАСЦЯХ

Тут штосьці цьмеецца ў каміне
І водарыць лясным кастром...
Мы хутка гэты дом пакінем,
Мы маем свой абжыты дом.

Як гэта добра, што ён ёсць,
Там начавала маладосць.
Яна заходзіла пад вечар,
Хусціну ўскінуўшы на плечы,
То прапяе, то нешта скажа,
Часамі слова ўжо не вяжа,
Але вясёлая заўжды,
Закрэсліўшы і след бяды.

Не трэба скардзіцца сягоння —
Снег мякка падае на ўлонне,
І пачынае Новы год,
Як кожны ўладца,
Свой паход.

«АД ІМЕНІ НАРОДА»

Народ — Вялікі Невядомы,—
Як Герцэн некалі назваў,—
Ты і стыхія, і свядомасць,
Ты — цішыня і грозны шквал.

Ты недасяжнасцю укрыты,
У неабдымнасці гучыш,
Той акавітаю наліты,
Што парушынкай робіць крыж.

Тваё сыны, твае ўсе ўнукі,
Патомкаў тлум, нашчадкаў рой,—
Нікому ты не вяжаш рукі
Збыткоўнай любасцю сваёй.

Не горнеш к сэрцу па адзнаках,
Не разліваеш пахвалы,
Не падсалоджваеш прысмакам
Ні авангарды, ні тылы.

Ты — роўнасць гор і дольных роўніц,
Ты — ўсім раўня, і гэтым дуж,
І ні ў палацы, ні ў шпакоўні
Сабе ў вянок не зрэжаш руж.

А скрозь рыхтуюць табе ўзвышшы,
Пагоркі глорый, гмахі слаў,
Якім яны падперты дышлем,
Які на іх марнуюць сплаў?

Але ж ад імені народа,
Твайго вялічнага імя,

Тваёй народы і прыроды,
Тваёй нібыта ўзнагародай
Спявáкі шумныя грымяць.

А ты, Вялікі Невядомы,
Глядзіш на гэтых немаўлят
З прыганкаў дома, як са стромы,
І не сыходзяцца, вядома,
Ўх шпаркі зірк і твой пагляд.

ВЯСНА

Адлягаюць сцяжыны маіх успамінаў,
Растаюць, як пад сонцам сумёт,
А ці трэба каму паглыбляць каляіны
З году ў год назбіраных згрызот.

Хай праменне іх сушыць,
А ўлеўныя душы
Хай укрыюць зялёным плашчом...
Я стрымаць сваё сэрца, як некалі, мушу,
Сад жыцця забяліўшы квачом.

Хай святлее з аддаляў,
Не будзячы жалю,
Хай не точыць яго хцівы гнюс!
Мы жылі і кахалі. Ніштo не абмаліць
Летуценняў і прагі саюз.

ЗМАНІ...

Усім я зараз зайздрошчу,
Хто стан не зазнаў такі,
Хто нігае цераз плошчу
І бегма бяжыць нацянькі,

Хто вечар страчае ўцешна
І ўцешна ідзе на званок,
Каму без прычыны смешна
І хто да рубіны змок.

Каго абакралі зараз
Начыста, і спрытна так,
Што згледзела толькі хмара,
Як гэты злодзей растаў.

Каму ж бы яшчэ пазайздросціць,
Каб боль хоць на час спыніць...
А ў хату грукаюць госці —
Змані, што табе не баліць.



Не вымагаю я ў жыцця —
Пад сонечнай каронаю —
Ані драбіны пачуцця,
Ні яблыка чырвонага.

Не вымагаю ні хвальбы,
Ні віншавальных клічнікаў —
Яны, як позція грыбы
Дажджыстага кастрычніка.

Ні абароны, ні спагад,
Ні літасці ганебнае...
Хай вее белы снегапад
На мой адзіны панарад —
На вершаванне зрэбнае.

І не чакаючы здаўна
Падзякі замаруджанай,
Адно баюся, каб мана,
Залішне ўгрэўшыся з віна,
Зайшла ў мой дом астуджаны.

ЛЮДАЖЭРЦЫ

Крыві чырвонае разводдзе
Ліецца па нязрушным лёдзе,
Што ледаколам не скрануць,
Яго пласты праклятце родзяць:
Нянавісць, хцівасць і вайну.

І ў безлічы нерахаванай
Людзей сцінаюць, як траву,
Ужо не месціць іх Нірвана,
А людажэрцы ўсё жывуць.

КАБ ЦЕПЛА НА СВЕЦЕ...

Да шыбіны туліцца вецем таполя,
І кружыцца лісце, і хіліцца голле.

Адной талакою працуюць тут: вецер,
І хмара на сонцы, і воблакі-дзеці,
І возера з хваляю цёмна-зялёнай,
І прагная восень за жоўтым адхонам.

А як жа зрабіць, каб аціхла трывога,—
Ёй трэба так мала, мне трэба так многа.

Хіба папрасіць засутонены вечар
Не ладзіць на сёння раскошнай сустрэчы
На захад, з ірдзянай заслонай, свяцілу,
Каб ціхенька свой яно шар пакаціла
За белыя шаты смугі далягляднай,
За ціхія воды, за шызыя лялы.

БЫЛО ЯШЧЭ ДЗІЎНЕЙ...

І ў вока і ў брыво
Трапляе лёгка слова,
Як развінеш сувой
Жыцця свайго нанова.

З агледзін першых дзей,
З выпадкаў, як з ападкаў,
Ты летапіс вядзеш
Па тых балючых згадках,
Па вострых камянях,
Па сцежыне туманнай,
Па неправідных днях,
Па незагойных ранах.

Ды прамянела ж дзесь!
Палала на змярканні,
Як зараснік радзеў
І галасіла каня...

Журліваю ракой
Дом калывала песня,
І дзіўны неспакой
Зіму і восень крэсліў.

На хрэсьбіны вясны
Прыходзіла пралеска,
Калмаценькія сны
З павек дрымотных лесу.

Было яшчэ дзіўней,
І радасней, і ўцешней,
Калі на твар вясне
Цвет ападаў чарэшні.

Або калі радок,
Уласны ці няўласны,
У навальніцу мок,
Нідзе не быўшы ў ласцы,

Але звінеў, як звон,
У сэрцавай прасторы
І гэтак быў чуцён,
Як толькі чуеш мора.

ЗМЕСТ

«Хочацца жыць — не канчаецца доля...» А. Вярцінскі 3

ТРЫЦЦАТЫЯ ГАДЫ

Давай перагорнем старонку... 8
Масква 9
Не аддавай душу маркоце... 10
Падлеткі 11
Чужой была я ў тым кутку 12
Марыінск Томскі 13
Кавалкі лёсу 15
*** Паэт Маякоўскі!.. 17
Абрыс надзеі 18
Подых былога 19
Упершыню 20

САРАКАВЫЯ ГАДЫ

Дзень вайны... 22
Колер жыцця 23
Ліст ваеннага лётчыка 24
У Маскве 26
І не фальшуе толькі птах 27
*** Як рвецца з ценю на відно... 28
Візы 29
*** Дрэву кожнаму — вясна... 30
*** ...Як нескладана стаць аддапай... 31
*** Сэрца гояць толькі сэрцам... 32

Вясна 33
*** Жанчына, ты ўсяму прычына... 34
Непрыбраная восень 35
Пажар 36
Нагая праўда 37
Пяе вясновая вада... 38
*** Зноў сёння гэты вецер шквальны... 39
На канцэрце Обэра 40
Сухавей 41
Дыялог з завеяй 42
Ціпшэй, маё сэрца! 43
На холадзе 44
Рамантыка 45
Ганьба 46
Маладосці ў вочы глянула... 47
Майскі снег 48
У дарогу 49
Слова 50
*** У чысціні халодных слоў... 51
Шумяць дажджы... 52
А мне шкада мае самоты... 53
Далёка 55
Сакавік 56
Салют 57
Паэзія 58
Макі 60
Муляжы 61
Нічога не паўторыць дзень 62
Вякі не жылося так прагна 64
Зімовая казка 66
*** Пакліч мяне ў госці, святая спагада!.. . . 67
Позняя вясна 68
Не ўмею назваць... 69
*** Клавір юнацтва адгучаў... 70
*** Дабро спыняецца раптоўна... 71
Сібір 72
By pen 74
Шчасце 75
Няма... 77
Толькі вочы напасціць 78

Як першай песні светлы ўзлёт... 79
Свякроўка 80
Над возерам 81
Друг 82

Янка Купала 83

Чаму? 83
Аднойчы адвячоркам 84
Апошняя сустрэча з Іванам Дамінікавічам... . . 85
На Купалавай вуліцы 86

Дзве ночы запар біў пярун... 88
Маці 89
Матчын дом 90
Матчын голас 91
Сок вечна гоніць сакавік 92
Снягі 93
Галіна гайдае дразда 95
Фрагмент быцця 96

ПЯЦІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ

Тваіх завей нам не змахнуць... 98
Вясна позніцца 99
*** Пад лісцем чырвоным, пад ветрам... 100
Пачуццёвае галаданне 101
Душна 102
Не кроч насустрач ёй 103
Яшчэ адна ў жыцці 104
Мой стол 106
Хворасць 108
Мімозы 109
Дарога залатых надзей 111
Сініца стукаецца ў шыбу 113
Мяцеліца 114
Дарогі позняй ціхі смутак... 115
Старая знаёмая 116
А дыхаць чым... 117
Чайка 118
А я б не здолела так жыць... 119

Дзяўчыне 120
На пяску 121
У лесе 122
Лістапад 123
Шляхі маладосці 124
Гліца 125
Стансы асеннія 126
Сёння раніца белая... 128
Кара 129
Я гэты лёс прыму 130
Сястра 131
На Балтыцы 132
Душа 134
У падарожжы 136
Залева 137
На перавале 138
Астры 139
Мора і сэрца 140
Не бойся гэтага павеву... 141
Нашто ты паехала... 142
Ізноў на ветры 143
Доля гаспадыні 144
Будзь ненатольным!.. 145
Норд-ост 146
Ганульчыны вочкі 147
Яблыня 148
Веснавая вада 150
Сонца 151
Сады зацвілі ў Беларусі 153
Любоў 154
Праз год 155
Язмін асыпаецца... 156
Раніца 157
Хай сплыве туга 159
Яшчэ не зацвіталі ліпы... 160
Лес засынае 161
Паэту 162
Ветразь 163
Згасанне 164
Ціхі адвячорак 165

Пецярбург 166
Не адыходзься... 167
У поясе вясны суровай 168
У кватэры Пушкіна 169
Слова 170
Будзь толькі сабою... 171
Новы год 172
Крыніца 174
Зямля глядзіць... 176
Усё прасцей... 177
Загадка красы 179
Наташа 181
Асамотненая птушка 182
Хараство 183
*** Са слоўнай нерушы, са сховішч... 184
Толькі снег... 185
Пад сузор'ем Ліры 186
Новая вясна 188
Адзінота 190
З маленства 191
Я разумею 192
Толькі дзіця... 193
У зімовым бары... 194
Росна 195
Дзякуй 196
*** ...Яшчэ магу рабіць я шмат... 197
*** Б'ецца ў сэрцы злагоджаны даллю павеў... 198
Размова з сэрцам 199
Летуценнікі 200
*** Ізноў ты познішся, як некалі... 201
Коласа няма... 202
Мадэрн 203
Пераймание сябе 204

ШАСЦІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ

Мы паўтараем з веку ў век... 206
Не хачу рэпарацый 207
Маладосць 208
Напярэдадні 209

Вечар 210
Вясна — імя жаночае 211
*** Як на сэрцы марозна... 212
*** Пад густа-сіняю сінечай... 213
Цяпер я знаю... 214
Мая тэлепатыя 215
Сон 216
На Нёмане, а не на Зеі... 217
Люты 218
Жыць! 219
Вясковая настаўніца 220
Зарок 221
Цана шчырасці 222
Лістапад 223
Дзень пачнецца хоць зараз... 224
Даруй мне, песня... 225
Я змоўчу ім... 226
Беспарадныя радкі 227
Пачуццё меры 228
Касманаўты 229
Рамесніцтва 230
*** Чым далей на поўнач... 231
Смейся... 232
*** Бяры за руку мяне, мужнасць мая... 233
Як тонка спявае туга... 234
Мяцеж мана 235
*** Ці гэта толькі графаманія... 236
Рыфма 237
Старасць 238
Гаворыць Новы год 239
Сон у сне 240
Няскончаны раман Льва Талстога 241
*** Пад небам маім летуценным... 242
*** І слова сірацее ў горы... 243
Сны 244
*** Здавён пытаюцца ў жыцця... 245
Родны горад 246
Ноч 247
Радкі 248
*** Дзе ты, айчына недасяжнасці?.. 249

*** Пакуль мяне кліча радок... 250
Спеўны час 251
Ліміты 252
*** Няма й няма, а золкі чэзнуюь... 253
*** Нялетавае гэта лета... 254
*** Радок зацяты, як іслам... 255
Апёк 256
Росквіт 257
Зацішак 258
Ці варт было 259
Ты не сніся, не сніся нам... 260

СЯМІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ

Вішні 262
Там пачуццё было святое 263
*** І ты, далёкая хваіна... 264
Нашы лістапады 265
Мір 267
*** Я ўсё цяпер дарую небу... 268
**** Ды што за насланнё?.. 269
Радкі-віткі 270
Даруй, жыццё... 271
Прымаю твой вырак 272
Пярсцёнак 273
*** Надзея, надзея, твой бор не радзее... 274
*** Адчай страчай усмешкай... 275
Зона сардэчнай радыяцыі 276
Сэрца і розум 277
*** Усцеш мяне, слова, цяплом і спагадай... . . 278
Без назвы 279
Гудзі, гудзі набатна... 280
*** Дзесяць год цішыні... 281
*** Адходзь ад сумятні... 282
Мара 283
Ляўша 284
Падаюць з сэрца радкі... 285
Латынь 286
Пад Новы год 288
Мой лёс 290

Бяру надзею за руку... 291
Верталёт 292
Вецер 294
Пабываў у раі 295
Мы не схапілі за руку 296
*** Я не з анёльскіх вітражоў... 298
Акрыянне 299
Мана 300
Без верша 301
*** Па мілай краіне ісці адзінотпа... 302
Што яшчэ? 303
*** Мы забываем словы... 304
Астатні раз... 306
Чарнавікі душы 307
*** Як? Жыць з пяра — пісаць на друк?.. 308
Ілюзіі 309
Тэлепатычныя разгадкі 310
Начное сонца 311
Асцярожна — грып! 312
*** Ізноў такі ж спякотны дзень... 313
Замова 314
*** Гады бяды ішлі мы поруч... 315
Забойчая мана 316
На голас чалавечы 317
Калі аціхнеш ты, душа... 318
Чутны голас 320
*** Такой вясной, такім змярканнем... 321
Смуткі 322
Без падрахункаў 323
Туга 324
Дзяўчынка 325
Дома 326
*** Самападман, самападман... 327
Вершы 328
Снежнае поле 329
*** Так, акіян жыцця малога... 330
Вясна зірнула нам у твар 331
*** Цябе звалі стрынаткай... 332
Возера 333
Падробкі 334

І толькі глытай успаміны... 335
Мова сентыментальная 336
Які ж гэта зломак... 337
Сэрца 338
*** На мове, далёка не кроўнай... 339

ВАСЬМІДЗЕСЯТЫЯ ГАДЫ

Мы пішам... 342
Ці абзавешся ты, паэт? 343
Паэт на вякі 345
Памяці Андрэя Макаёнка 347
*** Розум, адкасніся, мне цяпер уцямна... 348
Мае калецтвы 349
Хай нам даруюць... 350
За шклом ледзяным бачу поле... 351
Сумленне 352
*** Душа ўцякала пад заслон... 353
*** Дзень увесь перастаўляла кветкі па акне... . 354
*** Не дацягнешся рукою... 355
Клавір жыцця пачне паўтор... 356
Замова на Новы год 357
*** Усё ж ішла яна паўз нас... 358
Мой укос 359
Душа старцуе, ноч не чуе... 360
Адвячорак 361
На вясне 362
Песня 363
Мае радкі не ўбачаць свету... 364
Мы адыходзімся ад скруты... 365
Сумленне наша — Ленін 366
Майму радку 367
Аўрора 368
Герметызацыя душы 369
*** Скальны адломак над прорваю... 370
Малітва 371
А ўсё ж хацелася б мякчэй... 372
Пакуль праменьчык не пагас... 373
*** А што ты хочаш ад людзей?.. 374
*** Як ні марудзіць вясна... 375

*** Чытаю лісты з незваротнага... 376
Мая птушка 377
Супараты 378
Магія 380
Дом 381
Няўлоўны вобраз 382
*** Я не люблю чужых прыстанкаў... 383
*** Ужо ж астатняя бяда... 385
Ганю́ смутак 386
У гасцях 387
«Ад імені народа» 388
Вясна 390
Змані... 391
*** Не вымагаю я ў жыцця... 392
Людажэрцы 393
Каб цёпла на свеце... 394
Было яшчэ дзіўней... 395

Пфляумбаум Я.

П 91 Сувой жыцця: Кн. паэзіі/Уклад., рэд. і прадм. А. Вярцінскага.— Мн.: Маст. літ., 1989.— 406 с.

ISBN 5-340-00586-0.

Пфляумбаум Е. Сувой жизни: Стихи.

Новую кнігу старэйшай беларускай паэтэсы, чый творчы шлях пачынаўся ў дваццатыя гады, склалі лірычныя вершы, напісаныя ў розныя часы. Яны — хвалюючы роздум пра чалавека і свет, шчырая споведзь душы, творчы набытак аднаго лёсу.

П $\frac{4702120202—103}{М 302(03)—89}$ БЗ 55—89 ББК 84 Бел 7

Литературно-художественное издание

Пфляумбаум Евгения Эргардовна

СУВОЙ ЖИЗНИ

Книга поэзии

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

Пфляумбаум Яўгенія Эргардаўна

СУВОЙ ЖЫЦЦЯ

Кніга паэзіі

Рэдактар М. М. Мятліцкі
Мастак В. А. Тарасаў
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч
Карэктар Л. П. Бялова

ІБ № 3377
Здадзена ў набор 12.12.88. Падп. да друку 14.03.89.
АТ 06738.
Фармат 70×90¹/₃₂. Папера друк. № 1.
Гарнітура звычайная новая. Высокі друк.
Ум. друк. арк. 14,92. Ум. фарб.-адб. 15,07.
Ул.-выд. арк. 10,92. Тыраж 2700 экз.
Зак. 2074. Цана 1 р. 30 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура»
Дзяржаўнага камітэта БССР па справах
выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга
паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа.
220005, Мінск, Чырвоная, 23.